ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 28 (2659) ● Пятніца, 13 ліпеня 1973 года ● Цана 8 кап.

ЗА ВЫДАТНЫ ЎКЛАД У СПРАВУ МІРУ

УРУЧЭННЕ МІЖНАРОДНАЙ ЛЕНІНСКАЙ ПРЭМІІ «ЗА ЎМАЦАВАННЕ МІРУ ПАМІЖ НАРОДАМІ» ГЕНЕРАЛЬНАМУ САКРАТАРУ ЦК КПСС Л. І. БРЭЖНЕВУ

За выдатныя заслугі ў барацьбе за захаванне і ўмацаванне міру Генеральнаму сакратару ЦК КПСС таварышу Л. І. Брэжневу прысуджана міжнародная Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі». 11 ліпеня ў Вялікім Крамлёўскім палацы адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны ўручэнню гэтай прэміі Леаніду Ільічу Брэжневу.

У зале палаца сабраліся прадстаўнікі партыйных, савецкіх, грамадскіх арганізацый, рабочыя заводаў, фабрык і будоўляў сталіцы, працаўнікі сельскай гаспадаркі Падмаскоўя, вядомыя дзеячы навукі і культуры, прадстаўнікі Савецкіх Узброеных Сіл.

Тут жа ў зале — члены партыйна-ўрадавай дэлегацыі ДРВ, якая знаходзіцца з афіцыйным дружалюбным візітам у Савецкім Саюзе, паслы сацыялістычных краін, акрэдытаваныя ў СССР. Прысутнічаюць замежныя госці.

Бурнымі, працяглымі апладысментамі прысутныя сустракаюць таварышаў **Л. І. Брэжнева, Ю. У. Андропава, А. А. Грэчку, В. В. Грышына, А. А. Грамыку, А. М. Касыгіна, Ф. Д. Кулакова, К. Т. Мазурава, А. Я. Пельшэ, М. В. Падгорнага, М. А. Суслава, А. М. Шалепіна, П. Н. Дземічава, Б. М. Панамарова, Ш. Р. Рашыдава, М. С. Саломенцава, Д. Ф. Усцінава, У. І. Далгіх, І. В. Капітонава, К. Ф. Катушава.** Разам з імі месцы ў прэзідыуме займаюць Першы сакратар ЦК Партыі працоўных В'етнама **Ле Зуан**, член Палітбюро ЦК ППВ, прэм'ер-міністр урада ДРВ **Фам Ван Донг**, член Палітбюро ЦК ППВ, намеснік прэм'ер-міністра ўрада ДРВ **Ле Тхань Нгі**.

За сталом прэзідыума — старшыня Камітэта па міжнародных Ленінскіх прэміях «За ўмацаванне міру паміж народамі» **Д. В. Скабяльцын**, члены камітэта **Н. Н. Блахін, Г. Трайкаў, Н. В. Томскі, Р. Гутуза, М. Вірэ-Туомінен.**

Урачысты сход, прысвечаны ўручэнню міжнароднай Ленінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі» Генеральнаму сакратару ЦК КПСС таварышу Л. І. Брэжневу, адкрывае старшыня Камітэта па міжнародных Ленінскіх прэміях акадэмік **Д. В. Скабяльцын.**

Ахарактарызаваўшы заслугі таварыша Л. І. Брэжнева ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны час, прамоўца сказаў:

Праграма міру, выстаўленая таварышам Л. І. Брэжневым у Справаздачным дакладзе ЦК XXIV з'езду КПСС, указвае канкрэтныя шляхі забеспячэння міжнароднага міру і бяспекі. За кароткі час яна атрымала найшырэйшае распаўсюджанне і падтрымку ва ўсіх краінах, стала стваральным фактарам сучасных міжнародных адносін. Яе пазітыўнае ўздзеянне на ход сусветных падзей відавочнае. Асабліва хацелася б падкрэсліць значэнне той работы, якую праводзіць Леанід Ільіч Брэжнеў па ажыццяўленню кантактаў з кіруючымі дзеячамі брацкіх сацыялістычных дзяржаў. Яны служаць яркай дэманстрацыяй згуртаванасці краін і народаў, аб'яднаных вузамі непарушнага саюзу і сацыялістычнай салідарнасці.

Спалучэнне ў савецкай знешняй палітыцы лініі на рашучы адпор агрэсіі з канструктыўнымі захадамі, накіраванымі на палітычнае ўрэгуляванне наспеўшых міжнародных праблем, садзейнічае далейшаму шырокаму прызнанню прынцыпу мірнага суіснавання ў якасці нормы адносін дзяржаў з розным сацыяльным ладам, аздараўленню ўсёй міжнароднай атмасферы. І які б бок сучасных міжнародных адносін мы ні закранулі, аб якіх бы пазітыўных зрухах у іх ні ішла размова, — спыненне імперыялістычнай агрэсіі ў В'етнаме, нармалізацыя становішча ў Еўропе, пачатак новага этапа ў савецка-амерыканскіх адносінах, меры па стрымліванню гонкі ўзбраенняў — ва ўсім гэтым рэальна адчуваецца вялікі асабісты ўклад таварыша Л. І. Брэжнева.

Выключна важнымі падзеямі на шляху разрадкі міжнароднай напружанасці і наладжвання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з'явіліся нядаўнія перагаворы таварыша Л. І. Брэжнева з кіраўнікамі Злучаных Штатаў Амерыкі, Францыі, а крыху раней — Федэратыўнай Рэспублікі Германіі.

Найглыбейшае задавальненне ва ўсім свеце выклікала падпісанне бестэрміновага савецка-амерыканскага пагаднення аб прадухіленні ядзернай вайны. Гэта — важны крок на шляху да змяншэння і ў канчатковым выніку да ліквідацыі пагрозы ўзнікнення ядзернай вайны. Поспехі, дасягнутыя ў разрадцы напружанасці, закладваюць фундамент больш надзейнага, больш, я сказаў бы, мірнага свету для будучых пакаленняў.

Разам з тым мы ведаем, адзначыў ён, што трэба яшчэ вельмі многа зрабіць для практычнай рэалізацыі падпісаных пагадненняў і дагаворанасцей, для адпору тым сілам за рубяжамі нашай краіны, якія процідзейнічаюць разрадцы напружанасці і не адмаўляюцца ад агрэсіўных намераў. Мы жадаем Вам, таварыш Брэжнеў, усяму кіраўніцтву КПСС і нашай дзяржавы поспехаў у рабоце па далейшаму ўсебаковаму развіццю і ўмацаванню нашай Савецкай Радзімы, па ўмацаванню міру і бяспекі народаў.

Д. В. Скабяльцын зачытвае пастанову камітэта ад 19 красавіка 1973 года аб прысуджэнні міжнародных Ленінскіх прэмій «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1972 год і пад бурныя апладысменты ўручае Л. І. Брэжневу дыплом лаўрэата міжнароднай Ленінскай прэміі і залаты нагрудны медаль. Зала вітае Л. І. Брэжнева стоячы, гарачымі працяглымі апладысментамі, воклічамі «Ура!», «Слава ленінскаму ЦК!», «Слава КПСС!» Піянеры ўручаюць таварышу Л. І. Брэжневу вялікія букеты кветак.

Слова для прывітання атрымлівае слесар першага інструментальнага цэха Маскоўскага аўтазавода імя Ліхачова, Герой Сацыялістычнай Працы **В. С. Паўлоўскі.**

Леанід Ільіч Брэжнеў усё сваё свядомае жыццё актыўна змагаецца за вялікую справу нашай ленінскай партыі, за перамогу ідэалаў камунізму, неаддзельных ад міру і шчасця для працоўных. Ён унёс і ўносіць велізарны ўклад у стварэнне ўмоў для мірнай стваральнай працы савецкага народа.

Наша партыя, яе Цэнтральны Камітэт і Савецкі ўрад цвёрда і паслядоўна ажыццяўляюць ленінскую палітыку міру паміж народамі. Партыя выпрацавала і на XXIV з'ездзе прыняла знешнепалітычную праграму нашай дзяржавы, якая знайшла гарачы водгук ва ўсіх кутках зямнога шара, бо яна адпавядае надзеям і спадзяванням усяго чалавецтва.

На трыбуне — Першы сакратар ЦК Партыі працоўных В'етнама **Ле Зуан.**

Знаходзячыся з афіцыйным сяброўскім візітам у СССР, сказаў ён, наша дэлегацыя шчаслівая сёння прысутнічаць на ўрачыстым уручэнні Генеральнаму сакратару Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза таварышу Л. І. Брэжневу, паважанаму другу в'етнамскага народа, Ленінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі». Ад імя членаў нашай дэлегацыі я выказваю таварышу

(Працяг на 2-й і 3-й стар.).

У час уручэння міжнароднай Ленінскай прэміі Генеральнаму сакратару ЦК КПСС таварышу Л. І. Брэжневу.

Прынята па фотатэлеграфе БЕЛТА.

ЗА ВЫДАТНЫ ЎКЛАД У СПРАВУ МІРУ

Брэжневу самыя шчырыя пачуцці і гарачыя віншаванні.

Уручэнне гэтай высокай узнагароды — падзея глыбокага значэння. Яно з'яўляецца выражэннем нястомных намаганняў таварыша Брэжнева, Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і Савецкай дзяржавы ў барацьбе за мір ва ўсім свеце, супраць ваяўнічай палітыкі імперыялізму, за высокія рэвалюцыйныя мэты народаў усяго свету, за мір, нацыянальную незалежнасць, дэмакратыю і сацыялізм.

За мінулы перыяд, працягваў прамоўца, Камуністычная партыя Савецкага Саюза і брацкі савецкі народ аказвалі няспынную падтрымку і шчырую дапамогу в'етнамскаму народу ў барацьбе супраць амерыканскага імперыялізму, за выратаванне радзімы, у будаўніцтве сацыялізму. Гэта дапамога і падтрымка ўнеслі важны ўклад ў дасягненне перамогі в'етнамскага народа, якая выявілася ў падпісанні Парыжскага пагаднення аб спыненні вайны і аднаўленні міру ў В'етнаме на аснове прызнання незалежнасці, суверэнітэту, адзінства і тэрытарыяльнай цэласнасці В'етнама.

Ле Зуан яшчэ раз выказаў шчырую і глыбокую ўдзячнасць Партыі працоўных В'етнама, урада Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам і ўсяго в'етнамскага народа за вялікую каштоўную падтрымку і дапамогу, якую Камуністычная партыя Савецкага Саюза, урад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і брацкі савецкі народ аказвалі в'етнамскаму народу.

З прывітаннем выступае член Камітэта па міжнародных Ленінскіх прэміях, сакратар Балгарскага земляробчага народнага саюза, першы намеснік Старшыні Дзяржаўнага Савета НРБ, Старшыня Нацыянальнага Савета Айчыннага фронту, лаўрэат міжнароднай Ленінскай прэміі **Георгій Трайкаў.**

Уручэнне гэтай узнагароды, гаворыць ён, дае нам добрую магчымасць выказаць нашы пачуцці павагі і ўдзячнасці непасрэдна Вам — вернаму сыну савецкага народа, непахісна адданаму ідэалам Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, яе рэвалюцыйнай барацьбе, яе паслядоўнаму інтэрнацыяналізму, якія цалкам прысвечаны працвітанню і велічы Савецкага Саюза, справе міру і прагрэсу...

Сэрца кожнага балгарына, працягваў прамоўца, перапаўняюць сёння пачуцці самай шчырай любві і ўдзячнасці да Вас, дарагі таварыш Брэжнеў, да савецкіх братоў за ўсё, што Вы шчодра і высакародна робіце ў імя ўмацавання згуртаванасці сацыялістычнай садружнасці, у імя працвітання крышталёва чыстай балгара-савецкай дружбы, якая для нашага народа з'яўляецца наказам часу і справай будаўніцтва новага жыцця.

Слова даецца лаўрэату міжнароднай Ленінскай прэміі, Генеральнаму сакратару Сусветнага Савета Міру **Ромешу Чандра.** Ад імя Сусветнага Савета Міру і яго нацыянальных камітэтаў у больш чым ста краінах свету, сказаў ён, я перадаю ўдзельнікам гэтага пасяджэння пасланне радасці і шчасця. Гэта пасланне зыходзіць ад мужчын і жанчын, маладых і старых з усіх куткоў зямнога шара — ад тых, хто прагне міру і змагаецца за мір, нацыянальную незалежнасць, міжнародную бяспеку, разбраенне, справядлівасць, сацыяльны прагрэс. Усе яны падзяляюць радасць наконг рашэння аб прысуджэнні высокай узнагароды — міжнароднай Ленінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі» Леаніду Ільічу Брэжневу за яго выдатную дзейнасць на карысць усяго чалавецтва...

Народ кожнай краіны ўвачавідкі бачыць плён ажыццяўлення савецкай Праграмы барацьбы за мір і незалежнасць. Народы Індакітая, арабскія народы, усе народы Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі адчуваюць пастаянна растучую падтрымку Савецкага Саюза. Яны ведаюць, што заўсёды могуць разлічваць на гэту падтрымку ў сваёй барацьбе, якая будзе працягвацца і шырыцца.

Мы рыхтуемся цяпер да Сусветнага кангрэса міралюбівых сіл, які адбудзецца ў Маскве. Новы клімат у міжнародных адносінах, стварэнне якога з'яўляецца ў велізарнай ступені Вашай асабістай заслугай, таварыш Брэжнеў, даў магчымасць нам рыхтавацца больш упэўнена, чым калі-небудзь, да гэтага кангрэса, беспрэцэдэнтнага па характару і маштабах у гісторыі руху ў абарону міру.

Выступае настаўніца сярэдняй школы № 72 Кіеўскага раёна Масквы, заслужаная настаўніца РСФСР **З. А. Малахава.**

На лаўрэацкім знаку — вобраз вялікага Леніна, гаворыць яна. Гэта глыбока сімвалічна. Уладзімір Ільіч Ленін заклаў асновы міралюбівай знешняй палітыкі Савецкай дзяржавы, якая з першых дзён свайго існавання кіруецца прынцыпамі міру і дружбы паміж народамі. Гэта палітыка паслядоўна і настойліва ажыццяўляецца Камуністычнай партыяй Савецкага Саюза, яе Цэнтральным Камітэтам...

Усё, што робіць наша партыя, робіцца ў імя шчасця нас і нашых дзяцей, працягвае прамоўца. Дзеці — самае галоўнае багацце народа, яго будучыня. Вось чаму ў нас у краіне ўдзяляецца такая вялікая ўвага выхаванню падрастаючага пакалення. Савецкае грамадства выхоўвае ў дзецях цудоўныя якасці новага чалавека.

Галоўнае, што патрэбна для шчаслівай будучыні дзяцей, — гэта мір. Мы добра ўсведамляем, што трэба будзе прайсці яшчэ доўгі і складаны шлях, перш чым ажыццёвіцца спрадвечная мара чалавецтва аб жыцці без войнаў. Мне хочацца яшчэ раз ад усяго сэрца сказаць «дзякуй» Леаніду Ільічу Брэжневу за той неацэнны ўклад, які Вы асабіста ўносіце ва ўмацаванне ўсеагульнага міру.

Савецкая знешняя палітыка нязменна грунтуецца на класавых, марксісцка-ленінскіх прынцыпах, заявіла З. А. Малахава. Для ажыццяўлення гэтых прынцыпаў неабходны стойкасць, мужнасць, велізарныя веды і вопыт, камуністычная перакананасць. Менавіта гэтыя Вашы якасці, дарагі Леанід Ільіч, садзейнічаюць паспяховаму вырашэнню многіх задач сучаснага міжнароднага развіцця. Вы з гонарам прадстаўляеце наш народ.

На трыбуне — член Камітэта па міжнародных Ленінскіх прэміях, член ЦК Італьянскай кампартыі, лаўрэат Міжнароднай Ленінскай прэміі **Рэната Гутуза.** Ён сказаў:

Прысуджэнне міжнароднай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі» Генеральнаму сакратару ЦК КПСС таварышу Леаніду Ільічу Брэжневу робіць гонар арганізацыям, якія вылучылі яго кандыдатуру, і камітэту, які аднагалосна прагаласаваў за гэту прапанову. Дзейнасць чалавека, на якім ляжыць адказнасць сусветнага маштабу, чалавека, які энергічна, свядома і мужна выступае на карысць міру і ўзаемаразумення паміж народамі, набывае ў сувязі з гэтым велізарнае значэнне.

У гэтым чалавеку знайшлі сваё ўвасабленне тыя ідэалы чалавечага брацтва і міру, якія складаюць галоўны змест ленінскай палітыкі, тых мэт, якія стаялі перад Кастрычніцкай рэвалюцыяй, таго галоўнага, што ляжыць у аснове дзейнасці і маральнага аблічча савецкага чалавека.

Кандыдатура і час для прысуджэння гэтай прэміі выбраны зусім правільна, працягваў прамоўца. Менавіта дзякуючы настойлівай дзейнасці таварыша Л. І. Брэжнева па ажыццяўленню савецкай Праграмы міру чалавецтва можа лічыць, што часы «халоднай вайны» належаць ужо мінуламу.

У заключэнне Р. Гутуза заявіў, што прысуджэнне міжнароднай Ленінскай прэміі таварышу Л. І. Брэжневу з'яўляецца выражэннем падтрымкі яго дзейнасці і ўдзячнасці ўсіх людзей добрай волі, сімвалам іх давер'я і надзей.

З прывітаннем звяртаецца член Камітэта па міжнародных Ленінскіх прэміях, генеральны сакратар арганізацыі «Прыхільнікі міру Фінляндыі», лаўрэат міжнароднай Ленінскай прэміі **Мір'ям Вірэ-Туомінен.**

Усе шчырыя прыхільнікі міру, гаворыць яна, з радасцю адзначаюць, што Леанід Ільіч Брэжнеў паслядоўна ажыццяўляе ленінскую палітыку міру. На XXIV з'ездзе КПСС ён выклаў савецкую Праграму міру, і паспяхова ўжо вырашаны многія вузлавыя задачы, сфармуляваныя ў гэтай праграме.

Выступае лаўрэат міжнароднай Ленінскай прэміі, дзяржаўны міністр Іракскай Рэспублікі **Азіз Шэрыф.**

Я вельмі шчаслівы, сказаў ён, што на маю долю выпаў вялікі гонар горача, ад усяго сэрца павіншаваць Вас, дарагі таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў, з выпадку ўручэння Вам міжнароднай Ленінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі». Прысуджэнне Вам гэтай прэміі — прызнанне Вашых заслуг у нястомнай барацьбе дзеля перамогі ўсеагульнага міру, у ажыццяўленні ленінскай знешняй палітыкі Савецкага Саюза...

Арабскія народы, апіраючыся на ўласны вопыт, ніколі не забудуць таго, што дала ім гэта палітыка, асабліва ў самыя цяжкія для іх часы.

Пералічыўшы прыклады дапамогі Савецкага Саюза арабскім краінам, прамоўца заявіў, што гэтыя прыклады ўпамінаюцца для таго, каб даць адпор спробам, якія робяць кіраўнікі Ізраіля і рэакцыйныя колы ў некаторых арабскіх краінах, каб паказаць у скажоным выглядзе вынікі гістарычнага візіту таварыша Л. І. Брэжнева ў ЗША. Яны спрабуюць пахіснуць веру арабскіх народаў у іх вялікага саюзніка, скажаючы вынікі гэтага візіту, якія датычаць блізкаўсходняй праблемы, і заведама хлусліва сцвярджаючы, што Савецкі Саюз нібыта адыходзіць ад падтрымкі барацьбы арабаў і ад лініі на ліквідацыю вынікаў ізраільскай агрэсіі. Трэба сказаць, аднак, што калі б і была неабходнасць абвяргаць гэтыя выдумкі, то яны перакананаўча ўжо абвергнуты савецкім кіраўніцтвам.

У заключэнне выступлення Азіз Шэрыф перадаў таварышу Брэжневу самыя гарачыя і сардэчныя віншаванні ад усіх арабскіх народаў.

Слова даецца лаўрэату міжнароднай Ленінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі», Генеральнаму сакратару ЦК КПСС таварышу Л. І. Брэжневу.

Прысутныя вітаюць таварыша Л. І. Брэжнева стоячы, бурнымі працяглымі апладысментамі.

Прамова таварыша Л. І. БРЭЖНЕВА

Паважаныя члены Міжнароднага камітэта!

Дарагія таварышы, сябры!

З пачуццём глыбокага хвалявання я прымаю сёння Ленінскую прэмію «За ўмацаванне міру паміж народамі».

Для мяне, камуніста, няма больш пачэснай ацэнкі працы, чым узнагарода, якая носіць імя вялікага Леніна — нашага настаўніка, геніяльнага тэарэтыка, умелага і празорлівага палітыка. Дазвольце выказаць шчырую ўдзячнасць Міжнароднаму камітэту, які ўдастоіў мяне такога высокага гонару.

Знешнепалітычны курс Краіны Саветаў — гэта плён калектыўнага розуму і дзеянняў нашай Камуністычнай партыі. У прысуджэнні мне Ленінскай прэміі я бачу таму ацэнку заслуг усёй партыі, міжнароднае прызнанне правільнасці лініі, праводзімай яе Цэнтральным Камітэтам. І я шчаслівы, што ў радах партыі, якая выхавала і загартавала мяне, магу прымаць удзел у барацьбе за вялікія мэты — трывалы мір і надзейную бяспеку народаў, за мэты, да дасягнення якіх імкнецца ўсё працоўнае чалавецтва.

Для нас, савецкіх людзей, актыўная барацьба за мір — гэта зусім не часовая, кан'юнктурная задача. Гэта — наш прынцыповы, свядома вызначаны, пастаянны курс, які мы праводзім у брацкім адзінстве з усімі краінамі сацыялістычнай садружнасці.

Яшчэ Карл Маркс, празорліва ўглядаючыся ў перспектыву грамадскага развіцця, пісаў, што калі рабочы клас створыць сваё, сацыялістычнае грамадства, то яго «міжнародным прынцыпам... будзе — **мір**, бо ў кожнага народа будзе адзін і той жа валадар — **праца!**» (К. Маркс і Ф. Энгельс. Творы, т. 17, стар. 5).

Наш савецкі народ пабудаваў сацыялістычнае грамадства і цяпер змагаецца за камунізм — лад, які найбольш поўна раскрые творчыя магчымасці чалавека. І зразумела, што наша партыя, якая ўзначальвае бясспрыкладнае ў гісторыі свядомае стварэнне будучыні, наш народ, які бязмежна давярае партыі, уласнымі рукамі ажыццяўляе гэта стварэнне, паслядоўна выступаюць супраць вайны і агрэсіі, за надзейны, трывалы мір для ўсіх людзей на зямлі.

Сапраўды заканамерна тое, што сваё разуменне справядлівага міру, сваё тлумачэнне міралюбівай палітыкі савецкія людзі непарыўна звязваюць з імем нашага правадыра і настаўніка, заснавальніка нашай партыі і дзяржавы — Уладзіміра Ільіча Леніна. Менавіта Ленін упершыню ў гісторыі чалавецтва спалучыў тэорыю навуковага камунізму з практыкай вядзення дзяржаўнай знешняй палітыкі. З гэтага сплаву ленінскай думкі і ленінскай справы і нарадзіліся тыя прынцыпы і метады сацыялістычнага курсу на міжнароднай арэне, якімі мы, яго вучні і паслядоўнікі, кіруемся і будзем кіравацца заўсёды.

Прынцыпы савецкай знешняй палітыкі вядомы сёння ўсяму свету. Гэта — палітыка ўмацавання брацкага адзінства краін сацыялістычнай садружнасці, палітыка ўмацавання саюзу з народамі, якія змагаюцца за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне, палітыка мірнага суіснавання дзяржаў з розным грамадскім ладам, палітыка рашучай барацьбы супраць агрэсіі. Гэта — палітыка актыўнай і сумленнай дыпламатыі, строгага і няўхільнага выканання ўзятых на сябе абавязацельстваў. Такая палітыка адпавядае інтарэсам сацыялізму, інтарэсам усіх народаў, найбольш поўна адпавядае іх жыццёвым мэтам і патрэбнасцям.

Ажыццяўляючы запаветы вялікага Леніна, XXIV з'езд нашай партыі выставіў рэалістычную і, як паказала жыццё, плённую Праграму міру. Гэта праграма натхнёна высокім імкненнем — дабіцца, каб неба над зямлёй заўсёды было чыстае, каб назаўсёды змоўклі гарматы, а ракеты выкарыстоўваліся толькі для мірных спраў, каб невычэрпныя сілы ядзернай энергіі служылі выключна мэтам стварэння, мэтам дабра і шчасця працоўных. Вось чаму наша Праграма міру карыстаецца ў рабочых і сялян, ва ўсіх, хто заняты мірнай працай, велізарнай павагай і ўдзячнасцю, набывае з іх боку растучую і ўсё больш дзейсную падтрымку.

Камуністы заўсёды выступалі за тое, каб народныя масы, іх палітычныя партыі і арганізацыі прымалі актыўны ўдзел у вырашэнні пытанняў, звязаных з вайной і мірам, былі ў сусветнай палітыцы актыўнай сілай, а не пабочнымі назіральнікамі. Голас народных мас можа перашкаджаць толькі тым, хто зацікаўлены ў захаванні міжнароднай напружанасці. І, наадварот: аўтарытэт грамадскасці, яе актыўныя дзеянні здольныя толькі дапамагчы тым урадам, якія паслядоўна праводзяць міралюбівую палітыку.

Карыстаючыся прысутнасцю тут вядомых дзеячаў — прадстаўнікоў міралюбівай грамадскасці, хацеў бы падкрэсліць, што Савецкі Саюз усямерна вітае няўхільнае расшырэнне яе ўдзелу ў барацьбе за міжнародную бяспеку. Мы перакананы, што важным этапам грамадскага руху ў абарону міру стане Сусветны кангрэс міралюбівых сіл, які склікаецца сёлета ў Маскве. Што датычыць нас, то можаце быць упэўнены, сябры, у нашай поўнай падтрымцы гэтага кангрэса, яго высакародных мэт і задач.

Рады тых, хто рашуча і паслядоўна выступае за мір паміж народамі, за міралюбівае супрацоўніцтва ўсіх

краін свету і нацый, растуць з году ў год. Гэта—вельмі добрая прыкмета, гэта ўсяляе ўсім нам пачуццё аптымізму. Мне хацелася б сёння шчыра павіншаваць маіх сабратаў па барацьбе за мір, нашых агульных сяброў, разам са мной удастоеных у гэтым годзе Ленінскай прэміі міру—прэзідэнта Чылі Сальвадора Альендэ, вядомага англійскага пісьменніка Джэймса Олдрыджа, выдатнага дзеяча ўругвайскага і міжнароднага рабочага руху, старшыню Сусветнай федэрацыі прафсаюзаў Энрыке Пастарына. Мы жадаем усім ім, усім лаўрэатам прэміі міру, якая носіць імя Леніна, новых поспехаў у іх гуманнай дзейнасці!

Справядліва гавораць, што вопыт — гэта, перш за ўсё, памяць, памяць пакаленняў. Наш вопыт вучыць: мір не прыходзіць сам па сабе. За яго трэба змагацца. Каб адстаяць незалежнасць і гонар краіны, само права жыць, быць паўнапраўным гаспадаром сваёй зямлі і свайго лёсу, даводзіцца часам ісці на самыя цяжкія ахвяры.

Пяцьдзесят пяць гадоў назад першае пакаленне савецкіх людзей распачало рэвалюцыйнае пераўтварэнне Расіі. Сёння Савецкі Саюз — магутная, свабодная дзяржава, якая ўпэўнена ідзе да камунізму. Але хіба можна забыць, што на кожныя паўтара года мірнага будаўніцтва ў нашай гісторыі прыпадае год вайны або аднаўлення разбуранага вайной?

Цяпер сярэдзіна лета — час, калі квітнеючая прырода раскрывае ўсе свае багацці, свае невычэрпныя магчымасці. І мы разам з ёю радуемся жыццю, адчуваем паўнату працоўнага чалавечага шчасця. Але савецкія людзі не забылі і не забудуць, што ў адзін з такіх жа летніх дзён, трыццаць два гады назад, выбухі фашысцкіх бомб і снарадаў зацямнілі ўсход сонца.

Як і мільёнам саграмадзян нашых, мне з першых дзён вайны і да яе апошняга дня давялося нямала прайсці па франтавых дарогах, правільней па бездарожжу палёў бітвы. Сэрца перапаўняецца вялікай гордасцю за неўміручыя подзвігі, здзейсненыя мужным савецкім народам у час Айчыннай вайны. І разам з тым — пачуццём смутку пры ўспаміне аб тых, хто загінуў смерцю храбрых на палях бітваў, хто быў замучаны ў гітлераўскіх засценках або загінуў пад варожымі бомбамі ва ўласным доме.

Не толькі лёс нашага народа, будучыня нашай Айчыны, але лёс дзесяткаў краін і соцень мільёнаў людзей у розных дзяржавах—вось што было тады пастаўлена на карту. І нікому не дадзена, нікому не будзе дадзена забыць тое, што самім сваім існаваннем, сваёй свабодай людзі нашага часу ў велізарнай ступені абавязаны гераічнаму савецкаму народу, Савецкай дзяржаве, вялікаму сацыялістычнаму ладу!

У мінулым годзе я пабываў у многіх раёнах краіны — у Новасібірскай вобласці і на Алтаі, ва Узбекістане і Казахстане. Гэта была дзелавая паездка, звязаная з бягучымі задачамі народнай гаспадаркі. Гутарка ішла і аб ураджаі, і аб ходзе выканання планаў, аб тым, як лепш, больш эфектыўна вырашаць гаспадарчыя праблемы. Але дзе б і аб чым бы ні заходзіла размова, — ці было гэта на сходзе гаспадарчага актыву, ці ў навуковым інстытуце, у полі або на заводзе, — усюды гучала кароткае і ёмістае слова: мір!

З гэтым словам савецкі чалавек звязвае вельмі многае: любоў да жыцця і да сваёй Радзімы, свае поспехі ў стваральнай рабоце ў імя пабудовы камуністычнага грамадства ў сваёй краіне, у імя агульных ідэалаў працоўных усіх краін. Барацьба супраць агрэсіі, абарона міру — гэта наказ народа нашай партыі, свята выконваюць які, яна ўлічвае сваю адказнасць і перад цяперашнім, і перад будучымі пакаленнямі савецкіх людзей.

Дарагія таварышы!

Сёння мы з'яўляемся сведкамі — ды не толькі сведкамі, але і актыўнымі ўдзельнікамі — знамянальнага павароту ва ўсёй пасляваеннай гісторыі: пераходу ад перыяду варожай канфрантацыі ў міжнародным жыцці, калі навальнічная напружанасць магла выбухнуць віхрам вайны, да перыяду ўсё больш устойлівага мірнага суіснавання, разумнага, на аснове ўзаемнай выгады і роўнай бяспекі, міралюбівага супрацоўніцтва сацыялістычных і капіталістычных дзяржаў.

Шлях ад канфрантацыі да супрацоўніцтва нялёгкі, ён патрабуе і намаганняў, і часу. Важнымі этапамі на гэтым шляху былі заключаныя за апошнія гады ў Еўропе дагаворы паміж СССР і ФРГ, Польшчай і ФРГ, ГДР і ФРГ, сацыялістычнай Чэхаславакіяй і ФРГ, комплекс пагадненняў па Заходняму Берліну. Вялікае значэнне парыжскіх пагадненняў аб аднаўленні міру ў В'етнаме, якія замацоўваюць перамогу справядлівай справы гераічнага в'етнамскага народа. Сваю ролю адыгралі і такія важныя міжнародныя акты, як, напрыклад, Канвенцыя аб забароне бактэрыялагічнай (біялагічнай) зброі або леташнія савецка-амерыканскія пагадненні аб абмежаванні стратэгічных узбраенняў.

Як вы ведаеце, у апошні час у нас адбыліся перагаворы з прадстаўнікамі такіх буйнейшых капіталістычных краін, як Злучаныя Штаты Амерыкі, Федэратыўная Рэспубліка Германіі і Францыя. Мы прысвяцілі гэтыя перагаворы пошукам шляхоў вырашэння важнейшай задачы — задачы замацавання пазітыўных зрухаў у сусветных справах, усталявання ў сферы міждзяржаўных адносін тых прынцыпаў, за якія мы вядзём барацьбу з часоў Кастрычніка, з часоў У. І. Леніна. І трэба сказаць, што праведзеная работа дала рэальныя, адчувальныя вынікі, карысныя як для нашага народа, так і для ўсіх народаў свету.

Удумайцеся, таварышы, у наступнае. На працягу амаль 30 гадоў з моманту ядзерных выбухаў у Хірасіме і Нагасакі чалавецтва жыло з усведамленнем, што дзесьці, за гарызонтам, а магчыма, зусім не так ужо далёка, тоіцца пагроза ядзернай катастрофы. Увесь гэты час міралюбівыя людзі патрабавалі, каб гэта пагроза была выкраслена з жыцця чалавецтва. Цяпер, нарэшце, мы зрабілі рэальныя захады ў гэтым напрамку.

Хіба можна на самой справе пераацаніць тую акалічнасць, што СССР і ЗША — дзве дзяржавы, якія маюць пераважную частку сусветных запасаў ядзернай зброі, дагаварыліся ўстрымлівацца ад пагрозы сілай або прымянення сілы адна супраць адной, супраць саюзнікаў адна адной, супраць іншых краін, што яны згадзіліся дзейнічаць так, каб выключыць узнікненне ядзернай вайны паміж імі і паміж кожнай з іх і іншымі дзяржавамі. Пераацаніць гэта, як відаць, сапраўды, немагчыма!

Мне ўжо даводзілася гаварыць аб тым, што калі б мы абмежаваліся толькі адным пагадненнем са Злучанымі Штатамі Амерыкі — пагадненнем аб прадухіленні ядзернай вайны, — то і ў гэтым выпадку была б зроблена вялікая справа.

Напэўна, доўга яшчэ не складуць зброі агрэсіўныя сілы імперыялізму; не перавяліся яшчэ і авантурысты, якія ў імя ўласных эгаістычных інтарэсаў здольны распаліць новы ваенны пажар. Таму мы лічым сваім свяшчэнным абавязкам так весці палітыку, каб ніякая нечаканасць не магла застаць нас знянацку, каб любая спроба павярнуць свет назад, да часоў «халоднай вайны» неадкладна атрымлівала дастойны адпор.

Лепшы від абароны міру—гэта далейшы актыўны працяг нашай міралюбівай палітыкі, далейшы працяг нашага, як цяпер гавораць, мірнага наступлення.

Красавіцкі Пленум ЦК КПСС даручыў Палітбюро ЦК працягваць актыўна змагацца за поўную рэалізацыю праграмы міру, імкнучыся да таго, каб спрыяльныя перамены, якія ўсё больш адчуваюцца цяпер у міжнародным становішчы, набылі незваротны характар. Ад імя ўсіх маіх таварышаў па Палітбюро, па Цэнтральнаму Камітэту партыі я хацеў бы заявіць: мы не пашкадуем сіл, каб выканаць гэты «мандат міру», дадзены нам партыяй, усім савецкім народам.

Асаблівасць сённяшняй сітуацыі заключаецца ў тым, што некаторыя палажэнні Праграмы міру па сутнасці ўжо выкананы, а выкананне іншых ідзе даволі актыўнымі тэмпамі. Усё гэта прымушае па-новаму зірнуць на некаторыя пытанні. І мы працуем над тым, каб вызначыць новыя мэты, новыя рубяжы нашай палітыкі, ідучы да якіх мы зможам яшчэ больш эфектыўна дабівацца вырашэння галоўнай задачы — умацавання міру, ператварэння мірнага суіснавання ў непарушную норму міждзяржаўных адносін.

Вядома, таварышы, першыя нашы клопаты, як гэта было і да апошняга часу, гэта клопаты аб умацаванні нашых сяброўскіх адносін з краінамі сацыялізму.

Наша партыя, увесь наш народ зведваюць пачуццё глыбокага задавальнення ў сувязі з тым, што брацкія партыі і народы краін сацыялістычнай садружнасці разам з намі актыўна працуюць у імя замацавання цяперашняга павароту ў сусветных справах.

Наша баявое супрацоўніцтва, наша агульная падтрымка дапамаглі атрымаць перамогу гераічнаму в'етнамскаму народу. Нашы сумесныя дзеянні абумовілі тое дынамічнае развіццё становішча ў Еўропе, якое прывяло да склікання агульнаеўрапейскай нарады. Мы перакананы, што ўмацаванне нашага адзінства—гэта важная перадумова далейшага руху наперад на ўсім фронце міжнародных адносін. І цяпер мы распрацоўваем канкрэтныя меры, накіраваныя на далейшае згуртаванне краін сацыялізму.

Вялікую ўвагу мы будзем удзяляць таксама, па прыкладу мінулых гадоў, развіццю нашых адносін з сіламі нацыянальнага вызвалення, з маладымі дзяржавамі Азіі і Афрыкі, якія, стаўшы на шлях свабоды, змагаюцца цяпер за ўмацаванне сваёй незалежнасці, за эканамічнае і сацыяльнае развіццё.

Адна з важнейшых задач сучаснасці заключаецца, як мы перакананы, у тым, каб патушыць агаг агрэсіі на Блізкім Усходзе. Нельга больш дапускаць, каб агрэсары, авантурысты працягвалі трымаць увесь гэты велізарны раён у выбухованебяспечным стане. Правы арабскіх народаў, якія сталі ахвярамі агрэсіі, павінны быць поўнасцю забяспечаны. Войскі Ізраіля павінны быць выведзены з усіх акупіраваных арабскіх тэрыторый. Мір, бяспека і дзяржаўныя граніцы ўсіх краін Блізкага Усходу павінны быць гарантаваны. Што датычыць нас, то мы і ў далейшым будзем цвёрда прытрымлівацца менавіта такога курсу.

Мы лічым важным рабіць новыя захады і для ўмацавання сяброўскіх сувязей з лацінаамерыканскімі дзяржавамі і, перш за ўсё з тымі з іх, якія вядуць актыўную барацьбу за мір і свабоду народаў.

Мы добра ведаем і заўсёды памятаем, што разам з народамі краін сацыялізму народы азіяцкіх, афрыканскіх, лацінаамерыканскіх дзяржаў працаўнікоў, адданых сваёй справе, — заслугоўвае найскладаюць важную частку, так сказаць, пастаяннай арміі міру на арэне міжнародных адносін. Намі разам зроблена ўжо вельмі многа. І мы перакананы, што нашы шляхі і ў далейшым не разыйдуцца. Што датычыць Савецкага Саюза, то ён гатовы прыняць усе неабходныя меры для ўмацавання і развіцця нашага супрацоўніцтва.

У бліжэйшы перыяд часу нам трэба будзе нямала зрабіць і ў плане развіцця адносін з ЗША, Францыяй, ФРГ, Японіяй і іншымі краінамі капіталістычнага свету. Гутарка ідзе аб тым, каб замацаваць дасягнутае аздараўленне нашых адносін, прыняць новыя эфектыўныя меры да паглыблення і расшырэння рамак узаемавыгаднага супрацоўніцтва на прынцыпах мірнага суіснавання. Вядома, перш за ўсё, нам трэба будзе заняцца практычнай рэалізацыяй у поўным аб'ёме усіх тых дагавораў і пагадненняў, якія ўжо ўступілі ў сілу. Па сутнасці ў гэтым заключаюцца адначасова і ўмова, і перадумова далейшага руху наперад.

У Еўропе сапраўды першачарговай справай з'яўляецца завяршэнне работы агульнаеўрапейскай нарады, якая паспяхова пачалася. Мы лічым, што яна павінна быць праведзена ў найкарацейшы тэрмін, без якіх-небудзь неапраўданых затрымак. І мы перакананы, што ўнесены Савецкім Саюзам у Хельсінкі ў згодзе з брацкімі краінамі праект «Генеральнай дэкларацыі аб асновах еўрапейскай бяспекі і прынцыпах адносін паміж дзяржавамі ў Еўропе», а таксама прапановы, унесеныя ў згодзе з намі нашымі сябрамі і саюзнікамі, змогуць стаць дзейсным інструментам рэалізацыі гістарычнай задачы — ператварэння Еўропы ў кантынент трывалага міру.

Належную ўвагу, таварышы, мы будзем удзяляць і праблемам, звязаным з рознымі аспектамі палітыкі раззбраення. Мы цвёрда перакананы, што палітычную разрадку ў Еўропе трэба дапоўніць і разрадкай ваеннай. Будуць прадоўжаны і савецка - амерыканскія перагаворы аб абмежаванні, а затым і скарачэнні стратэгічных узбраенняў. Спадзяёмся, што будзе дасягнуты прагрэс і на жэнеўскіх перагаворах па лініі ААН, якія закранаюць шырокі спектр праблем раззбраення.

Словам, спраў напарадзе шмат, спраў важных, і важных не толькі для савецкага народа, але і для ўсяго чалавецтва.

Дарагія таварышы!

Мы, як савецкія людзі, не можам не зведваць пачуцця гордасці ў сувязі з тым, што іменна наша, Савецкая краіна, ажыццяўляючы запаветы Леніна, стала той дзяржавай, якая ўказвае ўсяму чалавецтву шлях да трывалага міру.

І гэта пачуццё мае пад сабой глыбокую рэальную аснову. Бо міралюбівая знешняя палітыка КПСС — гэта выражэнне волі і вынік намаганняў таго шматмільённага калектыву, імя якому — савецкі народ. У гістарычных поспехі гэтай палітыкі ўнеслі свой уклад усе савецкія людзі — мужчыны і жанчыны, людзі сталага ўзросту і моладзь; тыя, хто варыць сталь, і тыя, хто вырошчвае збожжа; тыя, хто працуе ў лабараторыях, і тыя, хто носіць салдацкі шынель; тыя, хто вучыць нашых дзяцей, і тыя, хто клапоціцца аб здароўі нашага выдатнага народа. І кожны з іх — беззапаветных глыбейшай падзякі і ўдзячнасці за ўсе свае працоўныя і баявыя здзяйсненні!

Наша міжнародная дзейнасць стварае неабходныя мірныя ўмовы для творчай працы савецкіх людзей. У сваю чаргу, вынікі гэтай працы, якія ўвасабляюцца ў памнажэнні багацця і магутнасці нашай Радзімы, у росце дабрабыту і культуры савецкіх людзей, служаць надзейным фундаментам дзейнасці партыі на знешнепалітычнай арэне.

Разам з намі, у адным страі ідуць нашы верныя сябры —народы сацыялістычных краін, браты па класу — камуністы ўсяго свету, барацьбіты за свабоду і незалежнасць, усе, хто адстойвае ідэалы міру і прагрэсу на зямлі. Мы сардэчна ўдзячныя ўсім нашым сябрам за іх салідарнасць і падтрымку, бо чэрпаем у ёй сілу і ўпэўненасць у правільнасці выбранага намі курсу.

Мы хацелі б запэўніць нашых сяброў у тым, што наша палітыка заўсёды будзе паслядоўна спалучаць нацыянальныя інтарэсы Савецкай краіны і інтарэсы працоўных усіх краін, інтарэсы ўсіх, хто выступае за свабоду і незалежнасць, за дэмакратыю і сацыялізм. Мы заўсёды лічылі і сёння лічым сваім непарушным абавязкам, што вынікае з нашых камуністычных перакананняў, з нашай сацыялістычнай маралі, аказваць самую шырокую падтрымку народам, якія змагаюцца за справядлівую справу свабоды. Так было заўсёды, так будзе і ў далейшым.

Дарагія таварышы, сябры!

Сённяшні дзень азнаменаваўся вялікай, радаснай падзеяй у маім асабістым жыцці. Праўда, як вы бачыце, я гавару сёння не аб сваіх асабістых перажываннях, а аб нашых агульных справах, аб нашым агульным мінулым і будучым. Але я не мог зрабіць інакш, таму што ўсё маё жыццё з юнацкіх гадоў прысвечана партыі і яе справам, яе клопатам.

Пасля прысуджэння мне Ленінскай прэміі я атрымаў вялікую колькасць віншаванняў. Ад усяго сэрца дзякую ўсім, хто прыслаў мне гэтыя прывітанні. Я дзякую ад усяго сэрца за добрыя пажаданні і за цёплыя словы, сказаныя цяпер тут, у гэтай зале. Сардэчнасць выказаных у іх пачуццяў глыбока кранае мяне, надае новыя сілы.

Прымаючы Ленінскую прэмію міру, я хачу запэўніць нашу партыю, савецкіх людзей, усіх людзей добрай волі, што буду рабіць і ў далейшым усё, што ад мяне залежыць, дзеля дасягнення самай цудоўнай, самай гуманкай мэты—мэты, заключанай ужо ў самой назве прысуджанай мне ўзнагароды — умацавання міру паміж народамі.

***

Прамова таварыша Л. І. Брэжнева была выслухана з велізарнай увагай і не раз перапынялася працяглымі апладысментамі. Заключныя словы прамовы ўдзельнікі ўрачыстага сходу сустрэлі стоячы, бурнай авацыяй.

Акадэмік Д. В. Скабяльцын яшчэ раз ад імя ўсіх прысутных павіншаваў Леаніда Ільіча Брэжнева з прысуджэннем яму міжнароднай Ленінскай прэміі, пажадаў добрага здароўя і вялікіх поспехаў ва ўсёй яго шматграннай дзейнасці на карысць савецкіх людзей і ў імя міру ва ўсім свеце.

(ТАСС).

ПРА НЕЗАБЫЎНАЕ

МНОГА напісана цікавых твораў аб гераічных справах народных мсціўцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, аб самаадданай барацьбе савецкага чалавека ў тыле ворага. Але гэтая тэма настолькі невычэрпная і важкая, настолькі важна праўдзіва і па-мастацку пераканальна раскрыць вытокі гераізму нашых людзей у змаганні з фашызмам, што з гадамі літаратура не аддаляецца, а як бы становіцца яшчэ бліжэй да тых незабыўных дзён, векапомных падзей. Яна імкнецца даследаваць самыя складаныя і суровыя аспекты і сітуацыі ваеннай рэчаіснасці, нярэдка засяроджваючы ўвагу на сутыкненнях гераічнага і драматычна-трагедыйнага на вайне.

Аповесць Пятра Лісіцына «Февральский наст», змешчаная ў шостым нумары «Немана», апавядае аб суровых днях барацьбы партызан у тыле ворага. Яна невялікая па памеру, ахоплівае абмежаваны час — якіх два дні, вызначаецца простым сюжэтам, падкрэсленай будзённасцю выкладзеных падзей, хоць ад пачатку да канца пранізана трагічным. Але, мабыць, менавіта такое спалучэнне звычайнага з трагічным, будзённага з гераічным і стварае тыя неабходныя «кліматычныя ўмовы», у якіх найярчэй раскрываецца псіхалогія герояў. Расказ пазбаўлены вонкавай патэтыкі, гучыць шчыра, непасрэдна, займальна. Многія мясціны аповесці хвалююць надзвычай. Адчуваецца, што аўтар быў сведкам або нават удзельнікам падзей, пра якія піша, перажыў іх асабіста. Цвёрда абапіраючыся на жыццёвыя факты, ён стварае адпаведную эмацыянальна-псіхалагічную атмасферу, у якой падзеі і сцэны выглядаюць досыць праўдзівымі. І яшчэ вельмі важная дэталь: аналізуючы матэрыял, П. Лісіцын звычайна не спрошчвае абставін рэальнага жыцця, не збочвае, калі трэба паказаць складаны лёс чалавека, ягоны супярэчлівы характар.

У цэнтры аповесці — семнаццацігадовы юнак Ромка Багін. Падрыўнік, на рахунку якога ўжо не адзін варожы эшалон. І на гэты раз ён з групай партызан выконвае баявое заданне: пускае пад адхон эшалон з гітлераўцамі. Здавалася б, на гэтым можна было і паставіць кропку, незалежна ад таго, як будуць разгортвацца падзеі далей: галоўная задача выканана. Паказан гераізм. І ці варта, разбірацца ў непрадбачаных цяжкасцях, у тых небяспечных абставінах, умовах, у якіх апынулася невялічкая група партызан пасля выканання задання. Што ж, такія ўжо жорсткія законы вайны — у імя свайго святога абавязку, у імя будучыні даводзіцца людзям ахвяраваць усім, рызыкуючы нават жыццём.

Аднак менавіта тое, што адбылося **потым** з Ромкам Багіным і яго баявымі сябрамі, найбольш зацікавіла П. Лісіцына як даследчыка жыццёвых рэалій. І гэтая цікавасць, засяроджанасць на «другарадным» не выпадковыя: яны даюць пісьменніку магчымасць прасачыць, як у неймаверна жорсткіх выпрабаваннях гартуецца сапраўдны чалавек і як яшчэ больш драбнеюць, мізарнеюць нікчэмныя людзі.

Здарылася так, што партызанская група, якую ўзначальвае Дзіма Лазарэвіч, не змагла своечасова і арганізавана адступіць ад чыгункі. Яе праследуюць гітлераўцы. У выніку гінуць: цудоўны Ромкаў сябра Лазарэвіч, мужны Васіль Кудрын, былы каваль з Невеля Мікалай Хіжняк і іншыя. Выратоўваюцца толькі двое: Ромка Багін і ад'ютант камбрыга Пільгуй... І гэтыя двое кантрастна адцяняюць адзін аднаго, як бы даюць магчымасць аўтару сфакусіраваць станоўчае і адмоўнае ў людзях.

Сапраўды, хто такі Ромка Багін у мінулым? Не многае нам вядома, акрамя скупых звестак, што ён збег ад сваіх набожных бацькоў «у партызаны» яшчэ хлапчуком, і тое, як ён плакаў, калі камісар партызанскага атрада, жартуючы, сказаў, што не возьме ў атрад... Але ўжо гэтага дастаткова, каб зразумець яго высокія душэўныя якасці.

А далей, у дзеянні, у працэсе падзей, якія калейдаскапічна мяняюцца, падкрэсліваючы напружанасць становішча, мы зусім пераконваемся: якія б ні былі цяжкія моманты наперадзе ў Ромкі Багіна, ён не здрэйфіць, не падвядзе, ён да канца пройдзе нялёгкім і небяспечным шляхам народных мсціўцаў, вытрымае самыя суровыя выпрабаванні ў барацьбе з крыважэрным ворагам. І бадай што галоўныя рысы ў характары юнака, якія вызначаюць яго паводзіны ў складаных надзвычай абставінах, гэта перш-наперш — чалавекалюбства і адданасць вялікай справе абароны Радзімы. Ромка Багін гатовы ахвяраваць сваім жыццём, толькі б выратаваць чулага Васіля Кудрына, ён ідзе на ўсё, але не здраджвае баявой дружбе, баявому пабрацімству: «сподличать, изменить боевой дружбе, убежать он был не способен»... На працягу ўсяго твора юнак, напружваючы сваю волю, імкнецца выратаваць паплечніка па барацьбе...

Гэтак жа мужна, да апошняга дыхання, выконваюць свой абавязак і духоўныя настаўнікі Багіна, Дзіма Лазарэвіч і Мікалай Хіжняк... Іх вобразы намаляваны звычайнымі фарбамі, з цеплынёй, але стрымана, без штучнага пафасу. Тыя шматлікія яркія дэталі, трагічныя сітуацыі, у якіх яны трапляюць, выразна гавораць: перад намі сумленныя людзі, вартыя самай вялікай павагі, чаго нельга, на жаль, сказаць пра ад'ютанта камбрыга Пільгуя...

Пільгуя не назавеш ворагам. Ён не здраднік у поўным сэнсе гэтага слова. Больш таго, ён ненавідзіць гітлераўцаў. Пасля таго, як уцёк з палону, адразу ж прыйшоў у партызанскі атрад. І ўсё ж агіднае нутро ў гэтага чалавека... Яму заўсёды ў складаным становішчы не хапае аднаго апошняга кроку, каб зрабіць так, як дыктуе сумленне. Ён не вельмі пакутуе ад таго, што здрадзіў сябрам, падвёў іх. Яго не мучыць раскаянне: па яго ж віне загінулі, згарэлі ў падпаленай гітлераўцамі хаце людзі. І яго брыдкія разважанні ў фінале толькі канчаткова пераконваюць, што перад намі тып баязліўца, агіднага прыстасаванца.

У той жа час, як нам здаецца, асабліва не пашанцавала П. Лісіцыну з абмалёўкай вобраза былога паліцая Жачака. Спроба, безумоўна, цікавая сама па сабе — паказаць трансфармацыю поглядаў здрадніка. Але дастатковай псіхалагічнай абгрунтаванасці яго паводзін мы не назіраем у аповесці.

Ёсць у аповесці і іншыя істотныя мастацкія праліікі — напрыклад, хібы сюжэтна-кампазіцыйнага парадку, якія пэўным чынам адбіліся на дынамічнасці дзеяння. Пажадана таксама, каб аўтар быў больш уважлівы да тэхнікі самога пісьма, танчэй адчуваў слова. Нярэдка яго героі гавораць задужа літаратурнай мовай. Напэўна, знойдзе чытач там-сям і сляды звычайнай ілюстрацыйнасці, апісальніцтва.

Пры ўсіх непазбежных для маладога празаіка выдатках — аповесць «Февральский наст», бясспрэчна, цікавая, змястоўная проза.

Я. ІВАНОЎ.

ВОБРАЗ НАШАГА СУЧАСНІКА

За апошнія гады значна вырас атрад беларускіх празаікаў. У літаратуру прыходзяць маладыя здольныя пісьменнікі, людзі пасляваенных гадоў нараджэння. Прыходзяць са сваімі тэмамі, сваімі поглядамі на жыццёвыя з'явы нашай рэчаіснасці. Чытач чакае ад іх цікавых твораў, у якіх ва ўсёй велічы раскрываўся б вобраз нашага сучасніка — будаўніка камунізма.

Нельга сказаць, каб маладой беларускай прозе мала ўдзялялася ўвагі з боку крытыкі. Творы маладых празаікаў рэцэнзуюцца ў газетах і часопісах, абмяркоўваюцца на пасяджэннях творчых секцый Саюза пісьменнікаў. Аднак ім не заўсёды даюцца аб'ектыўныя ацэнкі, часцей за ўсё разглядаюцца са скідкай на нявопытнасць, авансам захвальваюцца.

Артыкул Яўгена Лецкі «У дні сённяшнім» прыцягвае ўвагу тым, што ў ім зроблена спроба грунтоўна разабрацца ў набытках і стратах сучаснай маладой прозы... Праўда, артыкул няроўны. Аналізуючы паасобныя творы маладых, крытык нібы палохаецца тых высноваў, якія падказвае аналіз, пачынае згладжваць «вострыя вуглы», апускаецца да кампліментарнасці.

Я. Лецка адзначае, што «беларуская літаратура да гэтага часу не можа даць высокамастацкіх твораў, прысвечаных тэме рабочага класа Беларусі», хаця героямі некаторых твораў маладых і з'яўляюцца рабочыя. Правільней сказаць— толькі названы рабочымі, бо па сваёй псіхалогіі застаюцца сялянамі і далёка не сучаснымі, глядзяць на свет вачамі архаічных дзядоў, якія ацэньваюць вартасць чалавека яго цягай да зямлі. Штучная падгонка характару сучасніка пад мараль учарашняга дня, вядома, не можа даць плёну. Так, у аповесці «Вяртанне» М. Гіль насуперак здаровай логіцы жыцця прымусіў свайго героя, рабочага Сцяпана, пакінуць горад, назаўсёды перасяліцца ў вёску. Аўтар артыкула правільна заўважае, што «ідэя вяртання гараджан у вёску не з'яўляецца такой ужо характэрнай для нашага часу, у жыцці мы наглядаем часцей адваротнае». Для чаго ж спатрэбілася маладому празаіку браць нехарактэрныя з'явы і рабіць з іх абагульненне? Каб зноў выцягнуць на свет даўно асуджаную ідэйку супроцьпастаўлення патрыярхальнай вёскі сучаснаму гораду? Не, намеры М. Гіля, падкрэслівае Я. Лецка, былі зусім іншыя. Але «толькі добрымі намерамі» хвалюючага літаратурнага твора не напішаш. Няведанне жыцця, адступленне ад жыццёвай праўды прывяло да няўдачы, да здрэды мастацкай праўдзе.

За гады Савецкай улады Беларусь стала індустрыяльнай краінай. Вырас і ўзмужнеў наш рабочы клас. Сённяшні рабочы — гэта не той сялянскі хлопец, які, ратуючыся ад голаду, прыйшоў на выпадковыя заробкі, баіцца грукату машын і ўспамінае цішыню пад вербамі на бацькоўскім хутары. Сённяшні рабочы — гэта высокакваліфікаваны спецыяліст, адукаваны, культурны, інтэлектуальны чалавек. Аднак, піша аўтар артыкула, «няма яшчэ ў нас твора, у якім быў бы выведзены такі вобраз рабочага, на якім мы маглі б прасачыць тыповыя рысы рабочага класа». І далей: «патрэба ў інтэлектуальным героі востра адчуваецца ў нашай беларускай літаратуры. Ён, безумоўна, па складу сваёй натуры абавязкова будзе адрознівацца ад прывычнага традыцыйнага «сялянскага» складу».

Характар праяўляецца ў дзеянні, ва ўзаемаадносінах людзей. Маладыя празаікі спрабуюць паказаць канкрэтныя справы нашых сучаснікаў. Аднак самае дакладнае адлюстраванне працоўнай дзейнасці не можа гарантаваць поспеху пісьменніку, калі твор не прасякнуты свежай мастацкай думкай. Магістральнай дарогай сучаснай мастацкай прозы, на думку Я. Лецкі, павінна стаць спалучэнне дакладнасці з праблемнасцю. «Там, дзе гэтая гармонія парушаецца, звычайна атрымліваецца або штосьці надуманае, або, ва ўсякім разе, мала цікавае, нешта такое, што больш-менш чытаецца, але не ўзбагачае нас». Свой вывад аўтар артыкула падмацоўвае аналізам твораў Я. Радкевіча, А. Жука, А. Кудрэўца, У. Кузьмянкова, М. Капыловіча, А. Рыбака.

У апавяданні «Казка пра белага Арапа» Я. Радкевіч зрабіў спробу адлюстраваць вытворчыя і грамадскія ўзаемаадносіны сваіх герояў, але не здолеў «па-мастацку пераканаўча завяршыць цікавыя жыццёвыя канфлікты, больш глыбока асэнсаваць іх».

Актуальную праблему выхавання чалавека ў працоўным калектыве ўзнімае У. Кузьмянкоў у апавяданні «Вяснушка». Вырашае ж яе схематычна, «не столькі ідзе ад жыцця, колькі імкнецца адлюстраваць ідэю падабранымі прыкладамі». У другім апавяданні «Падыход» У. Кузьмянкоў, наадварот, займальна і цікава расказвае аб працы брыгадзіра муляраў, але не ставіць ніякай праблемы.

Яшчэ горш абстаяць справы з адлюстраваннем жыцця сучаснай інтэлігенцыі. Атрымліваецца парадаксальна, гаворыць аўтар артыкула, большасць маладых празаікаў заняты інтэлектуальнай працай, а паўнакроўнага вобраза інтэлігента ім стварыць не ўдаецца.

Артыкул Я. Лецкі цікавы сваёй праблематыкай, наводзіць чытача на роздум. З'яўленне яго на старонках «Маладосці» трэба вітаць. Шкада, што маладзёжны часопіс тэарэтычныя выкладкі не падмацоўвае практычнымі справамі, рэдка друкуе на сваіх старонках паўнакроўныя творы на сучасную тэматыку.

Павел СІНІЦА.

НА ЎЗДЫМЕ ПЯЦІГОДКІ

Чэрвеньскі нумар часопіса «Беларусь» выйшаў у знамянальныя, пазначаныя новым уздымам працоўнага энтузіязму дні.

Пра будзень пяцігодкі расказваюць многія матэрыялы, змешчаныя ў часопісе. Расказваюць на яркіх і разнастайных прыкладах, і хоць часам лаканічна (плошча часопіса абмежавана), але пераканаўча.

Як будуецца ў Магілёве камбінат шаўковых тканін, якія напружаныя часіны перажываюць будаўнікі, чытач даведаецца з артыкула А. Гарбачова «Магілёўскі навасёл». Людзі розных нацыянальнасцей будуюць яго—Анатоль Палякоў і Карлас Радрыгес, Васіль Корда і Мікалай Лашук. І многія іншыя. Яны—будаўнікі і мантажнікі —уносяць у агульную справу часцінку сваёй душы, сваёй дасведчанасці, дапамагаючы адзін аднаму. І на чале адказных вахт—камуністы.

Поспех справы вырашае сацыялістычнае спаборніцтва—яго гісторыі і сучаснасці прысвечаны артыкул Я. Радкевіча «Творчы размах, дакладны разлік». Я. Радкевіч знайшоў цікавыя прыклады для параўнанняў. У 1934 годзе Бабруйскі дрэваапрацоўчы завод атрымаў распіловачныя машыны шведскай фірмы. Малады хлопец, камсамолец Рыгор Рушко выклікаў на спаборніцтва свайго калегу і дасягнуў (пасля ўдасканалення машыны) сусветнага рэкорду распілоўкі драўніны за змену. Цяпер жа, як правільна зазначае Я. Радкевіч, высокімі дасягненнямі цяжка здзівіць каго-небудзь—паняцце творчых пошукаў рабочага разумеецца як працэс і шырокі і глыбока інтэлектуальны.

І яшчэ адзін чалавечы лёс—у маленькім, здавалася б, факце. На Мінскім заводзе аўтаматычных ліній вырас да Героя Сацыялістычнай Працы Канстанцін Паўлавіч Саленік, заснавальнік цэлай школы шліфавальшчыкаў. Ён, многа год займаючы першае месца ў спаборніцтве, аднойчы на шчыце паказчыкаў убачыў сваё прозвішча толькі на трэцім месцы. І што ж? «Твар яго азарыла ўсмешка. Не засмучацца, а радавацца трэба, калі наперад выходзяць твае вучні, хоць і ты не здаеш ранейшых тэмпаў». Вось яно, нараджэнне новай псіхалогіі ў працэсе сацыялістычнага спаборніцтва!

Займае яно думкі і героя нарыса Язэпа Куралікава «Ліпініцкі дыялог» —старшыні калгаса Міхаіла Сцяпанавіча Янкевіча. «З раніцы прыедзе для ўзаемаправеркі дэлегацыя калгаса «Іскра»... Хваляванне не праходзіць: суседзі — самы строгі кантроль».

Спаборніцтву паміж беларусамі і літоўцамі прысвечаны фотанарыс заслужанага дзеяча культуры БССР Л. Эйдзіна «Дружба плён нараджае»; пра людзей працы, іх клопаты, іх удзел у здзяйсненнях пяцігодкі расказваецца ў замалёўцы А. Харкевіча «Сям'я».

...У планах пяцігодкі, у справах яе —далейшае ўмацаванне дружбы народаў, міру ва ўсім свеце.

У тыя ж дні, калі я гартаў «Беларусь», прыйшоў і польскі часопіс «Доокола свята» з артыкулам пра наш край «Рэспубліка за Бугам». «Сёння ў Мінску, сталіцы Беларусі, —гаворыцца ў артыкуле,—і ў Маскве, сталіцы СССР, для ўсіх стала звычайным, што Беларусь — асабліва ў пэўных галінах — з'яўляецца прамысловым гігантам і экспарцёрам буйнога маштабу. Маючы не надта вялікую тэрыторыю, якая займае ледзьве 1 працэнт абшару СССР, і адносна нешматлікае насельніцтва (4 працэнты насельніцтва СССР), Беларусь стварае амаль ПАЛОВУ агульнасаюзнай прадукцыі мінеральных угнаенняў, амаль ПЯТУЮ частку поліэтылену і трактараў, больш чым ПЯТУЮ частку матацыклаў. Калі да гэтага дадаць яшчэ станкі, тэлевізары і радыёпрыёмнікі, грузавікі, сельскагаспадарчыя камбайны, гадзіннікі (амаль тры мільёны ў год), то выявіцца, што ў пералічэнні на душу насельніцтва беларуская прамысловая вытворчасць настолькі значная, што Беларусь належыць сёння да сусветных вяршынь». І яшчэ польскі аўтар прыемна здзіўлены тым, што Беларусь, якая выйшла з векавой адсталасці, па колькасці студэнтаў сёння вышэй за Англію або ФРГ.

Такімі нас бачаць сёння за мяжой. Захапляюцца размахам нашых здзяйсненняў. Як дасягненні нашы выглядаюць у штодзённым жыцці, як працуюць нашы людзі, — пра гэта і расказваюць матэрыялы часопіса «Беларусь».

Алесь МАЖЭЙКА.

СУЗОР'Е ПЕРШАЙ ВЕЛІЧЫНІ

Як дзве вяршыні Эльбруса, паводле трапнага выказвання ўкраінскага паэта П. Тычыны, узвышаюцца ў беларускай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас. Вось чаму нам цікава больш ведаць аб іхнім жыцці, вось чаму кожная новая кніжка пра іх творчасць чакаецца з нецярпеннем. Парадавала выдавецтва «Беларусь» прыхільнікаў бессмяротнага таленту народных песняроў і сёлета. Прыгожа аформленая кніжка «Народныя паэты Беларусі», якая выйшла на чатырох мовах: беларускай і рускай, французскай і англійскай, падрыхтавана Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. Мэта яе — расказаць аб жыцці і творчасці тых, каго сёння чытаюць у многіх краінах свету.

Адкрываецца зборнік артыкулам доктара філалагічных навук Міхася Лазарука «Роднай нівы я мільённая часціна...» пра Янку Купалу. Аб сустрэчах з народным песняром у свой час напісаў цікавыя ўспаміны Пятро Глебка. Пад назвай «Памятныя сустрэчы» яны ўвайшлі ў кнігу. Цёпла адгукаецца аб творчасці Я. Купалы і народная артыстка СССР Ларыса Александроўская.

У зборніку шмат матэрыялаў, якія ўзнаўляюць яркія, незабыўныя старонкі з жыцця другога карыфея нашай літаратуры — Якуба Коласа. Доктар філалагічных навук, прафесар Антон Семяновіч, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Уладзімір Стэльмах, народны пісьменнік рэспублікі Міхась Лынькоў расказваюць пра Коласа-пісьменніка.

Вершы Я. Купалы «А хто там ідзе?» і «Мы людзі свабодныя», Я. Коласа — «Не бядуй», «Народам СССР» добра дапаўняюць фактычны матэрыял. І, канечне, усхвалююць чытачоў фотаздымкі, якія змешчаны ў кнізе.

Зборнік «Народныя паэты Беларусі» — яшчэ адзін яскравы дакумент вялікай павагі да народных паэтаў Беларусі.



Вокладка кнігі.

Ілюстрацыі мастака Пятра Калініна да кнігі «Выбранае» Васіля Быкава, якая выходзіць у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

ПАФАС ПРАЎДЫ

ПЯТРО ГЛЕБКА належаў да таго пакалення, якое расло, старэла і мужнела разам з краінай. Прызваннем яго жыцця, мэтай існавання стала барацьба за развіццё самасвядомасці, культуры роднага беларускага народа. П. Глебку як мастаку было ўласціва вострае адчуванне часу, пачуццё асабістай адказнасці перад партыяй, народам, краінай. Ён шмат і плённа працаваў, а ў 30—40-х гадах быў адным з самых папулярных паэтаў.

Але не менш вядомы і Глебка-даследчык, вучоны, крытык.

Ён шмат пісаў. Праўда, пры жыцці яго артыкулы амаль не выдаваліся асобнымі кніжкамі. Прыемна, што цяпер лепшыя з іх сабраны пад адной вокладкай. Кніга «Паэзія барацьбы і перамогі» — пасмяротны, найбольш шырокі збор крытычных і публіцыстычных артыкулаў, выступленняў выдатнага паэта, акадэміка (выдавецтва «Мастацкая літаратура»).

Можна спрачацца наконт кампазіцыйнай будовы кнігі. Раздзелы называюцца «Слова пра Янку Купалу», «Якуб Колас — пясняр пафасу народнай барацьбы», «Аб Петрусю Броўку» і г. д. Ёсць тут свае плюсы і мінусы. Адразу адчуваецца, што ўвага скіравана на пэўнага мастака слова, бачым таго ці іншага пісьменніка як чалавека, як творцу, сочым за яго ростам. Праўда, часам цяжка заўважыць эвалюцыю ў творчасці самога даследчыка, таму што артыкулы змешчаны не ў храналагічным парадку.

Пачынаецца зборнік «Словам пра Янку Купалу». Гэта заканамерна. Я. Купала быў настаўнікам, дарадчыкам і сябрам П. Глебкі на працягу многіх год. Вось чаму сярод разважлівых, па-навуковаму сур'ёзных артыкулаў аб значэнні творчасці Купалы, аб своеасаблівасцях яго паэзіі чытачу раптам трапляецца невялікі, але сагрэты цёплым сяброўскім пачуццём, артыкул пад назвай «Памятныя размовы». І перад намі — жывы Купала з яго звычкамі і інтарэсамі, тонкай іранічнасцю і пільнай увагай да маладых талентаў. «Я. Купала быў патрабавальным і да сябе і да іншых, — успамінае П. Глебка. — Перакладаючы «Меднага конніка» А. Пушкіна, асобныя строфы ён перарабляў па тры-чатыры разы. А заўважыўшы няўдалы радок у чужым вершы, Іван Дамінікавіч, дабрадушна жартуючы, гаварыў:

— Што ж гэта вы тут напісалі нейкую «энеіду навыварат»?

І ніхто на такі жарт не крыўдзіўся, бо кожны адчуваў шчырае жаданне Я. Купалы дапамагчы маладому паэту. Сваімі заўвагамі народны паэт выхоўваў у маладых пісьменнікаў пачуццё высокай адказнасці за вялікую справу савецкай літаратуры».

З Я. Коласам і К. Крапівой П. Глебка доўгі час разам працаваў у Акадэміі навук. Ва ўспамінах, артыкулах ён паказвае розныя аспекты іх творчасці, падкрэслівае глыбокую народнасць твораў.

Тонкае пранікненне ў сутнасць глыбінных працэсаў літаратуры, уменне паказаць адметнае ў творчасці таго ці іншага пісьменніка відаць і ў іншых працах П. Глебкі. Асабліва цікавыя артыкулы аб сябрах, людзях таго пакалення, разам з якімі ствараў П. Глебка новую сацыялістычную культуру, — П. Броўку, М. Лынькову, М. Лужаніну, П. Панчанку.

Яго разважанні аб творчых пошуках, аб шляхах развіцця беларускай паэзіі і прозы здзіўляюць надзвычайнай трапнасцю, глыбінёй, адчуваннем патрабаванняў часу. Даследчык добра бачыць парасткі новага і ўмее зазірнуць у будучае.

Яшчэ ў 1940 годзе ў артыкуле «Аб нашай паэзіі і аб новых вершах Петруся Броўкі» ён піша: «...Мне здаецца, што недахопы нашай паэзіі былі (ды яшчэ і цяпер ёсць!) **не столькі ў малой дэталізацыі фактаў, аб якіх пісалі паэты, колькі ў занядбанні пачуццямі і страсцямі жывога сучаснага чалавека»** (падкрэслена Глебкам). Ён адзначае, што з кожнай кніжкай Броўка «адыходзіў ад факта і падзеі, набліжаючыся да чалавека і яго перажыванняў», і гэта выказванне бліскуча пацвярджае ўся наступная творчасць цудоўнага паэта, яго апошнія кнігі, якія атрымалі высокія прэміі — Ленінскую і Дзяржаўную.

П. Глебка горача вітаў з'яўленне кожнага маладога таленту. Нікога не абыходзіў пільнай увагай, многім памог ён акрэсліць творчы шлях. З уважлівасцю ставіўся да творчасці А. Куляшова, перасцерагаў яго ад штукарства, фармалістычных выкрутасаў, указваў на неабходнасць узбагачаць вобразную тканіну верша. Пімен Панчанка, Піліп Пестрак, Уладзімір Дубоўка — пра іх таксама сказаў сваё слова Глебка-крытык.

Нямеркі цікавым, думаецца, будзе і знаёмства з творчымі партрэтамі Паўлюка Труса, Язэпа Пушчы. Яны былі сябрамі маладога П. Глебкі, вось чаму ў артыкулах праўдзіва ўзноўлена літаратурная атмасфера 20-х гадоў.

Багатая і публіцыстычная спадчына П. Глебкі. Лепшыя з артыкулаў, прысвечаных актуальным пытанням культуры, мастацтва, літаратуры цікавыя значнасцю тых праблем, якія ўзнімае даследчык, актуальнасцю пастаноўкі пытання.

Хачу закончыць словамі І. Навуменкі з прадмовы да кнігі: «Выданне найбольш значных твораў публіцыстыкі Пятра Глебкі, бясспрэчна, пашырыць наша ўяўленне не толькі аб шматграннай дзейнасці шырока вядомага, заслужанага паэта, але і дапаможа па-новаму зірнуць на многія з'явы роднай літаратуры, больш акрэслена прасачыць яе шлях, выразней убачыць яе здабыткі, дасягненні ў мастацкім асваенні нашай сацыялістычнай явы».

Тацціяна ШАМЯКІНА.

БЕЗ УЛІКУ ЗАЎВАГ

Уладзімір Аляхновіч пачынаў з вершаў. Прыкладна гады чатыры назад выдаў свой паэтычны зборнік на рускай мове. Неўзабаве выдавецтва «Беларусь» выпусціла яго наступную кнігу — прозы. Літаратурная крытыка правільна ацэньвала творы маладога аўтара. У рэцэнзіях адзначалася, што аўтар мае «назіральнае вока», што ён у дарозе, у пошуку, а разам з тым падкрэслівалася яго «празмернае захапленне сентэнцыямі», рабіліся заўвагі на невыразнасць думкі, павярхоўнасць, інфармацыйнасць некаторых навел.

«Ля самага небасхілу» — трэцяя кніга Ул. Аляхновіча. Тут сабраны новыя лірычныя навелы і замалёўкі. Гэта своеасаблівы лірычны жыццяпіс чалавека. Змест увязаны ў кнізе лагічна. Лірычны герой пісьменніка нарадзіўся ў цяжкі час — ішла Вялікая Айчынная вайна. Пра гэта даведваецца чытач ужо з навелы «За сцяною — жыццё», з якой пачынаецца кніга. Чалавек нарадзіўся, падрастаў, набіраўся сілы, пазнаваў навакольны свет.

Адна за адной ідуць у адпаведным парадку навелы «Малюнак на пяску», «Ягня», «Шалёны воўк», «Першая двойка» і г. д. Кожная з іх займае такім чынам сваё пэўнае месца, нясе пэўную нагрузку ў кнізе.

Найбольш цікавай можна назваць навелу «Чорны Кіпцюр». Так празвалі ў народзе аднаго паліцэйскага. Да вайны гэта быў канакрад, вялікі п'яніца і валацуга. Служыў фашыстам ён верай і праўдай. Катаваў, грабіў, вадзіў людзей на шыбеніцы. Ён хацеў уцячы ад людской помсты разам з фашыстамі за мяжу, але гэта яму не ўдалося. Чорны Кіпцюр швэндаецца па лясах, наведваецца ў вёскі, зноў грабіць і забівае людзей. Урэшце рэшт яго затрымлівае міліцыя. Такі кароткі змест гэтай не вельмі лаканічнай навелы. Сюжэт, вядома, не новы, але пісьменнік расказаў пра фашысцкага прыхвасня па-свойму ўражліва. Праўда, Ул. Аляхновіч больш малюе нам знешне Чорнага Кіпцюра, менш паглыбляецца ў псіхалогію злачынцы. Навела намнога б выйграла, каб аўтар хоць адным штрыхам, хоць адным словам сказаў, што зрабіла такім злым і страшэнным нелюдзем Чорнага Кіпцюра.

Здаецца, не зусім атрымалася і канцоўка. Аўтар зрабіў звычайнае газетна-інфармацыйнае паведамленне, што злачынца быў затрыман міліцыяй і паставіў на гэтым кропку. Навела атрымалася незавершанай, нібы гэта загатоўка, накід да нейкага іншага, больш значнага твора.

Ул. Аляхновіч, безумоўна, пісьменнік назіральны. У свае навелы ён імкнецца ўвесь час уціснуць як мага больш фактычнага матэрыялу, але празмерная інфармацыйнасць, апісальніцтва зніжаюць мастацкую вартасць і гэтай, і іншых навел, што змешчаны ў кнізе.

Шкада, што не прыслухаўся Ул. Аляхновіч да голасу сваіх дарадчыкаў, не зрабіў вывадаў з тых заўваг, якія былі выказаны ў друку. У новай кнізе адзначаныя недахопы яшчэ больш адчувальныя. У Ул. Аляхновіча назіраем мы жаданне прыгадваць. Дарэчы, не толькі ён робіць экскурс у мінулае, але і некатарыя маладыя паэты і празаікі, якім цяпер па 25—35 год, становяцца своеасаблівымі мемуарыстамі. Усё прыгадваюць, і прыгадваюць, нібы тыл старыя... Пішуць, напрыклад, якія гульні любілі ў маленстве, як пасвілі авечак і свіней, альбо як недобразычлівы настаўнік паставіў двойку па арыфметыцы ці чыстапісанню.

Злоўжывае гэтым і Ул. Аляхновіч. Піша ён без разбору: пра ўсё падрад — пра авечак, пра бойку вераб'ёў і шпакоў, пра катоў і ваўкоў, пра ўсё, што можна ўбачыць на вуліцы, у лесе, пра што можа ўспомніць і расказаць звычайна кожны чалавек. Увогуле, ніхто не супраць таго, каб «успамінаць». Але ж патрабавальны чытач шукае перш за ўсё ў творах цікавых, яркіх думак, трапных назіранняў, пададзеных на належным мастацкім узроўні. Чакае ён яшчэ і кніг пра сённяшні дзень, пра сучасніка.

Навелам Ул. Аляхновіча яўна бракуе мастацкасці. Мова яго, невыразная, недастаткова вобразная. Стылістычныя недакладнасці, лагічныя неадпаведнасці — на кожнай старонцы. Чытаеш і толькі здзіўляешся. Вось першая навела «За сцяною — жыццё»: **«Памятаю сябе гадоў з двух.** (Можна пазайздросціць чалавеку з такой выдатнай памяццю — **Р. Я.) Дагэтуль мяне, здаецца, не было, а калі і быў, то моцна спаў»** (?)

«Памятаю», «не было», «быў», «спаў»... Неяк адразу хочацца паставіць рубрыку: «Пяро нарыпела».

Паглядзім наступную навелу «Ягня».

« Яно (ягня.—**Р. Я.**) хутка акрыяла і ўжо добра насілася па лузе, **даганяючы матыля ці муху».** Хто, калі і дзе бачыў, каб авечкі ганяліся за мухай?! Дробязі? Бадай што, дробязі. Ды ўжо вельмі часта сустракаюцца яны на старонках кнігі.

«Навошта людзям **па дзве нагі,** — дзівіўся я. — У Атарыка (так звалі старога чалавека.—**Р. Я.**) адна нага, а за ім ніхто не ўгоніцца».

«Не паспею прыдрамнуць дзе-небудзь пад кустом, як авечкі ўжо **стаяць пярэднімі нагамі на плятні...»**

Прыкладаў дастаткова, каб пераканацца ў тым, што піша Ул. Аляхновіч паспешліва і няўважліва, па-прынцыпу, што з рук, тое — у друк.

Праўда, у некаторых навелах, як, напрыклад, «Ледзяная вада акоўкі», «Белыя сны», «Вальс кахання» аўтару ўдаліся малюнкі роднай прыроды, ёсць цёплыя, прачулыя радкі пра бацькоўскі край. Але вельмі часта малюнкі гэтыя падобны адзін на другі: шэпчуцца травы, лозы, гойсае вецярок, і бясконца, амаль у кожнай навеле, спяваюць птушкі...

Трэба ўдасканальваць майстэрства!

Рыгор ЯЎСЕЕЎ.

* Ул. Аляхновіч. «Ля самага небасхілу». Лірычныя замалёўкі і навелы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1973.

ТАБЕ, ПЯЦІГОДКА!

Паслязаўтра — Дзень металурга. Вось чаму ўвагу нашага карэспандэнцкага паста на Мінскім трактарным заводзе на гэты раз прыцягнулі ліцейшчыкі. Супрацоўнікі рэдакцыі пабывалі ў «гарачых» цэхах, пазнаёміліся з перадавікамі вытворчасці, падзяліліся творчымі планамі.

У прыватнасці, празаік А. Капусцін прачытаў сваё новае апавяданне, прысвечанае сталяварам. Ліцейшчыкі з увагай праслухалі твор, зрабілі аўтару слушныя заўвагі. Апавяданне «Адкрытае пісьмо» А. Капусцін прысвяціў сталяварам Мінскага трактарнага завода.



Аляксандр КАПУСЦІН

АДКРЫТАЕ

АПАВЯДАННЕ

●

РАНІЦА яшчэ толькі наступіла, а сонца прыпякала—аж млосна... Спякота высмоктвала вільгаць з зямлі, каб потым лінуць яе спорным дажджом дзе-небудзь на палетак ці на распаленыя шыферныя дахі гарадскіх камяніц-гмахаў. Пятро Бярэшчанка расшпіліў каўнер кашулі, дыхаў глыбока. З прыкрасцю падумаў: «Дзе яны клычацца, тыя хмары,—так зямлю асвяжыць трэба...»

Якая б яна ні была—Пятро любіць раніцу: на пачатку дня ён заўсёды адчувае ў сабе нейкую звыклую спакойную ўпэўненасць. Але сёння ў душы не было той бадзёрай настраёвасці. Ён крочыў і чамусьці напружана прыслухоўваўся да людскога гоману, да шчэбету ластавак, што імкліва праносіліся над галавой да нейкай сваёй незадаволенасці. Настырна лезлі думкі пра сход, які меўся адбыцца надвячоркам.

Пятро бачыў: Васіль затаіў на яго крыўду, не зразумеў, што паводзіць сябе не так, як належыць майстру. Цяпер ён не заўважыў, калі да яго падкраліся разважанні, якіх ён чамусьці асцерагаўся больш за ўсяго: што, яму болей чым каму трэба? Навошта пісаў пра тое благое? Лепш паведаміў бы, як план выконваецца, як шчыра і ўдала мудрагеляць заводскія рацыяналізатары, дык ніхто не скасавурыўся б. Наадварот, глядзіш, той, каго ты пахваліў у газеце, табе мо аж цераз вуліцу, цераз натоўп прывітанне кідаў бы, лагодную ўсмешку пасылаў бы. А добрага ж на заводзе—не пазычаць.

Пятро не адганяў ад сябе гэтых разважанняў. І мо таму на душы ў яго была не радасць, а нейкая нязнаная дагэтуль смутная трывога, якая, мусіць, толькі тады і прыходзіць да чалавека, калі ён падсвядома адчувае, што ў чымсьці хітрыце перад самім сабой.

Калі Пятро зайшоў у цэх, Васіль ужо быў там. Ён нешта тлумачыў Анатолю Сімчуку, рэзка размахваў рукамі. Каштанавая густая чупрына нізка апала яму на лоб, прыдала твару выгляд неўтаймаванага задзіры. Сімчук маўчаў. Схаваўшы вочы за цёмныя сталяварскія акуляры, пазіраў у печ. Бы застыў, выцягнуўшы доўгую шыю.

Васіль узняў руку, каб уладна секануць перад яго носам густое, гарачае паветра, ды так і трымаў яе нейкі момант. Адчуў на сабе пільны Пятроў позірк, павярнуў галаву. Расцягнуў шырокі рот ва ўсмешцы, але вочы-слівы былі халодныя, як лёд. Калі Васіль Грабеннік злуецца, вочы яго святлеюць. Па гэтаму позірку Пятро зразумеў, што зараз ён спакойны, наколькі можа быць спакойным такі чалавек, як Грабеннік.

Пры ўсёй сваёй вераб'інай рухавасці Васіль быў вельмі высокі і, здавалася, няўклюдны. Ідзе — зыбаецца ўвесь, нахіляецца ў такт крокам, быццам кланяецца каму. Але чалавек ён не з такіх, што схіляюць галаву, каб пакланіцца.

Усміхнуўшыся. Грабеннік спакойна апусціў руку, адвярнуўся. Пятро ступіў шырэй, каб хутчэй прайсці міма.

Яго электрапеч была побач. Перш, чым прыступіць да справы, Бярэшчанка ўважліва абвёў позіркам печ: ён заўсёды, па даўняй завядзёнцы, так рабіў—быццам вітаўся з ёю. Потым нарасціў графітавыя электроды, пачаў націскаць кнопкі на пульце кіравання. Усё ішло нармальна: вялізныя электроды павольна асядалі, крануліся вадкага металу. Павышаючы тэмпературу, заспявалі сваю песню электрадугі. Тры залацістыя «вочкі» на пульце кіравання добразычліва падміргвалі Пятру: парадак, электроды гараць нармальна.

Пераканаўшыся, што ўсё ідзе як трэба, Бярэшчанка паглядзеў на Анатоля Сімчука: як той, усё спявае? Ён любіў назіраць за Анатолем: хлопец заўсёды, калі праца ладзілася, або насвіставаў што-небудзь, або мармытаў песню сабе пад нос. Нічога гэтага, праўда, не чулася з-за шуму, але відаць было па тым, як выцягваліся ў трубачку ці варушыліся яго пухнатыя вусны, надаючы дабрадушнасць цыганкаватаму твару.

Сёння Анатоль моўчкі націскаў на кнопкі. У кожным яго руху Пятру бачыўся нейкі асаблівы сэнс і лаканічная мудрасць. Рухі былі мэтанакіраваныя і плаўна пераходзілі адзін у другі. Гэта было надзвычай прыгожа.

Канвеер пранёс на сваёй магутнай спіне першыя формы, што шырока паразяўлялі глоткі-літнікі. Кран падаваў вялікі коўш. Калі коўш стаў пад выпускны латок печы, Пятро прывычным спрытным рухам рукі ўключыў рубільнік. Велізарная электрапеч пачала павольна нахіляцца на зубчастых сектарах. Па латку ў коўш паліўся вогненна-белы метал. Струмень быў ціхі, роўны, не «страляў» іскрамі. Пятру закарцела крыкнуць Анатолю: «Парадак, серка ў шлак пайшла—ніводнага стрэлу. А ў цябе як там?» Але той усё роўна не разабраў бы яго слоў, і Пятро толькі ўсміхнуўся яму. Твар яго пасвятлеў, маршчынкі пад вачыма, здаецца, парадзелі.

А далёка ў душы па-ранейшаму жыў неспакой. Ёй не хапала чагосьці звычайнага, простага і яснага.

●

За час, што працавалі разам, у Пятра ўсяго было з Васілём Грабеннікам: і сварыліся і ладзілі. Пятро, праўда, не вельмі ахвочы да спрэчак: навошта гэтыя чупрыннікі—каб сэрца рваць? Ды як ты ні ашчаджай сябе, але не заўсёды змоўчыш, калі ўвачавідкі крыўда бярэ верх над праўдаю.

У той перадсвяточны дзень, калі ў цэху панаваў прыўзняты, бадзёры настрой, ніхто не думаў, што здарыцца такая прыкрасць. Заліўшчык Мацвей Аўцюшэнка, чалавек ужо не маладога веку, не прыйшоў на работу. Сын яго Рыгор, які таксама прапаваў заліўшчыкам, сказаў, што бацька захварэў. Васіль калупнуў хлопца сярдзітым позіркам, узгарэўся: нябось, у нутро заліваць за святочным сталом таму нямогламу хворасць не перашкодзіць, куляць будзе чаркі — толькі падстаўляй... У клопатах, у мітусні ён, здавалася, неўзабаве забыўся пра гэтую размову, а калі Рыгор ,скончыўшы сваю змену, выходзіў з цэха, пасігаў яму напярэймы.

—Гэй, вырастак, не вельмі разганяйся,—кінуў на ходу. — Вярніся, балявшчага свайго заменіш. Скажы ж ты, кволыя якія пасталі некаторыя: чуць дзе забрыніць—ён ужо на бюлетэнь.—Грабеннік плюнуў далёка ўбок, быццам там, прытаіўшыся, стаяў той пагарджаны нядбайнік, які так бессаромна падвёў яго.

Рыгор Аўцюшэнка паправіў пасму доўгіх русявых валасоў, што лезла ў вока. Адказаў пахмурна, з крыўдай у голасе:

—Навошта вы так... Бацька сапраўды занядужаў. А мне ніяк не выпадае, справа адна чакае.

—От так, справа яго чакае... Скажы ж, народ які пайшоў! Прэміі атрымліваць—толькі давай, а калі іншы раз трэба лішку папрацаваць—хай дзядзя? Лайдак жа ты, непаварацень..

Бярэшчанка стаяў воддаль, слухаў, і яму здавалася, што гэтыя словы грукочуць, як камяні, калі іх высыпаюць з кузава самазвала.

Каб не ўзгарэцца, стрымаць сваё абурэнне, ён пераконваў сябе, што ў пэўнай меры Васілю можна дараваць гэты тон. Ён больш чым хто іншы мае права на такую жорсткую патрабавальнасць: сам пачынаў з заліўшчыка, рабіў сталяварам — і заўсёды ў працы за ім не ўгнацца было. Цяпер таксама няма яму ўгамону: гэта ён прыдумвае — каб метал як лепш варыўся, тое—каб у плаўках «дарагія мінуты скарочваліся». Баліць у чалавека душа за справу—от і крычыць, акрамя таго, ён цяпер начальнік..

—Перастань. Хіба нельга па-людску?—Пятро ўзяў Грабенніка за локаць, памкнуўся адвесці.

—Па-людску, па-людску... Ветлівенькія ўсе пасталі, сціпленькія...—Васіль тузануў руку, вырваўся.—А якая ад вашай ветлівасці карысць? Што ёй выб'еш з іншага соўсеня? І наогул, чаго ты сунеш нос не ў сваю справу? Ці я табе загадваю?

Рыгор Аўцюшэнка пазіраў на майстра, нервова, раз-пораз зацягваўся дымам. Адтапыраныя ад цыгарэты пальцы яго злёгку дрыжалі.

— Доўга я ўгаворваць буду? Ці табе вушы пазакладала?

Хлопец няўклюдна, цяжка павярнуўся і пайшоў назад у цэх.

—Ты што гэта?..—Бярэшчанка раптам задыхаў часта-часта.—Чаго вызверыўся на чалавека?

—Заткніся, абаронца. Добранькі—дык ідзі ды працуй за яго.

—А ты падумаў, грубіян няшчасны, пра тое, што ў яго цяпер усё з рук будзе валіцца? Прадукцыйнасць, інтэнсіфікацыя... А ці падумаў хаця б пра тую прадукцыйнасць?

—Далікатныя якія ўсе пасталі: нічога не скажы, голас не ўзвысь. Мужчына, называецца, рабочы клас. Можа яшчэ губы станеце памадаю квэцаць ды пазногці манікюрыць?

Пятру страшэнна захацелася крыкнуць: «Які ж ты нягоднік!» Толькі гэтыя словы чамусьці заселі ў яго грудзях. Замест іх глуха вырвалася зусім неспадзяванае:

—Цяпер ужо я табе не дарую, хопіць. Цяпер я ведаю, што мне трэба рабіць.

Дома, як заўсёды, Пятро прагледзеў школьныя дзённікі дзяцей, дапамог малодшай, залатавалосай Веры рашыць задачку—доўга, цярпліва, можа нават залішне старанна растлумачваў ёй правіла, у якім яна блыталася. Потым абыякава слухаў, як дзяўчынка шчабятала яму, што яна сёння запісалася ў харавы гурток і неўзабаве будзе выступаць на сцэне, што задавака Віцька, які не любіць катоў, прынёс у школьны куток жывой прыроды смешнага вожыка.

—Ну, добра, дачушка, добра. Выступай, спявай,—гаварыў ён, засяроджаны на сваім.

ПІСЬМО

Жонка, управіўшыся на кухні, уключыла тэлевізар. Паказвалі канцэрт Людмілы Зыкінай. Пятру здаўна вельмі да спадобы гэта цудоўная актрыса: спявае — заслухаешся. Але цяпер ён не стаў глядзець перадачу. Спачатку наважыўся пайсці да суседа пагуляць у шахматы, потым перадумаў. Здавалася, яшчэ ніколі не было яму так сумна і прыкра. Патупаў ля кніжнай паліцы, узяў «Огонек», сеў за стол. Не прыкмеціў, як зноў вярнуўся да разважанняў: а ці добра гэта—пісаць такое на чалавека, з якім разам працуеш?

Недзе за акном шастаў цёплы вецер. У пакой глядзела ясная поўня. Раптам месячык быццам заплюшчыў сваё бледна-жоўтае халоднае вока— на яго насунулася цёмная хмарка.

Нягледзячы на згрызотлівыя, супярэчлівыя думкі, Пятро рашуча дастаў з шуфлядкі стала паперу. Роўненька, нібы да чагосьці прымерваючыся, паклаў яе перад сабой, пачаў пісаць. Напіша сказ, прачытае, пасядзіць, схіліўшы на бок падстрыжаную «пад вожыка» галаву, і зноў кладзе роўныя буйныя радкі. Потым—і калі наклейваў канверт, і калі нёс пісьмо ў паштовую скрынку—яму чамусьці здавалася, быццам усё гэта робіць не ён, а хтосьці іншы.

Нешта тыдні праз два артыкул быў надрукаваны. І ўсё здарылася якраз так, як Пятро і меркаваў.

Быў абедзенны перапынак. Грабенніку, які разам з іншымі рабочымі курыў у альтанцы, нехта падаў газету. Ён спакойна пабег вачыма па загалоўках, перагарнуў старонку.

—О, глядзі ты!—усклікнуў прытворна весела. —«Адкрытае пісьмо сталявара П. Бярэшчанкі».

Працяглым калючым позіркам на хвіліну прыцяўся да Пятровага твару і стаў чытаць артыкул услых. Голас яго хрыпеў, газета дрыжала ў руцэ. Ад цыгаркі, заціснутай у пальцах, тоненька струменіў дым.

Дачытаўшы да канца. Грабеннік ляніва пацягнуўся, расправіў плечы.

— Так-так, значыць, майстар сваёй грубасцю стварае ў цэху неспрыяльны мікраклімат, — сказаў са стрыманай з'едлівасцю. — От гэта карэспандэнт, от гэта даў жару!

Гучна зарагатаў. Але схаваць сваю раз'юшанасць за ненатуральным, раскацістым рогатам яму не ўдалося. Ён павольна адклаў газету, раптам усхапіўся з лаўкі, шпурнуў цыгарку пад ногі. Сыпануў на Пятра лаянкай, крычаў, што не ён, а такія, як гэты карэспандэнт, мікраклімат у калектыве псуюць — сваёй ліберальнай дэмагогіяй расслабляюць дысцыпліну, падрываюць аўтарытэт кіраўніка. Ім—абы быць добранькімі, а тое, пра што баліць галава у майстра, іх не вельмі турбуе.

Супакоіўся ён таксама раптоўна, як і ўсхадзіўся. Абвёў усіх, што былі ў альтанцы, позіркам, ціха, з ноткамі крыўды ў голасе, сказаў:

— Усё, абмеркаванне душэўнага артыкула таварыша Бярэшчанкі закончана. За работу.

Да канца змены ён быў такі ж, як заўсёды — няўрымслівы, захоплены працаю. Толькі ледзь улоўная напружанасць у крыху прыўзнятых плячах выдавала яго незвычайную ўзрушанасць.

Назаўтра Грабеннік з'явіўся ў цэху бадзёры, чыста паголены, у светла-блакітнай сарочцы, якая надавала яму маладжавасці. Усмешліва павёў брывом па Бярэшчанку:

— Ха-ха! — Гэта ў яго азначала смех. Ён гучна вымаўляў гэтыя два склады, а твар мог быць нават сярдзіты. — Ну, як спалася, найлепшы сябра, якія прыемныя сны сніў? Ці можа зноў да досвітку страчыў данос у які-небудзь клапатлівы орган?

І Пятро зразумеў: Васілёва зацятасць яшчэ больш распалілася ад пакутлівага крыўдлівага роздуму, які ў бяссонную ноч вярэдзіў яго душу.

На сходзе было, як і заўсёды бывае на сходах. Выбралі прэзідыум, сакратар партбюро Іван Астапчук, высокі, стройны чалавек з чорнымі прасіўленымі валасамі на лабатай галаве, аб'явіў парадак дня—абмеркаванне адкрытага пісьма сталявара Бярэшчанкі, якое надрукавана ў газеце. Адразу пачаў чытаць артыкул. Чытаў павольна і гучна.

Скончыўшы, ён павёў позіркам па засяроджаных людскіх тварах і тады, заўсёды вытрыманы, ураўнаважаны, неспадзявана захваляваўся: паклаў аловак на стол, узяў, зноў паклаў.

— Давайце, таварышы, абмяркуем артыкул, шчыра абмяняемся думкамі.—Астапчук гаварыў, а сам усё ўзіраўся ў людзей, быццам намагаўся разгадаць іх думкі раней, чым яны будуць выказаны.

Людзі маўчалі—іх гняла цяжкая насцярога нязвычнасці.

— Дык каму першаму слова? Першы мае права выйсці за рэгламент,—знарок жартоўна дакляраваў Астапчук, каб неяк пахіснуць, расслабіць гэтую насцярогу.

Хтосьці з апошняга раду, прыкінуўшыся бяскрыўдным прасцячком, гукнуў:

— Кіно пускайце—сон разгоніць. За кошт заўкома, канечне.

Жарт не прынялі, ніхто не засмяяўся.

Паўза, старожкая, гняткая, зацягнулася. І калі Пятру падалося, што ёй не будзе канца, на пярэдняй лаўцы з краю заварушыўся Анатоль Сімчук. Ён упёр рукі ў калені, цяжка, як бы нехаця, устаў. Уцягнуў галаву ў плечы, быццам баяўся, што зараз яго нехта агрэе ззаду.

— Я от што надумаўся, таварышы,—пачаў ён разважліва, з нейкім заходам, ды раптам як адрэзаў:—Сёння мы павінны строга асудзіць учынак майстра Грабенніка.

— Пачакай, пачакай, Анатоль, што ты так стыхійна,—сакратар партбюро пастукаў алоўкам па сталу. — Трэба парадкам. Слова мае таварыш Сімчук. От цяпер—давай.

— Ёсць, канечне, у мяне і добрыя словы пра майстра. Справу сваю, можна сказаць, ведае ён дасканала і кіруе правільна. Зноў жа, патрэбна каму дапамога—калі ласка, заўсёды дапаможа. Але ж нярэдка ад дапамогі той потым аж моташна. Як разыдзецца, дык толькі і чуеш: нездаляка, лайдак, абібока. Нікога тады не слухае. Дакаралі яго не раз — нуль увагі. Так што мая прапанова—строга асудзіць. Нашаму калектыву, можна сказаць, ніяк не выпадае мірыцца з грубасцю — час не той.

Сімчук смешна задраў падбародак, але ніхто не ўхмыльнуўся. «Маладзец, Анатоль, па-сталяварску», — падумаў Пятро.

— Горача ды малавата, — з апошніх радоў, як у бочку, прабухаў густы нізкі бас.

Чарнявая маладая жанчына, што сядзела каля акна, сабрала губы ў вузельчык, павярнулася, пашукала вачыма таго, хто сказаў гэтыя словы. Не знайшла, зноў заняла сваю ранейшую позу.

— Гэта ён — што з месца. Каб за трыбуну стаў — там бы разышоўся, там, бачыце, любяць пагаварыць, — траскатліва, нібы тая сарока, зашчабятала яна. — Дайце мне слова, дапоўню.

«Мусіць, нехта з новых, штосьці я не ведаю яе». — Пятро зацікаўлена пазіраў на жанчыну і чамусьці спадзяваўся, што яна зараз добра «натаўчэ» Васіля — баявая, такая не стане хаваць, што думае. Жанчына сапраўды ўзрушана кідала папрок за папрокам. Прыгадала, як нядаўна ў канторы Грабеннік усчаў сварку, што недакладна выверылі даныя па выплаўцы сталі за тыдзень.

— Толькі, бачыце, пераступіў парог, і, як той буран, пайшоў ламаць-крышыць, пайшоў... А высветлілася потым — не разабраўся. Ды калі б і сапраўды ён меў рацыю, дык ці так, бачыце, трэба сцвярджаць ісціну?

Жанчына лёгкім дотыкам рук паправіла валасы, хаця яны і без таго былі прычасаны, яшчэ больш узвысіла голас:

— Хіба мала добрых слоў, бачыце, ёсць, каб і пераканаць, і прыемнае ў душу чалавека ўнесці? Не, яму паганыя ў смак.

Васіль слухаў з напружаным тварам — ні адзін мускул не здрыгануўся на ім. Зрэнкі яго звузіліся, сталі вострымі, аднак трывогі, разгубленасці ў іх не было нікольки.

Жанчына наважылася сесці, ды зноў, нешта ўспомніўшы, выпрасталася:

— Калі, таварыш Грабеннік, не адумаешся — я сама напішу на цябе ў газету, сама. У нашу, у насценную. І намалюю карыкатуру — з роту во такі чорны язык тырчыць.

Яна паказала перад сабой рукою на ўсю яе даўжыню. У зале засмяяліся, а яна зноў сабрала губы ў вузельчык, сядзела сярдзіта насупленая.

Неўзабаве то ў адным, то ў другім кутку залы ўскідваліся рукі — прашу слова.

Пятро быў задаволены, што грубіяну даюць, як кажуць, і ў хвост, і ў грыву. Але разам з тым душу яго мардавала гняткая прыкрасць: не шкада было б, каб Васіль нядбайнік які быў. Дык жа — шчыры, старатлівы чалавек, спецыяліст добры... І во ваюй з ім... Пятро пазіраў на яго і думаў: няўжо ён і цяпер не схіліць перад людзьмі сваю гарачую ўпартую галаву?

У сярэдзіне залы ўстаў слесар з фармовачнага канвеера Змітро Бабраўнічы. Пятро здзіўлена падумаў: «Што, і гэты аганьку падкіне? Маўчун-маўчун, ды і ён разварушыўся, і яго пацягнула пагаварыць».

Бабраўнічы, высокі, у акулярах, стаяў скасабочыўшыся, выставіўшы правае плячо. Гаварыў павольна, крыху заікаўся. Ён таксама дакараў Грабенніка. Раптам глухаваты голас яго нібы зарыпеў, нібыта стаў драпаць Пятрову душу.

— А цяпер пра цябе, таварыш Бярэшчанка. Ты таксама адкажы народу: ці правільна ты зрабіў, што на ўсю краіну абняславіў калектыў, ці не? Хіба нельга было без газеты разабрацца вось тут, на сходзе? Адкажы от...

Словы гэтыя ўваходзілі ў свядомасць Пятра дужа цяжка, жывасілам. Яму не верылася, што іх сказаў менавіта Змітро.

Першае, што падалося — Грабеннік падбухторыў. І добра ведаў, чаму менавіта Бабраўнічага: каб маўчун ды вось так рашуча загаварыў? Значыць набалела чалавеку, значыць нарабіў ты, Бярэшчанка, шкоды... Але здагадку гэтую Пятро адразу ж адкінуў: не, Васіль не будзе падбухторваць, ён не здольны на такое. Што, калі Бабраўнічы ў нечым мае рацыю? Калі сапраўды гэтае адкрытае пісьмо кінула цень на добрае імя калектыву? Гэтак жа не толькі Змітро — многія іншыя могуць падумаць. Вунь і шчабятуха тая: у насценгазету напішу... Добра думала, што гаварыла — правільна, вінаваты майстар, але ж шырокаму свету не трэба пра гэта ведаць.

Пятро ўпіўся позіркам у твар Бабраўнічага. Той, мусіць, адчуўшы зніякавеласць ад гэтай пільнай прыглядкі, кашлянуў, махнуў рукою:

— Ты не свідруй мяне вачыма, не свідруй. Думаеш, спалохаюся, што і пра мяне ў газеце напішаш? Не спалохаюся. Хто б гэта так зрабіў? Завод ордэнамі ўзнагароджаны, такое дасягненне, такі гонар, а тут нейкае смецце з хаты ды на вецер, хай разносіць яго па белым свеце...

— Дык хіба лепш, калі смецце ў куток замятаюць ды венікам прыкрываюць? — не стрываў Пятро. — Хіба ад гэтага ў хаце чысцей бывае?

— От бачыце? — Змітро паказаў рукой на Бярэшчанку, агледзеў залу. — Думае, што герой, што вялікую справу зрабіў.

Пятру кінулася ў вочы, як да непрыемнага тырчаць у Бабраўнічага вялікія чырвоныя вушы. Закарцела прыціснуць іх да галавы.

Недзе ў кутку хтосьці раптам хіхікнуў. Недарэчна, дробненька. Гэты смяшок чамусьці ўразіў Пятра яшчэ больш, чым калючыя словы Бабраўнічага. Ён павярнуўся, пашукаў вачыма таго насмешніка, зноў паглядзеў доўгім позіркам на сетку зморшчынак пад вачыма ў свайго абвінаваўцы, на яго палыселую галаву. Толькі цяпер ён ўжо нібыта страціў да гэтага чалавека цікавасць. Стомлена ўпікнуў сябе: «Так табе і трэба— не пажадаў слухаць спевы Зыкінай? Дапісаўся...»

Бярэшчанка пазіраў у акно. Правёў вачыма самалёт, які прыгожа ляцеў у блакітным небе. Самалёт быццам цягнуў за сабой у паветры белую стужку. Ён праляцеў, а стужка вісела... Слабы вечаровы прамень сонца лёг Пятру на шчаку, лашчыў і прыгураваў яе. Неспадзявана захацелася заплюшчыць вочы, пасядзець сціхана, нічога не чуць і ні пра што не думаць — ні пра сход, ні пра самалёт, ні пра белую стужку.

А гамана не сціхала, людзі ўсё выступалі.

●

Зямля за дзень напяклася. Вільготны вецер-нізавік, што падзьмуў з ракі, крыху астуджваў гэтую ўдушлівую гарачыню. Ён мякка штурхаў Пятра ў спіну, шчыльна прыціснуў да лытак халаднаватае калашыне штаноў.

У Пятра было адчуванне, быццам ён доўга брыў па бездарожжы — так стаміў яго сённяшні дзень. А што, урэшце, з таго сходу, з таго адкрытага пісьма? Не лашчылі грубіяна, гаварылі з ім сурова, ды ён усё роўна не апусціў вачэй. Толькі крыху прыгорбіўся, калі выходзіў пасля сходу з чырвонага кутка. Пачуў, як нехта ў тлумнай гамане кінуў абразлівае слова — адшчапенец. Зыркнуў туды спадылба, пашукаў вачыма, хто гэта сказаў, і зноў вунь як задраў галаву — шастом носа не дастанеш! Нібы ўсе перад ім вінаватыя, адзін ён чысты перад усім белым светам. Не, на ім хіба каб кувалдай якой... Ды і то наўрад: бі ні бі — толку мала. Бяда, калі ў чалавека такі якоўкі характар, бяда...

Ат, хопіць думаць пра гэта. Словам, кропка, ніякіх больш ні адкрытых, ні закрытых пісьмаў у газету...

Пятро чуў за сабой цяжкія крокі, адчуваў чужы позірк на сваёй спіне. Ад гэтага позірку, здавалася, аж засвярбела пад лапаткамі, бо ён амаль ведаў, хто за ім крочыў.

Той, што ішоў ззаду, ужо дыхаў як не ў патыліцу. Ён закурыў, кінуў запалку ў невялікую лужыну каля калонкі — Пятро чуў, як яна засіпела. Параўняліся.

— Ну што, карэспандэнт, кусануў ды не вельмі. Выходзіць, рот у цябе шчарбаты. Бачыш, знайшліся і ў мяне заступнікі. От жа не плачу, як бачыш.

Пятро наліваўся раздражненнем, маўчаў: бескарысна гаварыць з ім. Разгублена думаў: «Якая моцная была рашучасць нешта даказаць гэтаму чалавеку, а цяпер вось... нібы ў дурных застаўся. Слабы, мусіць, я. Цяжка быць слабым...»

Дайшлі да завулка з рэдкімі ліхтарамі на жалезабетонных слупах. Недзе тут жыў Васіль. Не згаворваючыся, спыніліся. Стаялі, маўчалі. Ад Грабенніка нібыта зыходзіла нейкая трывожлівая сіла. Яна адчувалася ў тым, як ён выпрастаўся, стаў ганарлівы, незалежны. Усведамленне гэтай яго сілы раптам выклікала ў Пятра злосць. Ён нечакана для сябе ступіў да Васіля блізка-блізка.

— Скажы яшчэ што-небудзь, ну, скажы!...

Грабеннік палез у кішэню, дастаў цыгарэты. Зазірнуў у пусты пачак, скамечыў яго і шпурнуў далёка ўбок.

На ўсходзе распаласавала неба бліскавіца. Пярун заварушыўся ляніва — грымота даляцела, калі Пятро ўжо не спадзяваўся яе пачуць. Цяпер прыслухаўся, ці не загрыміць яшчэ. І Васіль пазіраў на неба, слухаў. Раптам плечы яго перасмыкнуліся, як ад холаду. Ён павярнуўся да Пятра.

— Хочаш яшчэ нешта пачуць? Дык слухай.

Але ён нічога больш не сказаў Пятру, толькі злёгку крануў яго за руку. І ў гэтым асцярожным дотыку той здзіўлена адчуў нешта зусім новае.

...На зямлю мякка ўпалі першыя буйныя дажджынкі.

ЗА КУЛЬТУРНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ХЛЕБАРОБАЎ

Калегія Міністэрства культуры БССР прыняла пастанову, у якой гаворыцца, што многія культасветустановы, музеі, тэатры і канцэртныя групы распрацавалі планы культурнага абслугоўвання насельніцтва на перыяд уборачнай кампаніі. У Гродзенскай вобласці на базе Шчучынскага раёна праведзена абласная практычная канферэнцыя сельскіх культасветработнікаў «Аб павышэнні ролі ўстаноў культуры ў разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва за павелічэнне вытворчасці прадуктаў сельскай гаспадаркі ў 1973, рашаючым годзе пяцігодкі».

Гомельскае абласное ўпраўленне культуры стварыла аргкамітэт, які ажыццяўляе каардынацыю дзейнасці ўстаноў культуры і мастацтва па арганізацыі культурнага абслугоўвання працаўнікоў сяла і аказанню метадычнай і практычнай дапамогі сельскім культурна-асветным установам.

Многія раённыя аддзелы культуры, як, напрыклад, Івацэвіцкі, Шчучынскі, Клецкі, Гомельскі, Столінскі, Ваўкавыскі, Бярэзінскі, Аршанскі, Асіповіцкі і іншыя распрацавалі цікавыя мерапрыемствы на перыяд уборкі ўраджаю, у якіх прадугледжваецца шырокае прымяненне розных форм арганізацыі асвятлення спаборніцтва, стварэнне агітпаяздоў, актывізацыі дзейнасці калектываў мастацкай самадзейнасці, агітацыйна - мастацкіх брыгад.

Тэатры і канцэртныя арганізацыі рэспублікі падрыхтавалі змястоўныя праграмы, распрацавалі графікі выступленняў. Канцэртна-лекцыйныя і эстрадныя калектывы Беларускай дзяржаўнай і Гомельскай абласной філармоній ужо пачалі свае выступленні перад хлебаробамі. У Гродзенскую вобласць з гастролямі выехаў Беларускі дзяржаўны тэатр імя Янкі Купалы. Пачалі паказ спектакляў перад працаўнікамі калгасных палёў тэатр імя Якуба Коласа і Брэсцкі абласны тэатр імя Ленінскага камсамола.

Разам з тым, як адзначаецца ў Пастанове калегіі Міністэрства культуры БССР, не ўсё яшчэ культурна-асветныя ўстановы вызначылі сваё месца ў гэтым важным этапе барацьбы за ўраджай, не ўстанавілі цеснай сувязі з працоўнымі калектывамі калгасаў і саўгасаў. Ідэйна-мастацкі ўзровень праграм некаторых творчых калектываў яшчэ не адпавядае ўзросшым патрабаванням і задачам сённяшняга дня.

У Пастанове вызначаны шляхі паляпшэння культурнага абслугоўвання сельскага насельніцтва ў перыяд уборкі ўраджаю. Абласным упраўленням, раённым і гарадскім аддзелам культуры, установам культуры прапанавана: актывізаваць сваю дзейнасць па арганізацыі культурна-масавай работы сярод механізатараў, паляводаў, занятых на ўборцы ўраджаю, шырэй укараняць разнастайныя формы асвятлення сацыялістычнага спаборніцтва. Намечана карэнным чынам палепшыць работу самастойных аўтаклубаў па абслугоўванню механізатараў, паляводаў, якія заняты на ўборцы ўраджаю.

Бібліятэкам рэспублікі рэкамендавана арганізаваць непасрэдна на рабочых месцах чытанні газет, часопісаў, інфармаваць працаўнікоў калгасных палёў аб ходзе выканання сацыялістычных абавязацельстваў. Для лепшага абслугоўвання насельніцтва кнігай, будуць шырока выкарыстоўвацца нестацыянарныя формы абслугоўвання: перасоўкі, пункты выдачы літаратуры і іншыя.

Гарадскім установам культуры рэкамендавана палепшыць практычную дапамогу сельскім клубам, дамам культуры, бібліятэкам у арганізацыі культурнага абслугоўвання сельскага насельніцтва, арганізаваць сістэматычнае выступленне гарадскіх калектываў мастацкай самадзейнасці ў калгасах і саўгасах.

У адпаведнасці з планамі мастацкага абслугоўвання сельскага насельніцтва ў перыяд уборкі ўраджаю тэатры і канцэртныя арганізацыі пакажуць для працаўнікоў сяла 1884 спектаклі і канцэрты. Прадугледжваюцца творчыя сустрэчы з вядучымі артыстамі тэатраў і канцэртных арганізацый рэспублікі.

У калгасы і саўгасы выедуць мастакі для аказання дапамогі ў афармленні наглядной агітацыі.

Дзяржаўны мастацкі музей БССР арганізуе перасоўныя выстаўкі партрэтных галерэй, перадавікоў сельскай гаспадаркі, графічных рэпартажаў з калгасаў і саўгасаў.

Лепшыя калектывы, якія вызначацца ў арганізацыі культурна-масавай работы на ўборцы ўраджаю, асобныя работнікі культуры будуць узнагароджаны Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюзаў работнікаў культуры, грашовымі прэміямі.

У мэтах асвятлення ўдзелу ўстаноў культуры і мастацтва ва ўборачнай кампаніі рэкамендавана шырока выкарыстоўваць друк, радыё і тэлебачанне.

ЛУНАЙ, НАША ПЕСНЯ, НАД НІВАЙ ПЫРОКАЙ!

НАШЫХ СЭРЦАЎ ПАРЫВЫ...

Густой сцяной стаіць жыта, упояс —ячмень, пшаніца і авёс. Спецыялісты сцвярджаюць, што накруг будзе не менш 25 цэнтнераў збожжавых з гектара. На лінейку гатоўнасці выйшлі камбайны, шафёры завяршаюць рамонт аўтамашын.

Мы, культработнікі, таксама не сядзелі склаўшы рукі, а разам з калгаснікамі рыхтаваліся да ўборкі. Дапамагчы роднаму калгасу своечасова і без страт убраць ураджай,—гэта наш абавязак. Яшчэ ў пачатку года, распрацоўваючы сацыялістычныя абавязацельствы на 1973 год, мы прадугледзелі многія мерапрыемствы на перыяд уборачных работ. Дарэчы, свае абавязацельствы паспяхова выконваем. Калгас дапамог аформіць наглядную агітацыю ў доме культуры і сельскай бібліятэцы, добраўпарадкаваць тэрыторыю, што прылягае да дома культуры, пераабсталяваць памяшканне сельскай бібліятэкі. Заканчваем афармленне кабінета перадавога вопыту, метадычнага кабінета культасветработы.

На перыяд уборкі падрыхтавалі макеты плакатаў-маланак, календароў працоўнай славы, куды штодзённа будзем заносіць імёны пераможцаў спаборніцтва на жніве, уборцы бульбы, буракоў і іншых культур. Наглядная агітацыя абноўлена ў кожнай вёсцы, брыгадзе. А вечарам у доме культуры хлебаробы паглядзяць светагукавую газету «Калгасныя навіны».

На цэнтральнай сядзібе калгаса—дошка паказчыкаў сацыялістычных абавязацельстваў. Кожную раніцу ў гонар пераможцаў спаборніцтва пад гукі духавога аркестра будзе ўзнімацца сцяг працоўнай славы.

Плануем правесці за месяц не менш двух вечароў шанавання пераможцаў. Ім жа будуць прысвечаны тэматычныя канцэрты мастацкай самадзейнасці. У промні насценнай газеты «Пражэктар» трапяць парушальнікі дысцыпліны, розныя недахопы на ўборцы зернавых.

Вялікай папулярнасцю карыстаецца наша агітацыйна-мастацкая брыгада «Дняпро». На перыяд уборкі яна падрыхтавала новую праграму, распрацавала свае маршруты. У першую чаргу агітбрыгада выступіць у Сяльцы, Палянавічах, Старым Сяле, пасёлку Дружба. Брыгада будзе ўдзельнічаць пры ўручэнні пераходных вымпелаў лепшым камбайнерам і шафёрам. Ім будуць прысвячацца песні, частушкі, танцы.

Мы дапамаглі падрыхтавацца да ўборкі Палянавіцкаму сельскаму клубу і брыгадным клубам у вёсках Сялец і Вець. Афармілі дошкі паказчыкаў, календары працоўнай славы, распрацавалі сцэнарый вечара шанавання перадавікоў уборкі ўраджаю, правялі аднадзённы семінар-практыкум з работнікамі клубаў і бібліятэк сваёй зоны абслугоўвання на тэму: «Клуб, бібліятэка ў перыяд уборачных работ». Наша сельская бібліятэка штодзённа будзе арганізоўваць непасрэдна на рабочых месцах чыткі газет, знаёміць працаўнікоў з апошнімі падзеямі, ходам выканання сацыялістычных абавязацельстваў. Дадаткова на перыяд уборкі арганізавалі тры пункты выдачы літаратуры: у Старым Сяле, Палянавічах і Сяльцы.

У верасні разам з шэфамі—будаўнічым трэстам № 12 г. Магілёва правядзем у калгасе свята ўраджаю.

В. ШУСЦІКАЎ,
дырэктар Абідавіцкага сельскага дома культуры Быхаўскага раёна.
Т. КІСЯЛЁВА,
загадчыца Абідавіцкай сельскай бібліятэкі.

ВАМ, ПРАЦАЎНІКІ ПАЛЁЎ...

Расказвае З. ШАШУК, загадчык аддзела культуры Івацэвіцкага райвыканкома:

— Жніво — самая адказная часіна ў хлебаробаў. Трэці, рашаючы год дзевятай пяцігодкі паставіў перад імі нямала складаных праблем, ад паспяховага вырашэння якіх залежыць многае. Каб своечасова справіцца з уборкай, рыхтаваліся не толькі калгаснікі і рабочыя саўгасаў, але і работнікі культасветустаноў нашага раёна. На савеце аддзела культуры райвыканкома былі абмеркаваны пытанні дзейнасці клубаў і бібліятэк, разгледжаны сцэнарыі агітацыйна-мастацкіх брыгад, праграмы выступленняў канцэртных груп.

У раёне нямала здольных механізатараў, паляводаў — сапраўдных майстроў хлебаробскай справы. Слава пра іх пайшла далёка. Як жа паведаміць аб іх людзям, паказаць працу герояў на жніве? Дзеля гэтага і склікалі нараду-практыкум. Дапамаглі нам і мясцовыя журналісты раённай газеты. Як выпусціць баявыя лісткі, «маланкі», календары працоўнай славы, насценныя газеты—такія пытанні непакоілі многіх. Пра ўсё гэта гаварылася на нарадзе.

Гаворка праходзіла так, каб наглядная агітацыя пасіла не агульны характар, а адлюстроўвала канкрэтнае жыццё, змагла мэтанакіравана прапагандаваць вопыт перадавікоў вытворчасці, клікала і будзіла пачуцці адказнасці ў людзей за якаснае правядзенне работы.

Улічваючы, што працаўнікі палеткаў абмежаваны своечасовай інфармацыяй, да агульнай справы падключацца не толькі работнікі культуры, але і палітінфарматары. Выкарыстоўваючы свежыя навіны, справаздачныя даныя, яны правядуць гутаркі, раскажуць пра надзеі жыцця.

Вялікі вопыт масава-палітычнай і культурна-асветнай работы маюць Любішчынскі, Магіліцкі, Косаўскі сельскія дамы культуры, Гортальскі, Краглевіцкі, Голенскі, Гошчынскі і іншыя сельскія клубы. Самадзейныя артысты правялі генеральныя рэпетыцыі. З першымі камбайнамі над шырокімі палеткамі паплыве іх пераліўная песня.

Прапаганда перадавога вопыту даручана аўтаклубу аддзела культуры райвыканкома.

Вялікі атрад культасветработнікаў падключыцца на ўборку новага ўраджаю. Самадзейныя артысты выступяць не толькі з канцэртамі, але прымуць і актыўны ўдзел у рабоце, як гэта робіцца звычайна ў Целяханскім, Косаўскім, Магіліцкім сельскіх дамах культуры. Перад выступленнямі юнакі і дзяўчаты гадзіны са дзве працуюць на таках — пералапачваюць і чысцяць зерне, грузяць машыны і адпраўляюць іх на нарыхтоўчыя пункты. Папрацаваўшы ў ахвоту, баяніст расцягвае мяхі баяна, на кузаве машыны, або проста на зялёнай мураве пачынаецца выступленне. Над шырокімі палеткамі льецца песня.

З ГОМЕЛЯ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

Сяргей ЛІС,
намеснік начальніка Гомельскага абласнога ўпраўлення культуры:

—Яшчэ ў пачатку года мы аб'явілі агляд-конкурс устаноў культуры вобласці, мэта якога—шырока прапагандаваць вопыт перадавікоў пяцігодкі, пераможцаў у сацыялістычным спаборніцтве, для якіх праца стала справай доблесці і геройства.

Як працуюць сёлета ўстановы культуры вобласці? Яны бліжэй сталі да жыцця народа, яго патрэб. Нядаўна на савеце ўпраўлення культуры абмяркоўвалася работа культасветустаноў Рэчыцкага і Гомельскага раёнаў. Расказвалі загадчыкі аддзелаў культуры Алена Угольнікава і Якаў Румаеўскі. Радуе, што многія ўстановы культуры гэтых раёнаў сталі своеасаблівымі асяродкамі, дзе ўмела прапагандуецца вопыт лепшых людзей калгаснай вёскі.

У Ровенска-Слабадскім сельскім доме культуры цікава праходзяць так званыя вечары-партрэты. Героем такога вечара з'яўляецца лепшы механізатар, даярка або паляводаў. Пра іх жыццё расказваюць суседзі, таварышы па рабоце. Канцэрт складаецца з любімых твораў тых, каму прысвячаецца вечар. За шэсць месяцаў такіх вечароў у Рэчыцкім раёне адбылося 39. Варты ўвагі і вечары, на якіх падводзяцца вынікі спаборніцтва паміж калгасамі. Іх праведзена 66.

Уся работа ўстаноў культуры скіравана сёння на тое, каб людзі ведалі правафланговых пяцігодкі, тых, хто шчыруе на працы, дамагаецца добрых поспехаў.

Актыўнымі памагатымі ў прапагандзе вопыту перадавікоў сталі нашы бібліятэкары. Сёлета ў Рэчыцкім раёне значна павялічылася выдача сельскагаспадарчай літаратуры. Калгаснікам, рабочым саўгасаў, спецыялістам сельскай гаспадаркі выдадзена 8,5 тысячы экземпляраў літаратуры па актуальных пытаннях сельскай гаспадаркі. Гэта на тысячу больш, чым летась.

10 ліпеня адбылася нарада работнікаў культуры Гомельскага раёна. Пачынаецца масавая ўборка ўраджаю. Аб месцы работніка культуры ў гэтыя дні гаварыў у сваім дакладзе старшыня райвыканкома Р. Чарнян.

У баявой гатоўнасці ўсе інфармацыйна-мастацкія і агітацыйныя брыгады сельскіх клубаў і дамоў культуры. Іх у дні ўборкі ўраджаю будзе працаваць каля 40. Ды яшчэ дзве агітбрыгады раённага дома культуры.

Пачалося жніво ў калгасе імя XXII з'езда КПСС, у саўгасе «Гомельскі» і іншых гаспадарках раёна. Людзі працуюць з ранку і да цямна. У кароткія хвіліны адпачынку да іх прыязджаюць самадзейныя артысты, а лектар ці кіраўнік гаспадаркі расказвае калгаснікам пра важныя падзеі дня ў раёне, вобласці і за мяжой.

Змястоўна, ініцыятыўна працуюць Урыцкі, Яроменскі, Красненскі, Пакалюбіцкі і Клімаўскі сельскія дамы культуры. Ва Урыцкім доме культуры (дырэктар Аляксандр Пераверзеў) ці-

ДРУЖБА СЯРПА І МОЛАТА

Культурна-шэфская работа палаца культуры мінскіх трактарабудаўнікоў над працаўнікамі калгасных палёў Лагойскага раёна, што на Міншчыне, вядзецца ўжо некалькі год. Яна стала сістэматычнай і пастаяннай.

Калектыў палаца культуры распрацаваў план культурна-шэфскай работы на пяцігодку, які накіраваны на ажыццяўленне рашэнняў XXIV з'езда КПСС — дапамагаць збліжэнню культурнага ўзроўню горада і вёскі.

На аснове гэтага складаюцца перспектыўныя планы на кожны год. Абавязацельствы па аказанню арганізацыйна-метадычнай і практычнай дапамогі культурна-асветным установам Лагойшчыны заўсёды выконваюцца. Ход выканання планаў і абавязацельстваў сістэматычна аналізуецца палацам культуры МТЗ, аддзелам агітацыі і прапаганды РК КПБ Лагойскага раёна.

З чэрвеня 1972 года па чэрвень гэтага года ў нашым падшэфным раёне было дадзена 78 спектакляў і канцэртаў сіламі мастацкай самадзейнасці. Неабходна адзначыць, што сумесна з самадзейнымі артыстамі ў госці да сельскіх працаўнікоў прыязджалі лепшыя рабочыя трактарнага завода. Сярод іх Героі Сацыялістычнай Працы брыгадзір кавалёў-штампоўшчыкаў Ф. Самусёў, інжынер Р. Прусава і іншыя. Пасланцы трактарабудаўнікоў бываюць на палях, фермах, размаўляюць з калгаснікамі, цікавяцца іх поспехамі ў сельскагаспадарчай вытворчасці, расказваюць аб поспехах свайго роднага завода. Такія блізкія кантакты праходзяць цікава і заканчваюцца канцэртамі. Рабочыя ўручаюць хлебаробам памятныя падарункі — мадэлі трактара «Беларусь», гаспадары ж палёў сваім гасцям — дар калгаснай зямлі — хлеб-соль. Потым пачынаецца вялікі святочны канцэрт. Ён працягваецца 2—3 гадзіны. Улетку заводская самадзейнасць выступае на імправізаванай сцэне сельскай аколіцы.

Выязджаючы ў сяло, самадзейныя артысты не абмяжоўваюцца адной канцэртнай дзейнасцю, а тут жа на месцы даюць сельскім калектывам кансультацыі і парады па акцёрскаму майстэрству. Такім чынам, шэфства носіць характар навучальна-выхаваўчай работы. Акрамя гэтага, не менш двух разоў за год праводзім і семінары з культработнікамі падшэфнага раёна. У тэматыцы семінараў звяртаем увагу на такія пытанні як планаванне клубнай работы, методыка арганізацыі мастацкай самадзейнасці і інш.

Сёлета, як і ў мінулыя гады, мы склалі спецыяльны план работы палаца культуры па аказанню дапамогі на перыяд уборкі ўраджаю хлебаробам Лагойшчыны. У плане прадугледзелі і больш частыя выезды калектываў мастацкай самадзейнасці, выпуск баявых лісткоў, «маланак», насценных газет, гутарак з калгаснікамі. Нашы самадзейныя артысты будуць у сваіх выступленнях праслаўляць лепшых працаўнікоў палёў, крытыкаваць недахопы. Усё гэта разлічана на тое, каб дапамагчы хлебаробам убраць ураджай без страт.

Я. МІЛЬШЫН,
дырэктар палаца культуры Мінскага трактарнага завода.

Агітбрыгада прыехала.

МАРШРУТЫ АЎТАКЛУБА

У дні падрыхтоўкі да жніва аўтаклуб аддзела культуры падрыхтаваў дзве тэматычныя праграмы: «Сацыялістычнаму спаборніцтву — шырокі размах» і «Перадавыя метады працы — кожнаму». Паедзем па загадзя распрацаванаму маршруту-графіку.

Работа аўтаклуба спланавана так, каб аператыўна інфармаваць калгаснікаў аб дасягненнях лепшых майстроў земляробства і жывёлагадоўлі. Для гэтай мэты афармляем аператыўныя бюлетэні, баявыя лісткі, «маланкі», календары працоўнай славы. Як летась, шырокае прымяненне знойдуць тэхнічныя сродкі прапаганды. З дапамогай гуказапісваючай апаратуры будзем выпускаць радыёгазеты і радыёчасопісы, прысвечаныя героям уборачнай.

Выкарыстаем добра зарэкамендаваную ў мінулым годзе форму папулярызацыі перадавога вопыту механізатараў — інтэрв'ю ў полі з запісам на магнітафонную стужку, каб у іншых калгасах пазнаёміць з іх выступленнем.

Рабочыя планы аўтаклуба цесна звязваем з вытворчымі паказчыкамі гаспадарак. Нас заўсёды цёпла сустракаюць хлебаробы. І ўсе нашы ўдзельнікі ўдзячны іх шчырай і сардэчнай сустрэчы.

Добрымі памочнікамі аўтаклуба з'яўляюцца аматары мастацкай самадзейнасці В. Шахоўская, С. Кулік, А. Шарснёў, Н. Гоцман, Я. Марозава і інш.

Г. БАБКОВА,
загадчыца аўтаклуба Аршанскага аддзела культуры.

ЭЛЕКСІР БАДЗЁРАСЦІ

Як шклянка гаючай вады праганяе смагу ў чалавека, так удалае выступленне агітацыйна-мастацкай брыгады здымае стомленасць у працаўнікоў палёў, дапамагае набрацца новых сіл і энергіі. Добрая агітбрыгада — гэта элексір здароўя, бадзёрасці для хлебароба. У гэтым пераканаліся самадзейныя артысты Стаўбцоўскага народнага агіттэатра «Полымя», агітбрыгады Івянецкага гарпасялковага дома культуры «Залаты колас», калгаса «Бальшавік» Лагойскага раёна, «Неспакойныя сэрцы» Смалявіцкага РДК, «Каласок» Старадарожскага РДК, «Колас» калгаса «Чырвоны сцяг» Стаўбцоўскага раёна, якія частыя госці на палетках. Кожнае іх выступленне ўспрымаецца бурнымі апладысментамі.

Папулярнасць названых брыгад невыпадковая. Гэтыя калектывы ўпарта працуюць над сабой, павышаюць мастацкі ўзровень, штогод абнаўляюць праграму.

Тры гады запар у вобласці зімой-вясной з мэтай далейшага развіцця і ўдасканалення праводзіцца агляд-конкурс агітацыйна - мастацкіх брыгад. У гэтым годзе конкурс праходзіў пад дэвізам — «Пяцігодка ў дзеянні». У ім прыняло ўдзел каля 300 агітбрыгад вобласці. Вынікі паказалі, што ў большасці сваёй агітацыйна-мастацкія калектывы правільна разумеюць ідэйна-палітычныя задачы, якія ўскладаюцца на іх.

Гэта датычыць перш за ўсё дыпламантаў: маладую агітбрыгаду Смалявіцкага раённага дома культуры «Неспакойныя сэрцы» (кіраўнік А. Бутар) і ўжо прызнаны Стаўбцоўскі народны агіттэатр «Полымя» (кіраўнік М. Грэсь), агітбрыгаду стройнай, чоткай кампазіцыі Старадарожскага раённага дома культуры «Каласок» (кіраўнік В. Гурыновіч), развясёлую агітбрыгаду Івянецкага гарпасялковага дома культуры «Залаты колас» (кіраўнік І. Ляшчынскі).

І ўсё ж мастацкая апрацоўка дакументальнага матэрыялу, пошукі новых форм падачы яго яшчэ не дасягнулі патрэбнага ўзроўню. Большасць агіткалектыўаў будуе сваё выступленне па прынцыпу канкрэтных праграм, тады як агітацыйна-мастацкі жанр прадугледжвае драматургічную аснову. Гэта значыць, патрабуе стварэння сцэнарыя, які адпавядаў бы ўсім нормам, што прад'яўляюцца літаратурнаму ці драматургічнаму твору.

Яўген ХВАЛЕЙ.

КНІГІ—СЯБРЫ І ДАРАДЦЫ

Бібліятэкі Шчучынскага раёна на працягу многіх гадоў праводзяць вялікую работу ў цесным кантакце з працаўнікамі палеткаў. Толькі сельскімі бібліятэкамі раёна абслугоўваецца 41 463 чытачы, якім выдадзена 35 243 кнігі сельскагаспадарчай тэматыкі. У сярэднім кожная сельская бібліятэка выдала чытачам 456 сельскагаспадарчых кніг.

Прапаганда гэтай літаратуры ўвязваецца з задачамі калгасаў, саўгасаў, з укараненнем перадавой тэхнікі, вопыту. Раённая ж бібліятэка імкнецца аказваць дапамогу сельскім і клубным бібліятэкам у прапагандзе сельскагаспадарчых ведаў сярод працаўнікоў сяла. Так на семінарах былі дадзены канкрэтныя рэкамендацыі па правядзенню адкрытых праглядаў сельскагаспадарчай кнігі, тэматычных вечароў, канферэнцый чытачоў, гутарак.

У цесным кантакце з праўленнямі калгасаў, саўгасаў, партыйнымі арганізацыямі, спецыялістамі сельскай гаспадаркі працуюць Васілішкаўская, Баяра-Жалудоўская, Крупаўская і іншыя сельскія бібліятэкі. У іх складзены адзіныя планы мерапрыемстваў на перыяд уборкі, у якіх прадугледжана чытанне твораў на палявых станах, агляды кніжных навінак, гутаркі, дастаўка перыядычных выданняў, удзел у рабоце агітбрыгад пры сельскіх клубах.

У саўгасе «Шчучынскі» і ў калгасе імя У. І. Леніна бібліятэкі сумесна з кіраўнікамі гаспадарак і сельскімі клубамі ўжо правялі тэматычныя вечары «Механізатар—гаспадар ураджаю». На жывёлагадоўчых фермах калгаса «Шлях да камунізма» загадчыца Крупскай сельскай бібліятэкай Я. Малышка сумесна з актывам арганізавала кніжныя выстаўкі «Насустрач ураджаю».

Н. АНІСЬКА,
загадчыца Шчучынскай раённай бібліятэкі.

нава праходзяць вечары-сустрэчы пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, тэматычныя вечары: «Даражыць працоўнай славай перадавых механізатараў», «Чаму трэці год пяцігодкі з'яўляецца рашаючым». «Клопаты аб павышэнні ўрадлівасці глебы — абавязак хлебароба» і інш. Самадзейныя артысты дома культуры наладзілі сёлета 21 канцэрт.

Іван КАПОЦЯ,

дырэктар Гомельскага абласнога краязнаўчага музея:

—Па-ранейшаму залы нашага музея не пустуюць. Летам шмат экскурсій школьнікаў-следапытаў, турыстаў і проста людзей, якія цікавяцца гісторыяй роднага краю. На жаль, не кожны можа пазнаёміцца з экспазіцыяй абласнога музея, з яго скарбамі. Я маю тут на ўвазе жыхароў далёкіх вёсак. Праўда, час ад часу наладжваюцца экскурсіі, але прыехаць у Гомель усе не могуць.

За шэфскую работу на вёсцы калектыў музея ўзнагароджаны дыпломам Міністэрства культуры СССР і ЦК прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі.

Сёлета адбылося сем тэматычных вечароў пад дэвізам «Мой родны край». У сельскі дом культуры выязджае група работнікаў музея. Яны вязуць хранікальна - дакументальны фільм «Вызваленне Савецкай Беларусі». Адначасова ў клубе адкрываецца выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Паказваюцца на выстаўцы і каштоўныя экспанаты. Напрыклад, мы прывозім асабістыя рэчы земляко—воінаў і партызан, якія змагаліся ў гады вайны з гітлераўскімі акупантамі, розныя цікавыя дакументы, якія раскрываюць гераізм народа. Расказ навуковага супрацоўніка музея і дэманстрацыя экспанатаў пакідае ў слухачоў незабыўнае ўражанне.

Нагадаю прыклад. У вёсцы Залессе Чачэрскага раёна правялі тэматычны вечар па гісторыі краю, расказалі пра наш музей. Быў паказаны дакументальны фільм. А пасля жыхары вёсні прынеслі нам больш за сто экспанатаў. Сярод іх былі і ўнікальныя: пасведчанне чырвонагвардзейца, сабрана цікавая калекцыя старадаўніх бязменаў і інш.

Нядаўна адбыўся вялікі мітынг у вёсцы Пясочнае Буда-Кашалёўскага раёна, дзе пахаваны гераічны экіпаж самалёта-бамбардзіроўшчыка, на якім змагаліся камандзір падпалкоўнік Крыўцоў, штурман маёр Сомаў і стралок-радыст Паўлаў. Супрацоўнікі музея адшукалі родзічаў экіпажа, які загінуў. вызваляючы беларускую зямлю. Прыехалі бацькі, жонкі, дзеці, браты і сёстры. Усіх больш за 30 чалавек. На магілу герояў усклалі кветкі. Родзічы падзяліліся ўспамінамі. Хвалююча прайшла гэтая сустрэча.

Да 30-годдзя вызвалення Гомельшчыны, якое будзем неўзабаве адзначаць, рыхтуем перасоўную фота-дакументальную выстаўку. Зроблена некалькі яе копій. Адну з іх, напрыклад, пакажам у палескіх раёнах вобласці — Ельскім, Нараўлянскім, Брагінскім.

Рыхтуем таксама выстаўку работ мастакоў-графікаў, у тым ліку і гамяльчан. Графічныя лісты на сучасную тэму будзем паказваць у калгасах і саўгасах вобласці.

ПАД СОНЦАМ ЛІПЕНЯ

Філармонія — тэрмін, які расшыфраваць можна так: любоў да гармоніі. Слоўнікі адзначаюць, што дзейнасць гэтай канцэртнай арганізацыі засяроджана пераважна ў стацыянарных залах. Але стала традыцыяй філарманічных калектываў выступаць на клубных сцэнах у раёнах і калгасах, на палявых станах.

Карэспандэнт «ЛІМа» гутарыў па тэлефоне з рэжысёрам гэтай канцэртнай арганізацыі Іосіфам Цвярскім. Ён паведаміў:

— Сёлета канцэртныя брыгады філармоніі абслугоўваюць глыбінныя калгасы і саўгасы вобласці, выступаюць там, дзе раней яны нават ніколі не бывалі.

Днямі вярнулася з працяглай гастрольнай паездкі па вобласці эстрадная брыгада з праграмай «Ад усяго сэрца». Артысты выступалі ў гаспадарках Жлобінскага, Буда-Кашалёўскага, Кармянскага, Чачэрскага, Рагачоўскага і іншых раёнаў Гомельшчыны. Адбылося 170 канцэртаў.

У калгасы і саўгасы вобласці выехаў другі эстрадны калектыў — яго праграма мае назву «Песня не развітваецца з табою» і складаецца з сучасных і народных песень, і танцаў, і мастацкага чытання. Маршрут пачынаецца ў Жлобінскім і Рагачоўскім раёнах.

З вялікай гастрольнай паездкі па гарадах і сёлах Расійскай Федэрацыі вярнуліся эстрадныя калектывы «Музыкі» і «Сябры». Выступалі яны ў Маскве, Ленінградзе, Омску, Куйбышаве, Саратаве і іншых гарадах. Былі канцэрты на прадпрыемствах і на будоўлях, выступалі артысты і перад працаўнікамі вёскі. Сустрэчы былі прыязныя, добразычлівыя. Пасля кароткага адпачынку і гэтыя калектывы выправяцца да сельскага гледача.

Хачу звярнуць увагу, як мне здаецца, яшчэ на адну прыемную навіну. Наш лекцыйны аддзел, калектывы якога звычайна выступалі толькі на базе, цяпер выехалі на вёску. Сёння ў Жыткавіцкім раёне брыгада на чале з лектарам-музыказнаўцам Яўгеніяй Іконнікавай знаёміць сельскіх слухачоў з тэматычнымі праграмамі — «Савецкая масавая песня» і «У імя жыцця на зямлі».

Большасць праграм складзена з песень. Гэтага вымагае час. Хлебаробы працуюць зараз з ранку і да позняга вечара, і песня — найлепшы сябар у час кароткага адпачынку, яна нясе зарад бадзёрасці і добрага настрою людзям...

КАЛІ МАСТАК УСХВАЛЯВАНЫ

Калектыў Херсонскага музычна - драматычнага тэатра, што гастралюе ў Мінску, іграючы п'есу Міколы Заруднага «Дарогі, якія мы выбіраем», выступае ўсхваляваным мастаком, бо гаворка ідзе пра жыццё сённяшняе, пра нашага сучасніка. Грамадскасць помніць, што два гады назад у паядынку з агнём загінуў старшыня калгаса імя XXII з'езда КПСС Анатоль Аснавікоў, самаадданы будаўнік і арганізатар сельскагаспадарчай вытворчасці, чулы і мудры гаспадар, чалавечны важак людзей. І было гэта там, у херсонскім стэпу. Драматург і тэатр прытрымліваюцца рэальных фактаў сапраўднага жыцця, і яны ж выступаюць па-мастацку сталымі і паэтычна настроенымі даследчыкамі рэчаіснасці.

Вобраз народнага героя нашых дзён (яго прататыпам быў А. Аснавікоў) стварае заслужаны артыст УССР М. Мікуцкі. Мінчане мелі магчымасць пазнаёміцца з акцёрам, здольным раскрыць багаты ўнутраны свет загартаванага камуніста — жывога і вельмі непасрэднага, удумлівага і гарачага ў праявах пачуццяў. Такі Хведар Нявінчаны на сцэне.

Цікава, што спектакль гасцей у нечым сугучны камедыі А. Макаёнка «Таблетку пад язык». Тут таксама востра пастаўлена пытанне аб выбары моладдзю свайго месца ў жыцці. І мастацкае ўвасабленне тэмы знайшло ў М. Заруднага і артыстаў з Херсона зусім адметнае гучанне. Артысты, якія выконваюць ролі калгаснага каваля Буркі, трактарыста Дзяніса і Міраславы — І. Басюк, В. Глушчанка, Э. Верашчагіна, паказваюць і маладую ўпэўненасць у заўтрашнім дні, і духоўную дапытлівасць гэтых людзей, пазбягаючы аднаназначнасці ў характарыстыках персанажаў. Мабыць, асабліва пераканальна гучыць, умоўна кажучы, «маладзёжны матыў» у спектаклі і таму, што рэжысура нібы з багатай палітры брала акцёрскія фарбы для стварэння маляўнічага групавога партрэта сучасніка. Тут варта ўказаць на ўзаемаразуменне паміж выканаўцамі — у шматгалоссі выразна чуюцца галасы парторга Платона (Д. Караленка) і простай калгасніцы Галіны Сафронаўны (Н. Кузьменкава).

Спектакль выкрывае і кар'ерыстаў. Такі брыгадзір трактарыстаў Рэмез —слава яму даражэй за сапраўдныя заслугі перад землякамі і грамадствам. Акцёр А. Заяц і іграе чалавека, для якога фінішнай мэтай уяўляецца «п'едэстал», што ўзнімаецца над аднасяльчанамі. Праўда, артыст больш пераканаўчым выглядае там, дзе яго герой выступае рэзанёрам, а сцэны лірычнага характару (з жонкай Міраславай, напрыклад) гучаць у яго сухавата, без унутранага напаўнення. Але агіду да Рэмеза глядач адчувае і здагадваецца, што фігура гэта даволі складаная.

Мне асабіста давялося сустрэцца з калектывам Херсонскага тэатра не ўпершыню. Мяркуючы па спектаклях у Мінску, трупа ўзбагачае традыцыі ўкраінскай сцэны — і ў манеры раскрыцця драматургічных твораў, і ў пашырэнні рэпертуарных далягляданў. Малады рэжысёр А. Гарбенка, які ўзначальвае мастацкае кіраўніцтва тэатра, імкнецца так арганізаваць творчае жыццё, каб сузор'е вопытных артыстаў разам з маладым пакаленнем шчодра раскрывала талент. Прагледжаныя мной спектаклі «Грэх і пакаянне» І. Карпенкі-Карага і «Вей, ветрык!» Я. Райніса пераконваюць, што трупа тонка адчувае жанр камедыйны, меладраматычны, умее іграць рамантыку. А музычны спектакль «Недзе на поўдні» Э. Кемені захапіў залу меладыйным хараством, лірызмам пачуццяў і агністым тэмпераментам украінскіх артыстаў.

Шкада, што дырэкцыя тэатра адклала на позні тэрмін паказ драмы М. Стэльмаха «Дума пра любоў». Паэтычны, жыццесцвярджальны, гэты спектакль херсонцаў, на маю думку, узрушыць чулага да высокай мастацкай праўды мінскага гледача. Сустрэча з ім— наперадзе.

Пятро ГАРЭЦКІ.

Народная артыстка СССР Л. Александроўская сярод артыстаў Херсонскага дзяржаўнага ўкраінскага музычна-драматычнага тэатра.

Фота Ул. КРУКА.

ДЗЕНЬ ПЕРШЫ — ДЗЕНЬ ДЗЕВЯТЫ

ДЗЕВЯЦЬ дзён назад грамадскасць Мінска цёпла сустрэла калектыў Маскоўскага драматычнага тэатра імя К. Станіслаўскага. Для заўзятых тэатралаў гэта было другое знаёмства з трупай праз дзесяць гадоў пасля яе папярэдніх гастролей у нашым горадзе. Уражанні застаюцца ад кожнага спектакля яркія. Большасць назваў п'ес гучаць для нас як назвы навінак драматычнай літаратуры.

З мазаікі ўражанняў выбіраю тры.

—Нечаканы ён, — сказала мая суседка па партэры студэнтка БДУ В. Палякова на спектаклі «Альберт Эйнштэйн» па п'есе М. Пагодзіна. — Мне здавалася, што вялікі вучоны быў чалавекам сухім, адасобленым ад людзей і іх клопатаў. А тут ён— мужны і адкрыты, схільны да лірыкі і, адначасова, барацьбіт. Артыст І. Казлоў такім яго і іграе. Колькі ў яго тонкіх нюансаў і пераходаў ад аднаго стану душы да новых і новых. Ён на дзіва шчыры, гэты Альберт Эйнштэйн на сцэне! Вы чулі, як прагучала яго здзіўленне ў адказ на пытанне, якім чынам ён стаў геніем: «Асабіста мне гэта незразумела...» — сказаў ён, і яму верыш. А потым ён дадаў: «Проста трэба вельмі многа думаць...» І гэтая рыса, рыса вучонага-мысліцеля, стала галоўнай у сцэнічным партрэце вучонага...

З такім водгукам цалкам згаджаешся. Сапраўды, спектакль рэжысёра І. Бабылёва захапляе вобразам «Моцарта навукі», героя змястоўнай драмы М. Пагодзіна, яго інтэлектуальным і духоўным багаццем. Трывожны роздум аб тым, што навуковае адкрыццё можа быць пастаўлена на службу смерці, перакідваецца праз рампу вельмі тэмпераментна. І запаветная мара генія, які адкрыў тэорыю імавернасці, аб тым, каб навука служыла толькі жыццю і аднаму жыццю, набывае на тэатральных падмостках выразнае гучанне.

—Раней мы бачылі на сцэне розных прадстаўнікоў буржуазнага свету, —дадаў сваю думку да ўражанняў студэнткі В. Паляковай электрык аўтазавода М. Буяк.—Тут паказан лабірынт навукі ў заходняй капіталістычнай сістэме. Сутыкаюцца прагрэс і шалёныя сілы агрэсіі. Мо адсюль і такое напружанне ў драме. Ад сцэны не адарвацца. Акцёры сапраўдныя. Мне падабаліся асабліва А. Балтэр і Э. Вітарган: засяроджаныя, імпульсіўныя, удумлівыя...

І зусім іншы сцэнічны клімат — «Мсье дэ Пурсаньяк». Тэатр на падставе славутай камедыі Мальера стварыў мюзікл. Аўтарам выступае знаёмы мінчанам па рабоце з нашым Рэспубліканскім тэатрам юнага гледача Лесь Танюк. Імклівыя музычныя рытмы, маляўнічыя мізансцэны, завостраныя персанажы. Спектакль выкрывае ханжаскую мараль цемрашалаў і прыстасаванцаў. І робіцца гэта з бязлітасным сатырычным напалам.

Мальер—не архіўная старонка драматургічнага мастацтва, ён сваім смехам знішчае фальш і антынародную сутнасць грамадства, якое жыве па законах мяшчанства ў любым яго абліччы.

Зразумела, у спектаклі многа музыкі, і яна таксама мае своеасаблівы іранічны «падтэкст». Кампазітар Владлен Махлянкін стылізуе старыя матывы сучаснымі інтанацыямі, і «голас» спектакля ўспрымаецца як фанаграма камедыйных здарэнняў і характарыстык дзейных асоб. Пры гэтым фанаграма, якая мае значэнне раўнапраўнага мастацкага кампанента пастаноўкі.

Сярод выканаўцаў ролей трэба вылучыць Леаніда Сатаноўскага, які іграе «самога» мсье дэ Пурсаньяка. Вынаходлівы ў любых сцэнічных сітуацыях, ён і моўную партытуру распрацаваў вельмі выразна. Вучыўся артыст у Дзяржаўным тэатральным вучылішчы імя Б. Шчукіна пры вахтангаўскім тэатры. Магчыма, адтуль і ідзе такое арганічнае адчуванне Л. Сатаноўскім суладдзя паміж унутраным жыццём героя і пластыкай паводзін на сцэне. Пры ўсёй камедыйнасці, нават экстравагантнасці гэтага правінцыяльнага карысталюбца мсье дэ Пурсаньяк выглядае жывым характарам, апанаваным усепаглынаючай страсцю. І гэта зусім па-мальераўску, бо драматург заўсёды тыпізаваў пэўныя натуры (Тарцюф, напрыклад). Ка-



мсье дэ Пурсаньяк

МАШТАБНАСЦЬ РЭЖЫСЁРСКАГА БАЧАННЯ

«ПАЦАЛУНАК ЧАНІТЫ» Ю. МІЛЮЦІНА Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ ТЭАТРЫ МУЗЫЧНАЙ КАМЕДЫІ БССР

ГЭТАЯ аперэта даўно замацавалася ў рэпертуары многіх музычных тэатраў краіны. Тэма барацьбы прагрэсіўнай моладзі свету за мір і дружбу, што знайшла спецыфічнае для жанра раскрыццё ў гэтым творы, блізкая нашым гледачам. А маляўнічая, эмацыянальная і мілагучная музыка заўсёды знаходзіць гарачых прыхільнікаў сярод аматараў і знаўцаў мастацтва музычнай камедыі. Праўда, пэўныя прэтэнзіі выклікае п'еса драматурга Я. Шатуноўскага — замаруджанасцю падзей, штучнасцю асобных сітуацый. І таму асабліва цікава было пазнаёміцца з пастаноўкай на беларускай сцэне ўсім добра вядомай і не беззаганнай, а таму і цяжкай для нестандартнага ўвасаблення аперэты. Цікава тым больш, што пастаноўку «Пацалунка Чаніты» ажыццявіў галоўны рэжысёр тэатра Э. Корсакаў, які толькі нядаўна пачаў працаваць у Мінску і смела пайшоў на эксперымент.

Што ж, Э. Корсакава, як пераможцу, няма падстаў «судзіць». Гледачы на прэм'еры і на чарговых прадстаўленнях адчуваюць маштабны размах спектакля. Рэжысёр знайшоў правільныя суадносіны магчымасцей — сваіх і трупы.

Чым звяртае на сябе ўвагу ў гэтай трактоўцы аперэта «Пацалунак Чаніты»?

Па-першае, пастаноўшчык у лепшым сэнсе гэтага слова «бачыць» музыку як першакрыніцу і аснову дзейсных і пластычна яркіх сцэнічных сітуацый, умее будаваць і зусім камерныя, і ансамблевыя мізансцэны, абапіраючыся на кампазітарскую партытуру і мастацкую задуму аўтара твора. Адсюль і свабодная планіроўка, яснасць выкарыстання Э. Корсакавым сцэнічнай пляцоўкі, натуральнае размеркаванне на ёй дзеючых асоб. Упэўненая рука рэжысёра і яго прадуманыя «задачы», пастаўленыя перад артыстамі, памаглі дзейным асобам выразна пранесці лінію паводзін герояў. Выканаўцы ролей не губляюць адчування агульнага ансамблю, які здаецца маналітным. Але маналітны ён так, што імправізацыйнасць манеры ігры таксама вытрымліваецца, а гэта вельмі дарагая для аперэты якасць.

Правільна зрабіў рэжысёр, калі надаў спектаклю характар яркага сцэнічнага відовішча. Менавіта так вырашаны пастаноўшчыкам масавыя сцэны — фестывальная, вясельная, у кабарэ і г. д. Тактоўна спалучаюцца рэжысёрам драматычная дзея з танцавальнымі эпізодамі, з вакальнымі нумарамі. Шкада, што Э. Корсакава аднойчы падвёў мастацкі густ: у трэцяй дзеі, там, дзе спектакль выкрывае «актывістак лігі маральнасці». («Выкрыццё» разумеецца і паказваецца на сцэне праз... «распрананне» гераінь!) Затое вельмі мякка, я сказаў бы пяшчотна, гучаць лірычныя сцэны Чаніты і Пабла. А як вынаходліва ў эпізодзе арышту студэнтаў знойдзены па сцэнічнаму выразна кантрапункт дуэта Чэзарэ і Чаніты з падзеямі, што адбываюцца на вуліцы, за шыбамі кабарэ: там юных барацьбітоў за мір жандары вядуць у турму...

Творчымі аднадумцамі пастаноўшчыка выступілі ў спектаклі дырыжор М. Фоцін і мастак А. Марозаў. Яны зрабілі ўсё, каб панавала атмасфера весялосці, больш таго, фестывальнай святочнасці ў драматызме калізій штодзённага жыцця. Аркестр выконвае сваю партыю зладжана і маляўніча. Ён увесь час злітны са сцэнай, не абмяжоўваецца роляй акампаніятара. Дырыжор разумее індывідуальнасць кожнага артыста і дасягае адзінства ўсіх, хто дзейнічае на падмостках. Такое адзінства з дакладнымі светаценямі ёсць і ў ансамблях салістаў з хорам (хормайстар Н. Андросава). Аркестр чулы да складаных рытмаў і напружаных тэмпаў танцавальных эпізодаў, якія сапраўды ўдала пастаўлены Н. Пасівавай і эфектна выконваюцца іх удзельнікамі (педагог па балету Г. Чарнаярава). Мастак А. Марозаў знайшоў простае, але выразнае і эфектнае вырашэнне інтэр'ера бара Чэзарэ, плошчаў ля капліцы і перад барам, стварыў уражлівы паўднёвы пейзаж. Сцэнічная пляцоўка не загрувашчана шматлікімі дэкарацыйнымі дэталямі, што дае магчымасць свабодна будаваць масавыя сцэны і стварае атмасферу вялікай прасторы месца падзей.

Мабыць маюць рацыю тыя, хто лічыць, што сапраўдны рэжысёр выдатна кампануе спектакль і адначасова ўмее «трымацца ў ценю», каб акцёрскае ўвасабленне сцэнічных вобразаў успрымалася зусім натуральна, без прымусу. Пастаноўшчык «Пацалунка Чаніты» на беларускай сцэне — такі рэжысёр. Таму так многа тут творчых удач сярод выканаўцаў цэнтральных партый-ролей і эпізадычных персанажаў. Таму некаторыя з артыстаў яркa паказалі сябе ў нечакана новым «святле».

Калі ад Н. Гайды мінчане заўсёды чакаюць новых і новых праяў значнага акцёрскага таленту, і Анджэла-спявачка ў яе выкананні — яшчэ адно пацверджанне высокай рэпутацыі салісткі, то В. Мазур у ролі Чаніты — гэта буйны крок наперад маладой і вельмі перспектыўнай артысткі. У новым спектаклі ярка і ўпэўнена праявіліся яе абаяльнасць, прыгожы голас, сцэнічная непасрэднасць, уменне іграць у кантакце з партнёрамі. Уражвае таксама А. Крайнікава — Аніта. Гэтая выканаўца мае амаль «выбуховы» тэмперамент, пачуццё гумару, удала карыстаецца невялікім голасам і пластыкай цела.

Вострахарактарныя, але розныя па малюнку і запамінальныя вобразы манашак Разаліі, Эмы, Лакталяфтыны і Клеапатрыкас стварылі Т. Брагіна, Л. Мацкевіч, В. Курлыкова і Л. Макарчанкава: яны складаюць зладжаны артыстычны і вакальны ансамбль.

З выканаўцаў мужчынскіх партый най-

лі дадаць яшчэ, што трымаецца артыст у «прапанаваных абставінах» з імправізацыйнай мабільнасцю, будзе ясна: вобраз дэ Пурсаньяка—значная акцёрская работа.

— Я помню цеплыню і добразычлівасць мінчан па мінулых гастролях,— сказаў мне Л. Сатаноўскі пасля спектакля. — Цяпер наша трупа выглядае па-новаму. Ды і рэпертуар мы прывезлі арыгінальны. А сустрэча з беларускім гледачом—як сустрэча са старым другам.

Мне давялося здымацца ў карціне «Каханая» на студыі «Беларусьфільм». Тады я пасябраваў з Ігарам Дабралюбавым. Захапляўся высокім мастацтвам Барыса Платонава і яго калег па купалаўскаму тэатру. Нядаўна прачытаў п'есу Васіля Быкава «Рашэнне», і зноў адчуў, што нешта дарагое для мяне, як артыста, звязана з Беларуссю, з яе гераічнай гісторыяй, з яе людзьмі...

Калі крочыш па вуліцах вашай сталіцы, не можаш не думаць пра веліч і пра духоўнае хараство сучасніка. Кранае задуменная фігура чалавека ля Вечнага агню. Прымушае настройвацца на паэтычны лад помнік Янку Купалу...

З мазаікі такіх уражанняў складаецца нейкі вельмі патрэбны нам, людзям тэатра, настрой... Як і дзесяць гадоў назад, мы паедзем з Мінска, захоўваючы ў эмацыянальнай памяці гэтыя ўражанні і гэты настрой. Відаць, некалі на рэпетыцыі ў кагосьці з нас, артыстаў, з'явіцца якая-небудзь рысачка або фарба, якой мы будзем абавязаны Мінску... Такое бывае ў нашай прафесіі.

Тым больш, што атмасфера сустрэч з гледачом тут надзвычай сардэчная. У гэтым мы пераканаліся ўжо ў дзень першы, калі іграли даволі складаную па праблематыцы п'есу А. Вампілава «Развітанне ў чэрвені». Так, там мне давялося выступаць у псіхалагічнай манеры, кантрастнай «Мсье дэ Пурсаньяку». Але ж і тэта спецыфіка прафесіі—пераўвасабляцца, паглыбляцца кожны вечар у новую стыхію мастацкага відовішча, стыхію гэтага драматурга, гэтага рэжысёра.

Шчыра кажучы, нам усім дарагая рэанцыя залы і ў Доме афіцэраў, і ў оперным. Нас разумеюць, адчуваюць жаданую плынь і тую сцэнічную ўмоўнасць, што была прадыктавана п'есай. Добры глядач у Мінску!..

...ГАСТРОЛІ масквічоў набіраюць тэмп. Рэпертуарныя навінкі выклікаюць цікавасць мінскай публікі. Гледачы пазнаюць ранейшых знаёмых (сярод іх і Л. Сатаноўскага), радуюцца новым імёнам артыстаў. Пра гэтую атмасферу ўзаемнай дружбы і сведчаць водгукі, што я тут прывяла. Тры—з тысяч. Тры з дзевяці дзён гастролей.

Л. КОЗІНА.

большы поспех здабывае К. Лосеў. Яго Чэзарэ—не стандартны аперэтачны злодзей, а вобраз псіхалагічна больш складаны. Спрыяюць такому ўвасабленню багатыя акцёрскія дадзеныя выканаўцы і правільнае разуменне ім пастаўленай рэжысёрам мэты. На жаль, менш арыгінальным выглядае Пабла ў В. Бажэнава, і справа тут не ў традыцыйным амплуа «героя», на сто працэнтаў дадатнага персанажа; пакуль што акцёр карыстаецца аднастайнымі фарбамі, яму нестае «палымянасці» пачуццяў. А гэтага так чакаеш ад юнака, які перажывае трагедыю абражанага кахання!.. Два студэнты — Рамон і Д'ега ў выкананні В. Сердзюкова і Я. Яўна выйграюць у параўнанні з Пабла-Бажэнавым, дзякуючы трапна знойдзеным характэрным рысам гэтых персанажаў. Радасна гаварыць пра мастацкае пачуццё меры і глыбіню ўвасаблення вобраза Вундэрвунда артыстам А. Прыходзькам. Ён здолеў паказаць і ступень падзення свайго героя, і эвалюцыю асэнсавання ім гэтага. У манеры добрага мастацкага шаржа малюе Ю. Лазоўскі сышчыка Кавалькадаса...

Галоўнае ўражанне ад спектакля такое —у калектыў тэатра музычнай камедыі прыйшоў цікавы мастак. Маштабнасць рэжысёрскага бачання, якая так ярка выявілася ў пастаноўцы славутай аперэты Ю. Мілюціна «Пацалунак Чаніты» і тэатральная культура Э. Корсакава абяцаюць багаты плён у далейшых творчых шуканнях трупы ў жанры музычнай камедыі.

І. ІНІЧ.

ТАБЕ, ПЯЦІГОДКА!

Новалукомльская ДРЭС—1973







НОВАЛУКОМЛЬСКАЯ ДРЭС — буйнейшая ў рэспубліцы. Яе будаўніцтва пачалося параўнаўча нядаўна —у канцы 1966 года. Яна абсталявана самай сучаснай тэхнікай. Яе энергія ідзе ў розныя кутні краіны.

А ў двух кіламетрах ад ДРЭС, на беразе чароўнага возера, без канца і краю, раскінуўся пасёлак Новалукомль—шматпавярховыя дамы, хлебазавод, камбінат бытавога абслугоўвання, бальніца, кінатэатр, гандлёвы цэнтр, сярэдняя школа, прафесійна-тэхнічнае вучылішча з інтэрнатам, гасцініца, рэстаран.

Тут жывуць рабочыя—будаўнікі і энергетыкі, інжынеры, настаўнікі, урачы—звычайныя людзі, якія робяць «звычайныя цуды».

Будаўніцтва Новалукомльскай ДРЭС працягваецца.

Мастак У. Сакалоў пабываў там, захапіўся працай людзей і зрабіў для нас гэтыя малюнкі.

МАЛЮЮЦЬ НАСТАЎНІКІ

Звыш за 60 работ жывапісу, графікі, разьбы па дрэву прадстаўлена на выстаўцы, якая адкрыта ў Гомельскім абласным доме настаўніка. Іх аўтары — выкладчыкі школ горада і вобласці.

На адпаведным прафесійным узроўні, пранікнёна і з добрым настроем напісаны пейзажы настаўніка Хойніцкай сярэдняй школы Н. Асуаляка: «Вецер», «Прыцемкі», «Заходы над Прыпяццю».

Своеасаблівыя, са сваім почыркам акварэлі В. Волкава. Асабліва прываблiваюць «Стары Віцебск» і «Нацюрморт». Прыемна ўражваюць малюнкі, выкананыя алоўкам, настаўніка з Турава «Настаўніца», «Вёска Запясочная» і іншыя.

Увагу наведвальнікаў прыцягваюць работы М. Рудзішкіна, які зрабіў 20 ілюстрацый да рамана І. Шамякіна «Глыбокая плынь».

Добрую справу зрабілі работнікі абласнога дома настаўніка. Выстаўка працягнецца да новага навучальнага года.

М. ГАТОЎКІН.

АПЛАДЗІРУЕ МІНШЧЫНА

На «Свята працы і песні», якое днямі адбылося ў калгасе «Савецкая Беларусь» Клецкага раёна Мінскай вобласці сабраліся сотні людзей. Калгасны дом культуры, які разлічаны на 700 месц, не змясціў усіх, хто прыйшоў павіншаваць сваіх аднавяскоўцаў. Лепшым калгаснікам, тым, хто вызначыўся сваёй працай на веснавых работах, уручаліся грашовыя прэміі, кнігі, памятныя падарункі.

На свята да хлебаробаў прыехалі артысты Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Яны сардэчна дзякавалі калгаснікам за працу, шчыра жадалі ім поспехаў у высакароднай справе. А ў заключэнне паказалі спектакль па п'есе А. Карнейчука «Памяць сэрца».

У спектаклі выступілі народная артыстка БССР С. Станюта, заслужаныя артысты БССР Т. Аляксеева, Г. Гарбук, М. Федароўскі і іншыя.

Гэта быў дзесяты па ліку спектакль, з якім купалаўцы выступілі ў калгасах раёна. Яны пабывалі ў калгасе «Сцяг Саветаў» і іншых гаспадарках.

У Старадарожскім і Любаньскім раёнах госціць купалаўская «Паўлінка». Народнага артыста СССР З. Стому, народных артыстак БССР Р. Кашэльнікаву, Г. Макараву, заслужанага артыста БССР П. Кармуніна і ўсіх выканаўцаў гледачы сустракаюць бурнымі апладысментамі, вызываюць на біс. Ім апладзіравалі хлебаробы калгасаў «Герой працы», «Барацьбіт», «Залужжа», імя Суворава, саўгаса «Любанскі» і інш.

12 спектакляў, якія далі артысты калгаснікам у гэтым месяцы, прайшлі з поўным аншлагам.

Цікавая сустрэча адбылася ў Старых Дарогах. Дарагіх гасцей віталі іх калегі з самадзейнага тэатра. Любімым артыстам горача дзякавалі за парады, паднеслі кветкі.

Там, дзе клуб не мог змясціць гледачоў, майстравалі імправізаваную сцэну. У калгасе «Расвет» Любаньскага раёна, напрыклад, сцэну замянілі два грузавікі. Тут жа, ля клуба, нацягнулі тросы, прымайстравалі заслону. Грымёрнай паслужыў уласны аўтобус. І праслаўленую «Паўлінку» змаглі паглядзець усе жадаючыя.

Лагойскі і Дзяржынскі раёны Міншчыны абслугоўвае брыгада артыстаў, якія іграюць «Трыбунал» А. Макаёнка. Ужо адбыліся сустрэчы ў калгасах імя Кірава і імя Дзяржынскага, «8 Сакавіка» і імя Марата Казея. Галоўныя ролі ў спектаклі выконваюць заслужаныя артысты БССР Г. Аўсянікаў і П. Дубашынскі, В. Белахвосцік.

Больш за 30 спектакляў далі на калгасных сцэнах артысты Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы толькі за 12 дзён ліпеня. Іх майстэрству апладзіравалі тысячы хлебаробаў.

ПАРА СТАЛАСЦІ

Майстэрня жывапісца Віктара Вярсоцкага — на дзесятым паверсе. Унізе — Мінск.

Старажытны і малады. Велічны, прыгожы. Прыгожы заўсёды раніцай і вечарам, летам і зімой.

Мінск — гэта настрой мастака. Ён адчуваецца ў яго гарадскіх пейзажах. У іх шмат паветра, свету, яны цэльныя па колеру, экспрэсіўныя па выкананню. Мастак захапляецца наваколлем Мінска. Пейзажы В. Вярсоцкага ў большасці сваёй мажорныя, але ёсць сярод іх «задуменныя», «ціхія» па настрою палотны. Ён шукае і знаходзіць унутраныя заканамернасці і рытмы ў кампазіцыі пейзажа, імкнецца перадаць паэтычна і ўсхвалявана вобраз прыроды. Для кожнай карціны знаходзіць свой вобразны лад, таму стан прыроды не паўтараецца, і кожны новы матыў, тэма маюць свою форму паэтычнага выказвання. Пад пэндзлем мастака на палатне адбываецца цуд: прыміраюцца халодныя і цёплыя фарбы, нечакана гучаць глухія, супакойваюцца яркія.

Віктару Вярсоцкаму ў гэтым годзе спаўняецца 50. Прыйшла пара сталасці.

За плячыма — паездкі па краіне і за яе межамі. А гэта значыць, мноства ўражанняў, якія потым «выльюцца» на паперу.

Чытачу, які ведае Віктара Вярсоцкага-мастака будзе, відаць, цікава даведацца пра яго біяграфію, бо біяграфія — гэта тая дарога, на якой фарміруецца светапогляд, жыццёвая і эстэтычная пазіцыя чалавека. Нарадзіўся Віктар Вярсоцкі ў 1923 годзе ў Мінску. Потым ён жыў у Гомелі. Талент хлапчука прыкмеціў настаўнік малявання і ў многім вызначыў далейшы лёс свайго вучня. Ён навучыў яго бачыць прыроду, распазнаваць сапраўдныя творы мастацтва.

А потым была вайна... В. Вярсоцкі ўступіў у народнае апалчэнне і ўдзельнічаў у абароне Гомеля ад фашыстаў. Ён камандаваў узводам, мінамётнай ротай, асобным пяхотным батальёнам, быў начальнікам штаба палка, намеснікам начальніка аператыўнага аддзела штаба дывізіі. Вызваляў Варшаву, дайшоў да Берліна. За мужнасць і адвагу ўзнагароджаны трынаццаццю ордэнамі і медалямі.

Калі Віктар Вярсоцкі дэмабілізаваўся, яму было ўжо 24 гады. Ён паступіў у Мінскае мастацкае вучылішча, у якім разам вучыўся з сёння шырока вядомымі мастакамі М. Савіцкім, В. Грамыкам, Ю. Пучынскім... Яго вучылі цудоўныя педагогі В. Волкаў, І. Ахрэмчык, Х. Ліўшыц, М. Воранаў. Пасля заканчэння вучылішча В. Вярсоцкі працуе выкладчыкам у школах Мінска. Ён стварае дзіцячую студыю. За заслугі ў выхаванні маладога пакалення В. Вярсоцкі атрымаў званне заслужанага настаўніка БССР. Ужо завочна скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут.

Мастак шмат ездзіў, асабліва яго вабілі ленінскія мясціны. У выніку нарадзілася серыя пейзажаў: «Вуліца Мары Роз» у Парыжы, дзе жыў і працаваў Уладзімір Ільіч, «Домік Маркса» ў Лондане. Тут друкавалася «Искра». «Джон стрыт увечары» —яшчэ адзін пейзаж, які мастак прывёз з Англіі. На гэтай вуліцы, у маленькім кафэ У. І. Ленін сустракаўся з рускімі рэвалюцыянерамі. Гэтыя і іншыя работы, напісаныя мастаком з асаблівым душэўным хваляваннем і ўздымам, карысталіся вялікім поспехам на выстаўцы, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

Шмат цікавых жывапісных работ прывёз Вярсоцкі з паездак па гарадах Францыі, Англіі, Італіі, Чэхаславакіі, Польшчы. Вось толькі некаторыя з іх: «Вячэрні Парыж», «Замак Мон Сан Мішэль», «Нотр-Дам». Асаблівую цікавасць прадстаўляе серыя пейзажаў — шэкспіраўскія мясціны ў Англіі. Мастак пабываў на радзіме Шэкспіра ў горадзе Стрэтфардзе на Авоне. Мы бачым дом, у якім нарадзіўся вялікі драматург, школу, дзе ён вучыўся, вядомы тэатр «Глобус», дзе В. Шэкспір ставіў свае п'есы.

Сярод італьянскай серыі асабліва прыцягваюць увагу краявіды Венецыі, Рыма, Фларэнцыі, Перуджы, Арэцо Асізі.

У апошні час Віктар Іванавіч захапляецца манатыпіяй. Першыя адбіткі цынкавых пласцінак у тэхніцы афорта дазваляюць гаварыць аб нараджэнні цікавага графіка.

Мастак-камуніст поўны творчых планаў. Хай яны здзейсняцца.

У. ФЕДАРОВІЧ.

РЭХА МУЗЫЧНЫХ КЛАСАЎ

Музычным цэнтрам Мінска справядліва лічыцца плошча Свабоды. Тут знаходзіцца Саюз кампазітараў БССР, спецыяльная сярэдняя школа, мінскае музычнае вучылішча імя М. Глінкі. Непадалёк — магазін «Мелодыя» і гарадская нотна-музычная бібліятэка.

І кансерваторыя. Alma-mater піяністаў, дырыжораў, кампазітараў, музыказнаўцаў нашай рэспублікі. Імёны многіх выхаванцаў гэтай вышэйшай навучальнай установы вядомыя далёка за межамі Беларусі. З дыпломам Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. Лупачарскага заваявалі права выступаць на лепшых сцэнах краіны народныя артысткі РСФСР В. Барысенка і Л. Масленікава, заслужаныя артысткі РСФСР Н. Гусельнікава і Л. Адамантава, дырыжор Б. Афанасьеў. Таленту адмысловых цымбалістаў, народнаму артысту СССР І. Жыновічу, заслужанаму артысту БССР В. Бурковічу і М. Шмелькіну апладзіравалі слухачы многіх замежных краін. Сучасны рэпертуар музычных тэатраў, канцэртных эстрад немагчыма ўявіць сабе без твораў народнага артыста БССР А. Багатырова, заслужаных дзеячоў мастацтваў БССР Г. Вагнера, Я. Глебава, І. Лучанка, Ю. Семяякі. На міжнародных і ўсесаюзных конкурсах здабывалі першыя месцы і высокія ацэнкі В. Кучынскі, Н. Адзінцова, С. Гулевіч, М. Зданевіч...

Прыгадаць гэта варта не толькі ў сувязі з сёлетнім выпускам, а і са знамянальнай датай — кансерваторыі сорак гадоў.

Ліпень 1973 года ...Пяцьдзесят дзевяць піяністаў, дваццаць тры выхаванцы кафедры струнных інструментаў, дзевятнаццаць музыказнаўцаў, семнаццаць дырыжораў-харавікоў, сорак тры выпускнікі кафедры народных інструментаў і чатырнаццаць духавой, дзевяць вакалістаў і два оперна-сімфанічных дырыжоры — такі плён кансерваторыі ў саракавым выпуску. Лічбы гэтыя, не толькі статыстыка, але і велізарная, натхнёная і шматгадовая работа буйнага калектыву педагогаў, бяссонныя ночы і самаадданасць студэнтаў-выпускнікоў.

Карэспандэнт «ЛіМа» Л. Крупынская звярнулася да рэктара Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя Луначарскага, народнага артыста БССР Уладзіміра Алоўнікава.

— Пра месца, якое займае наша кансерваторыя ў творчым жыцці Беларусі, пра вялікі крок наперад, які яна зрабіла за гады існавання, — гаворыць ён, — красамоўна сведчыць наступны факт. На першым курсе першага набора кансерваторыі займалася менш чым паўсотні студэнтаў. Цяпер колькасць іх вызначаецца сотнямі. Мы рыхтуем музыкантаў вышэйшай кваліфікацыі па дзевяці профілях. У нас працуе шаснаццаць кафедр. Не менш красамоўная лічба — сто сорак сем педагогаў сённяшняй кансерваторыі.

У гэтым годзе мы выправілі на самастойную работу амаль дзвесце выпускнікоў. У асноўным рыхтуем кадры выкладчыкаў для музычных вучылішчаў. Першыя педагогі паедуць сёлета ў новыя спецыяльныя ўстановы гарадоў Ліды, Мазыра, Наваполацка. Напрыклад, музыказнаўца Людміла Макраусава і баяніст Ілья Бельнік выказалі жаданне працаваць у Лідзе. Цымбалістка Ларыса Дзергачова з класа Яўгена Гладкова кафедры народных інструментаў будзе настаўнічаць у Наваполацкім вучылішчы. Сярод выпускнікоў гэтага аддзялення мне хацелася б адзначыць баяністку Валянціну Шыманоўскую, якая са сваім мужам Віктарам папоўніць калектыў выкладчыкаў у Баранавіцкім музычным вучылішчы. Ёсць у нас і выпускнікі асістэнтуры-стажыроўкі. Уладзімір Кузьменка і Ларыса Дзядук будуць выкладаць у сярэдняй спецыяльнай музычнай школе, Наталля Жога — у Мінскім музычным вучылішчы, а Ганна Пячонкіна — дырыжор-харавік, паедзе ў Брэст.

Рэктар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі У. Алоўнікаў уручае дыплом Ленінскаму стыпендыяту Тамары Жук.

Сёлета нас парадавалі і музыканты-выканаўцы. Нашы выпускнікі будуць працаваць у канцэртных калектывах Беларускай дзяржаўнай філармоніі, у Дзяржаўным тэатры музычнай камедыі БССР, у хоры радыё і тэлебачання, у Дзяржаўным сімфанічным аркестры БССР, у Дзяржаўным аркестры народных інструментаў і іншых калектывах.

Ужо гастралюе па краіне спявак Іван Краснадубскі, які пасля заканчэння кансерваторыі быў прыняты ў Беларускую дзяржаўную філармонію. Святлана Серафімовіч таксама запрошана ў гэтую канцэртную ўстанову.

Хацелася б яшчэ сказаць аб вельмі прыемнай для нас падзеі. Сёлета нашу кансерваторыю закончылі два выхаванцы оперна-сімфанічнага аддзялення. Міхаіл Казінец зарэкамендаваў сябе як вельмі перспектыўны дырыжор аркестра народных інструментаў. Ён пабываў ужо на гастролях з Дзяржаўным аркестрам народных інструментаў БССР пад кіраўніцтвам Іосіфа Жыновіча ў Сібіры, Сярэдняй Азіі, Казахстане... Анатоль Лапуноў — дырыжор опернага напрамку. Мне прыемна адзначыць, што нядаўна ён паспяхова вытрымаў экзамены і паступіў у асістэнтуру-стажыроўку Ленінградскай кансерваторыі.

Наогул, кансерваторыя ўмацоўвае навуковыя, метадычныя і творчыя сувязі з кансерваторыямі Масквы, Кіева і іншых гарадоў краіны. Музыказнаўца Наталля Іўчанка на выдатна здала выпускныя экзамены. У гэтым годзе яна была адзначана дыпломам чацвёртага ўсесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і сучаснага маладзёжнага руху, які ад-

ЧАКАЮЦЬ ІХ КЛУБЫ...

Яшчэ ўчора яны былі студэнтамі. Сёння з дыпломам, які пацвярджае іх права на самастойную творчую працу, яны — спецыялісты. У той маштабнай культурна-масавай дзейнасці па камуністычнаму выхаванню працоўных, якая штодзённа вядзецца партыяй і дзяржавай, імі ўжо зроблены першыя крокі. І ад таго, як выявіцца грамадзянская сталасць і прафесійнае ўмельства кожнага, залежыць іх далейшы лёс.

Пакажы, што ты абраў служэнне мастацтву мэтай свайго жыцця не выпадкова, што ты ўзбагаціў сябе грунтоўнымі ведамі марксісцка-ленінскай навукі, што глыбока ўспрыняў урокі майстроў у класах і аўдыторыях, — тады перад табой адкрыюцца сэрцы людзей, для якіх ты — дзеяч мастацтва. Тады твайму рэжысёрскаму слову паверацъ, прымуць твой мастацкі вобраз, захопяцца мелодыяй, будуць уважлівымі на тваіх уроках... Высокая адказнасць! Пачэсны абавязак!

Грамадскасць зычыць поспехі выпускнікам навучальных устаноў 1973 года, віншуе іх з пачаткам сталасці на бясконцым шляху да адмысловага ўмельства ва ўсіх відах мастацтва!

Шмат хто з сёлетніх 390 выпускнікоў культурна-асветных устаноў рэспублікі мае ўжо невялікі працоўны стаж. Гэта юнакі і дзяўчаты з Гомельскага музычна-педагагічнага і Мінскага педагагічнага вучылішчаў, з Гродзенскага і Магілёўскага КАВ, якія прыйшлі ў сельскія клубы і дамы культуры ў пачатку года. Гэта Мікола Хітрык — кіраўнік агітбрыгады ў Гродзенскім гарадскім доме культуры і метадыст Навэльнянскага ГДК Хведар Нагар, Аня Дзмітрава і Нэля Галенка, якія працуюць у культурна-асветных установах Брэстчыны, Вольга Калейнік, пад кіраўніцтвам якой агітбрыгада Бераж-ноўскага СДК заняла трэцяе месца ў рэспубліцы. Пра кожнага з іх гавораць з павагай.

Тыя ж, хто прыйдзе працаваць у жніўні, таксама паспелі паказаць сваё ўменне і веды — якраз перад самымі экзаменамі была вытворчая практыка! Іх з нецярпеннем чакаюць, загадзя размеркаваўшы, куды каго пасланць. Не сакрэт, што ў сельскіх клубах працуюць падчас людзі без спецыяльнай адукацыі, і прыезд спецыяліста — цэлая падзея, асабліва, калі за яго плячамі — вну. Дваццаць тры дырыжоры-харавікі падрыхтаваў сёлета Мінскі педінстытут, і столькі ж рэжысёраў народных тэатраў — Беларускі дзяржаўны тэатральна мастацкі інстытут. Маладыя рэжысёры ведаюць калектывы, дзе ім давядзецца працаваць, бо трымалі з імі кантакт з самага накіравання, як напрыклад, будучы кіраўнік Лідскага народнага тэатра Уладзімір Сідарэнка.

А вось Тамара Усцінава, якую накіравалі ў распараджэнне Міністэрства культуры БССР, закончыла Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум. Тым не менш яна будзе мець самае непасрэднае дачыненне да ўстаноў культуры: у спецыяльных навукозых рэстаўрацыйных майстэрнях вяртаюць жыццё помнікам гісторыі, культуры і навукі, якія з'яўляюцца магутным сродкам ідэйна-выхаваўчай работы.

У абласныя ўпраўленні і раённыя аддзелы культуры ўжо прыходзяць першыя з таго вялікага папаўнення работнікаў культуры, якое атрымалі сельскія клубы, дамы культуры і народныя тэатры рэспублікі.

Вядома, што Тэрпсіхора — муза надзвычай патрабавальная да тых, хто прагне яе прызнання. Прыхільнікам балета, якія ўспрымаюць харэаграфію з глядзельнай залы, чароўная муза танца, мабыць, уяўляецца трапяткой, пяшчотнай Жызэллю. Для тых, хто штовечар выходзіць на падмосткі, каб выконваць яе загад, Тэрпсіхора нагадвае бязлітасную багіню, якая вымагае працы і працы. Ды такой, каб яе ніхто потым у зале не заўважаў і не адчуваў!..

«Яшчэ. Яшчэ. Яшчэ!» — уладна загадвае яна, зусім не лічачыся з тым, што наступнае «яшчэ», здаецца, ужо за мяжой чалавечых магчымасцей...

У той вечар гаспадарамі сцэны Акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР сталі маладыя танцоры — выпускнікі Дзяржаўнага харэаграфічнага вучылішча БССР. Хто яны, гэтыя, юнакі і дзяўчаты, якія прысвяцілі сябе складанаму мастацтву танца? Безумоўна, ім яшчэ трэба шмат назапасіць творчага вопыту, якім валодаюць іх настаўнікі — заслужаныя артысты БССР Н. Младзінская, Р. Красоўская і М. Красоўскі, Г. Абакумчык, Я. Архіпава і іншыя выкладчыкі. Але ўжо той факт, што спіс вядомых майстроў сцэны будзе папаўняцца многімі з гэтых маладых талентаў, сведчыць пра няспынны працэс узбагачэння

НАПЕРАДЗЕ — ПРАФЕСІЙНЫ

Сёлетні выпуск акцёраў са сцен Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута — дваццаць чацвёрты. Самы масавы з усіх, што былі раней.

Пра зацікаўленасць у папаўненні труп маладымі, таленавітымі акцёрамі сведчыць тая ўвага, якую аддавалі кіраўнікі тэатраў і вядомыя майстры сцэны гэтаму курсу. Яны глядзелі дыпломныя спектаклі, гутарылі з выпускнікам,і нарэшце, запрашалі іх у свае калектывы.

Выпускнікі Ігар Андрэеў, Валерый Ласоўскі, Яўген Ляонцьеў, Наталля Пашкевіч і Якаў Эверт будуць працаваць у Рускім тэатры БССР імя М. Горкага; Вольга Бяззубава, Яўген Фалевіч, Аляксандр Фралоў і Юрый Фядотаў — Дзяржаўным драматычным тэатры імя Я. Коласа; у Брэсцкі тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі запрошаны Віктар Дашкевіч; іх аднакашнікі едуць у Магілёў, Гродна.

А цяпер слова тым, хто выхоўваў маладых акцёраў, хто даў ім пуцёўку ў жыццё.

В. П. Рэдліх — мастацкі кіраўнік курса, народная артыстка РСФСР, прафесар:

— Мы, педагогі, ніколі не забываем запавету вялікай рускай актрысы Марыі Мікалаеўны Ермолавай, якая гаварыла: «Акцёра нельга выхаваць і навучыць, калі не выхаваць у ім чалавека». Інстытут і развівае ў будучых акцёрах не толькі тэхнічныя навыкі, а і фарміруе мастацкую індывідуальнасць, выхоўвае пачуццё грамадзянскай адказнасці перад гледачом. Працэс гэты — складаны. І мушу сказаць, што сёлетнія выпускнікі, у першую чаргу, Ігар Андрэеў, Вольга Бяззубава, Юрый Кухаронак, Жэня Ляонцьеў, Віктар Дашкевіч, Валерый Ласоўскі і Саша Фралоў апраўдалі давер педагогаў. У недалёкім будучым яны прынясуць шмат радасці гледачам. Усё, зрэшты, залежыць ад таго, у якія рукі трапяць маладыя парасткі. Усе яны адукаваныя людзі, з кожнага можна зрабіць і добрага акцёра, а можна і сапсаваць (так, на жаль, здараецца). Я па характару — аптыміст, веру ў працавітасць маіх выхаванцаў, у іх шчаслівы творчы лёс...

Ул. А. Маланкін — дацэнт, загадчык кафедры майстэрства акцёра і рэжысуры:

— Мне хацелася б перш за ўсё звярнуць увагу на жанравую разнастайнасць дыпломных спектакляў. Яны далі магчымасць нашым выканаўцам паказаць сябе, як кажуць, у розных якасцях. «Людзі на балоце» І. Мележа, напрыклад,— удзячны матэрыял для акцёра і рэжысёра. Надзвычай цяжкія задачы стаялі перад моладдзю і ў класічным рэпертуары — «Багна» А. Астроўскага, «Лакейская» М. Гогаля, «Асенні сум» М. Някрасава, «Ад яе ўсе якасці» Л. Талстога, «Ворагі» А. Чэхава.

На маю думку, выпускнікі, працуючы над гэтымі п'есамі, атрымалі сапраўдныя ўрокі майстэрства.

Цікавым і вельмі сучасным атрымаўся жыццярадасны спектакль-казка «Звычайны цуд» Я. Шварца. Інсцэніраваныя апавяданні В. Шукшына «Дзівакі» і А. Валодзіна «Дыялогі» далучылі нашых студэнтаў да мастацкага асэнсавання маральных аспектаў сённяшняга жыцця. Трагедыя маленькага чалавека ў грамадстве, дзе ўсё купляецца і прадаецца, адлюстравана ў спектаклі «Прычына» Л. Франка.

У такіх розных па стылі і жыццёвым напаўненні экзаменацыйных спектаклях адчувалася, вядома, што будучыя акцёры яшчэ толькі набываюць прафесійнае майстэрства, шукаюць, эксперыментуюць. Пры багатым творчым патэнцыяле ім прадстаіць практычна выпрацоўваць уменне ствараць завершаныя сцэнічныя вобразы. Гэта, зразумела, прыйдзе з часам, з вопытам. Але ёсць, як мне здаецца, галоўнае, што мы бачылі ў кожным спектаклі,— імкненне і жаданне выплаўляць у характарах герояў чыстае золата мастацкай праўды.

Хачу падкрэсліць празільнасць і неаспрэчнасць нашай метадалогіі. Педагогі працавалі ў рэчышчы сацыялістычнага рэалізму, ствараючы тэатр думкі, пачуцця, тэатр жыцця чалавечага духу на сцэне.

На дыпломных спектаклях няблага заявілі сябе студэнты рэжысёрскага аддзялення В. Мазынскі, Ул. Рудаў, М. Лур'е і А. Койфман. Напрошваецца вывад: трэба выхоўваць акцёраў і рэжысёраў разам. Плён сумеснага навучання відавочны. Гэтай лініі будзем трымацца і далей...

Г. Б. Абуховіч — старшыня дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, народная артыстка БССР:

— Мяне парадаваў курс, мастацкім кіраўніком якога была Вера Паўлаўна Рэдліх, выпрабаваны і глыбокі знаўца тэатра. У мяне, як артысткі, засталося вельмі прыемнае ўражанне. З многімі яе выхаванцамі мне хацелася б працаваць разам. І гэта сустрэча, відаць, неўзабаве адбудзецца, бо пяць выпускнікоў запрошаны ў наш тэатр.

Дзяржаўная экзаменацыйная камісія вельмі строга падыходзіла да ацэнкі дыпломных спектакляў і работы кожнага студэнта. Сапраўды, патрабаванні варта павышаць. Не варта пасылаць у тэатры нешта шэранькае, невыразнае, аморфнае. І члены камісіі былі аднадушнымі, калі высока ацэньвалі таленавітых юнакоў і дзяўчат. Абяцае стаць сапраўдным артыстам выдатнік вучобы Ігар Андрэеў. Яўхім — сын кулака ў «Людзях на балоце», Пагуляеў у «Багне». Мядзведзь у казцы Я. Шварца, Жылец і Старшыня ў «Прычыне» Франка, — такія супрацьлеглыя ролі. Андрэеў паказаў сябе сапраўды ўдумлівым маладым акцёрам, які ўмее працаваць, умее адшукаць адметнае зярнятка, характэрнае менавіта гэтаму вобразу. Парадавала работа студэнта Юрыя Кухаронка і асабліва яго Кісельнікаў у спектаклі

бываўся ў Маскве. Аб навуковых і творчых сувязях з музычнымі ўстановамі Масквы сведчыць і той факт, што шэсць выхаванцаў Людміла Сцэпура і Святлана Сергеенка паспяхова здавалі экзамены ў аспірантуру. Людміла — ў Маскоўскую дзяржаўную кансерваторыю, а Святлана — у інстытут імя Гнесіных.

Шмат добрага мне хацелася б пажадаць нашым лепшым студэнтам — Ленінскаму стыпендыяту Тамары Жук і стыпендыяту імя Чайкоўскага Барысу Спектару. Тамара — дырыжорхаравік, выхаванка дацэнта Віктара Уладзіміравіча Роўды. Барыс — піяніст. Яны ўжо асістэнты-стажоры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

Развітваючыся з выхаванцамі, наш калектыў жадае ім плёну, творчага натхнення, заўсёднай гатоўнасці выступаць на высокіх крытэрыях мастацтва...

З прыходам у любы мастацкі ансамбль маладых сіл у яго дзейнасці адбываюцца змены. Бо навічкі — гэта шукальнікі, наватары, няўрымслівыя мастакі. Дастаткова спаслацца на прыклад опернай трупы: калі ў яе складзе з'явіліся, скажам, І. Шыкунова, Ул. Іваноўскі або М. Зданевіч, то і ў раней падрыхтаваных спектаклях, і ў новым рэпертуары слухачы заўважылі новыя мастакоўскія індывідуальнасці, свежыя фарбы. А што і казаць пра дырыжора — калі за пультам музыканты бачаць кіраўніка з ярка выяўленым тэмпераментам і своеасаблівым густам, то і ў трактоўку выконваемых твораў уносіцца нешта адметнае... Трэба спадзявацца, што і кансерваторскія выхаванцы 1973 года выпуска пакінуць прыкметны след у мызычным жыцці рэспублікі.

ПЯТНАЦЦАТЫ

Сёлета на мастацкім факультэце Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута адбыўся пятнаццаты выпуск.

Перад Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй абаранялі дыпломныя работы выпускнікі аддзяленняў станковага жывапісу і графікі, скульптуры і манументальна - дэкаратыўных роспісаў, мастацкай керамікі і шкла, інтэр'ера і абсталявання, прамысловага мастацтва, мастацкага афармлення і мадэліравання вырабаў тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці.

На якім бы аддзяленні ні ствараліся дыпломныя работы, большасць з іх прасякнута інтарэсамі сённяшняга дня, інтарэсамі трывалай сувязі з запатрабаваннямі сучаснасці. Тэматычныя пано і адзенне, распрацоўкі дызайнерскага вырашэння механізмаў і сістэм, інструменту і абсталявання, праекты мэблі і дзіцячых цацак, дэкаратыўныя пласціны і вітражы, эскізы і фрагменты манументальных роспісаў — ледзь не ў кожнай рабоце (незалежна ад той адзнакі, якая была дадзена ёй экзаменацыйнай камісіяй). Вабіла ўвага дыпломнікаў да тэмы, да паглыбленага асэнсавання ўзаемадзеяння зместу і формы.

Немагчыма расказаць пра ўсе работы — іх абаранялася не адзін дзесятак. Дзеля іх аналізу спатрэбілася б спецыяльнае даследаванне.

Вось, скажам, адзін з манументальна - дэкаратыўных роспісаў быў на тэму «Паўстанне К. Каліноўскага». Гэты роспіс прызначаецца дыпломнікам Я. Кузняцовым для экстэр'ера канкрэтнага кінатэатра. Таму шмат увагі аўтар аддаў, як кажуць, тэхналагічнаму вырашэнню работы. Роспіс (дакладней—яго эскіз) уражвае пэўным умельствам кампазіцыйнага мыслення аўтара, разуменнем задач манументальнага мастацтва. Агроч таго, цікавасць выклікала і вынаходлівасць, сур'ёзнасць, з якой малады мастак імкнуўся спалучыць у сваім творы задачу мастакоўскую і задачу тэхналагічную.

МАСТАЦКІ

Паспяхова абаранялiся сёлета скульптары. Сярод іх работ пераважаюць прысвечаныя грамадска-значным тэмам—сучасным або гісторыка-рэвалюцыйным.

Сярод работ жывапісцаў (іх было ўсяго чацвёра) таксама парадавалі палотны, прысвечаныя нашай сучаснасці і гісторыка-рэвалюцыйнай тэме. Трэба сказаць, што ў кожнай карціне былі тыя ці іншыя недахопы, але ў той жа час работы сведчылі, што перад намі мастакі, якія ўмеюць працаваць і якія здольныя і далей развіваць сваё ўмельства, набытае ў інстытуце.

Прыгадваецца, напрыклад, работа С. Шафрановіча «Стачка». Гэта карціна, прысвечаная рэвалюцыйнай барацьбе рабочага класа на досвітку пралетарскага руху ў нашай краіне. Яна створана на аснове вывучэння аўтарам гістарычных матэрыялаў, а таксама на аснове сабранага матэрыялу ў часе спецыяльных паездак.

Досыць складаныя псіхалагічныя рашэнні дазваляюць гаварыць аб тым, што аўтар умее «весці карціну», умее паслядоўна паглыбляцца ў вобраз. Зразумела, нельга гаварыць аб поўнай завершанасці гэтага палатна (як, дарэчы, і іншых, што былі прадстаўлены да абароны), але важна падкрэсліць, што той этап, да якога карціна «даведзена»,—сведчанне сур'ёзнасці праведзенай працы, сведчанне ўмельства працаваць над складаным творам.

З работ графікаў, на мой погляд, вылучыліся, серыі «кніжнікаў»: ілюстрацыі Л. Лобан да рамана У. Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» і серыя афортаў В. Стасевіча па матывах народных беларускіх песень.

Л. Лобан здолела тактоўна падкрэсліць у сваіх ілюстрацыях узаемнае перапляценне рамантычнага і трагічнага літаратурнай першакрыніцы. Займальны сюжэт, вострыя сітуацыі, складаныя сацыяльныя падтэксты рамана маладая мастачка імкнулася перадаць менавіта праз характары, паказаныя «буйным планам». Мне здаецца, што пошукі мастачкі графічнага эквівалента стылістыцы рамана ўвянчаліся поспехам. Лісты, прасвечаныя Юрасю Братчыку —лепшае таму сведчанне. Важна, што мастачка ўмее заставацца ў атмасферы твора, не навязваючы гледачу ілюстрацый свайго прачытання яго.

В. Стасевіч у афортах на тэмы песень стварыў шматфігурныя кампазіцыі, якія не столькі ілюструюць тэкст песні, колькі перадаюць яе дух, унутраны сэнс...

Наперадзе ў выпускнікоў мастацкага факультэта — напружаная пара творчасці, замацавання ведаў і вопыту, набытых у інстытуце. І—выстаўкі, выстаўкі...

У добры шлях!

Ул. БОЙКА.

У СВІЦЕ ТЭРПСІХОРЫ

новымі сіламі балетнага мастацтва.

І вось — першае выпрабаванне: яны выступаюць на вялікай сцэне. Рабіць канчатковыя вывады аб майстэрстве танцораў па адным або двух нумарах нельга. Затое ясна было — кожны з іх імкнецца працаваць па вышэйшых крытэрыях.

Іспанскі танец з балета Чайкоўскага «Лебядзінае возера». Мінчане добра памятаюць бліскучае выступленне ў гэтым агніста-велічным нумары народную артыстку БССР Аляксандру Нікалаеву з партнёрамі. Выпускнікі вучылішча Галіна Уласьянава, Таццяна Петракова, Аляксандр Кузняцоў і Мікалай Ярошын паказалі высокі клас сцэнічнага ўвасаблення танца, экспансіўна вялі на харэаграфічнай мове размову, насычаную цудоўнай музыкай Чайкоўскага. Аднак маладым выканаўцам не заўсёды ўдавалася пераадолець тую нябачную грань, якая аддзяляе жаданне быць дасканалым ад сапраўднага майстэрства. Тым не менш танцавальны квартэт трымаўся ўпэўнена, паводзіў сябе тэмпераментна, а захапленне юных перадалося ўсім, хто сядзеў у зале.

Шмат добрых і цёплых слоў было сказана ў адрас танцоўшчыкаў з адчувальнай своеасаблівай выканаўчай манерай — Валянціна Астрэйкі, Георгія Нікіціна, Валянціны Пакальніс, Уладзіміра Капорыкава і іншых.

Прыемнае ўражанне пакінуў харэаграфічны нумар Арлекіна і Каламбіны з балета «Медны Коннік» Гліэра ў выкананні Наталлі Мачалавай і Сяргея Манзалеўскага. Рэжысёр-пастаноўшчык Г. Абакунчык і канцэртмайстар В. Карабань вельмі карэктна ўводзяць у тканіну твора новыя адценні, арганічна ўспрынятыя юнымі артыстамі — яны адчуваюць і разумеюць тонкасці музычна-тэатральнай дэкламацыі як сродку раскрыцця фабулы танца.

Вобразная дынаміка ў выкананні «Святочнага танца» і «Галопа» Дрыга спалучылася з на дзіва празрыстым настроем лірычнай задуменнасці. Непасрэднасцю, чыстымі і дакладнавыразнымі рухамі вызначылася падэ-труа з «Лебядзінага возера».

Вельмі цікавыя танцы паставіла заслужаная артыстка БССР Ніна Младзінская. Дарэчы, у антракце гэтага вечара яе цёпла віншавалі з 50-годдзем творчай дзейнасці і вучні, і публіка. Адзін з нумароў, «Адажыа» Фарэ, яна распрацавала спецыяльна для сваёй вучаніцы Людмілы Логвінавай, звярнуўшы ўвагу ў свой час на артыстычныя дадзеныя дзяўчынкі. Танец, дакладны і роўны, упэўнены па малюнку, узрушае і шчырасцю пачуццяў гераіні. Партнёр Л. Логвінавай у гэты вечар Ігар Лебедзеў — удумліва і ўсхвалявана вёў сваю складаную партыю.

...Закончаны экзамены. Выхаванцы развітваюцца з вучылішчам. Куды ж пралягуць іх творчыя шляхі?

— Заўсёды сумуеш, калі развітваешся з тымі, чыё творчае станаўленне праходзіла на тваіх вачах, — гаворыць дырэктар Дзяржаўнага харэаграфічнага вучылішча, заслужаны дзеяч культуры БССР К. Ф. Калітоўская. — Тым не менш гэта і радасная падзея. Нашы выпускнікі ўвойдуць у прафесійныя калектывы Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР...

На здымку — танцуюць Л. Логвінава і І. Лебедзеў.

Сапраўды, маладым артыстам адкрыты бліскучыя перспектывы. І хто ведае, магчыма, многія з іх праславяць нацыянальны балет.

Валерый ЛЕСТЭР.

«Багна». Розны і не паўтарае сябе Аляксандр Фралоў: жорсткі хцівец кулак Глушак, міністр-адміністратар у шварцаўскай казцы, Пракоп з «Дзівакоў». Апошняя работа нечакана адкрыла ў маладым акцёры камедыйны талент. Заўсёды тэмпераменты, адухоўлена ўсхваляваны ў сваіх ролях Якаў Эверт. Лірычнай, глыбокай актрысай уявілася мне выпускніца Вольга Бяззубава.

Словам, пра выпускнікоў курса можна расказваць шмат цікавага. Іх свежы, малады голас, шчырасць і непасрэднасць патрэбны, як паветра, тэатру.

Таму хочацца выказаць глыбокую падзяку рэжысёрам-педагогам, якія чатыры гады працавалі з курсам, вучылі студэнтаў, перадавалі ім свае веды і вопыт —прафесару В. Рэдліх, заслужанаму артысту БССР Ю. Сідараву, А. Карсакоўскаму, мастацкаму кіраўніку курса рэжысёрскага аддзялення дацэнту Ул. Маланкіну, студэнты якога паставілі некалькі цартых увагі спектакляў.

...Вучоба закончана. Здадзены экзамены. І вось ты ўжо акцёр тэатра. Але ніколі не забудуцца рэпетыцыі з любімымі педагогамі, гады, знітаваныя агульнай вучобай, работай, марамі. Такое, відаць, бывае ў аднапалчан — у памяці сэрца застаецца назаўсёды цеплыня дружбы, таварыскасці, якія сагравалі і ў дні радасці, і ў дні нягод.

Няхай жа і сёлетнім выпускнікам заўсёды спадарожнічаюць удачы, натхненне і свяшчэнная незадаволенасць зробленым. З гэтым выпраўлялі ў самастойнае жыццё іх настаўнікі.

Я. ДАНСКАЯ.

НА ПАРОЗЕ БУДУЧЫНІ

Яны паважалі адзін аднаго, таму гаварылі самую суровую праўду ў вочы. Маглі сяброўскім жартам зняць напружанне і суровым словам «супакоіць» зазнайку. Яны ўмелі спрачацца да хрыпаты і ўмелі працаваць. Яны былі сапраўднымі студэнтамі. Былі, таму што некалькі дзён назад выхаванцы Андрэя Ануфрыевіча Бембеля, маладыя скульптары, атрымалі дыпломы аб заканчэнні Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. У рэспубліцы стала сям'ю скульптарамі больш. Абаранілiся Ларыса Андрэйчыкава, Мікалай Бакуменка, Віктар Кліменка, Юрый Палякоў, Міхаіл Шкробат, Вячаслаў Касіцын, Уладзімір Церабун.

Кожны з іх знойдзе свой шлях у жыцці і ў мастацтве.

Мне ж хочацца расказаць пра некаторых...

...Спачатку мне здалося, быццам пра Юрыя Палякова аднакурснікі гаварылі не іначай, як з іроніяй. Гэта некалькі здзіўляла і насцярожвала. Зрэшты, даволі хутка я зразумеў, што гэта лёгкая іронія ад захаплення.

За ўсе шэсць год Юрый не атрымаў, здаецца, ніводнай чацвёркі па спецыяльных дысцыплінах. Ён быў найбольш падрыхтаваны па філасофіі, шмат чытаў, добра ведаў літаратуру, дабіўся выдатных вынікаў у спорце. Здаецца, упершыню ў гісторыі інстытута работы другакурсніка Палякова экспанаваліся на «дарослых» рэспубліканскіх і усесаюзных выстаўках.

Героем дыпломнай работы Юрыя Палякова стаў беларускі барэд Аляксандр Мядзведзь. Дванаццаць гадоў правёў на дыване гэты цудоўны спартсмен. Заваяваў безліч залатых медаляў. Тройчы перамагаў на Алімпійскіх гульнях. Яму, гаворачы словамі Маякоўскага, «памятнік при жизни полагается по чину».

Ідэя стварыць такі помнік захапіла Юрыя.

...Маналітная фігура спартсмена прадстае перад намі не адназначнай, складанай, нават супярэчлівай. Радасць перамогі і гора развітання са спортам, вялікая фізічная сіла і інтэлект...

Сярод мноства твораў мастацтва, прысвечаных спорту, няма, здаецца ніводнага, які мог бы нагадаць дыпломную работу Юрыя Палякова. Ён знайшоў рашэнне кампазіцыі, якое наўрад ці магчыма перанесці на іншага спартсмена. Толькі Аляксандр Мядзведзь!

Я бачу манумент Палякова ў бронзе. Ён, безумоўна, упрыгожыць мінскі стадыён «Дынама».

Калі Ю. Палякоў манументаліст, дык М. Шкробат — лірык. Лірычны пошук прывёў студэнта ў свет балета.

...Тры дзявочыя постаці. Пакуль у пластыліне. Пластычная характарыстыка кожнай балерыны пераканаўчая, эцюды — цудоўныя. Праўда, паколькі аб'ём работы быў надта вялікі М. Шкробат не паспеў давесці работу да завершанасці, але гэта пытанне часу і цярпення.

Уладзімір Церабун паступіў у інстытут на год пазней за аднакурснікаў, дагнаў іх і зараз прадстаніў на суд журы сур'ёзную, капітальную работу.

Прымаць яе камісія выехала на месца, дзе некалі была вёска Дальва, якая падзяліла лёс Хатыні.

Зараз там сярод пагоркаў, палёў, лясоў узведзены манумент — чатырохметровая фігура маці, да якой прытуліўся маленькі хлапчук...

Манументу, які выканаў Уладзімір Церабун, уласцівы высокая грамадзянскасць і высокі ўзровень прафесіяналізму. Работа шчырая і ўзнёслая.

Шмат добрых слоў пачулі на абароне дыпломных работ выпускнікі скульптурнага аддзялення і іх педагогі, рэцэнзенты, мастакі, гледачы — усе аднадушна адзначалі несумненны поспех кафедры Андрэя Ануфрыевіча Бембеля.

К. ЗЕЛЯНОЙ.

НА СЦЕЖКАХ ТЫХ, ШТО ПОМНЯЦЬ ЯГО КРОКІ

РЭПАРТАЖ СА СВЯТА ПАЭЗІІ

Свята паэзіі адкрывае Максім Танк.

І зноў, як і год назад, пад засень ліп і бяроз на радзіму нашага вялікага песняра Янкі Купалы, у маляўнічую Вязынку, прыйшлі і прыехалі сотні людзей з розных мясцін Беларусі, каб выказаць сваю пашану да паэта, яго несмяротнага слова, каб прыняць удзел у традыцыйным свяце паэзіі.

Яшчэ зранку аўтобусы пачалі выстройвацца на пляцоўках паблізу мемарыяльнага купалаўскага запаведніка, яшчэ зранку пацягнуліся да вядомай паляны ў яго цэнтры вераніцы людзей. Сярод зеляніны, на шматлікіх століках, у кіёсках—выданні паэтаў і празаікаў Беларусі, Расіі, Украіны, Туркменіі, іншых рэспублік. Па звычаю, які стаў ужо законам жыцця, любое свята—гэта не толькі наша свята, але і свята сяброў і братоў нашых—народаў Краіны Саветаў. Гэты закон еднасці і братэрства ўславіў і Янка Купала:

Мы ідзем у сонцы з сонцам
Маладым паходам.
Слава бацькаўшчыне нашай
І яе народам.

І сёння сярод гасцей—пісьменнікі з Масквы, Ленінграда, Украіны, Літвы, Латвіі.

На свята прыбылі намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова, міністр культуры БССР Ю. М. Міхневіч, адказныя работнікі Мінскага абкома КПБ і аблвыканкома, Маладзечанскага райкома КПБ і райвыканкома.

...З рэпрадуктараў гучаць вершы Янкі Купалы, пакладзеныя на музыку нашымі кампазітарамі.

Свята адкрывае народны паэт, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Максім Танк. Ён гаворыць пра шчырую радасць новага спаткання ў гэтай дзівоснай мясціне нашай зямлі, з якой пакрочыў у свет вялікі паэт і грамадзянін—Янка Купала. Максім Танк вітае ўсіх аматараў паэзіі на зямлі, якая паліта крывёй герояў, яе абаронцаў, і якая сёння нараджае герояў мірных спраў нашых пяцігодак.

Сакратар Мінскага абкома КПБ У. С. Багданаў, вітаючы прысутных, гаварыў пра папулярнасць беларускай літаратуры, якую ведаюць не толькі ў нашай рэспубліцы, але і далёка за яе межамі, пра любоў да вялікіх Янкі Купалы і Якуба Коласа, паэтычнае слова якіх цесна было звязана з жыццём, з пачуццямі і думкамі савецкіх людзей.

А потым загучала слова паэтаў. Народны паэт БССР, Герой Сацыялістычнай Працы Пятрусь Броўка нагадаў аб сваіх сустрэчах з Купалам, прачытаў верш, адрасаваны ўсім тым, хто на сотні моў перакладае наша роднае слова:

Паэзіі нашай крылы
Узняты сотняй братніх моў!
Не, мы яшчэ не ацанілі
Яе шматлікіх галасоў...
І вось за гэту ласку, працу
Хачу падзякаваць я вам—
І масквічам, і ленінградцам,
Ва ўсіх рэспубліках сябрам.

Усхваляванае слова народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі прысвячаецца Янку Купалу, у ім гаворыцца аб прызначэнні паэзіі, паэта:

З працы пачынаецца Купала,
З песні, што яднала ўсіх людзей,
З казак, дзе крыві і слёз хапала,
З калыханкі сонца і надзей.
З болю пачынаецца, з пратэсту,
З прыгавору гнеўнага панам...
І прыйшлі мы з ім у свет
братэрства,
І дарог не трэба іншых нам.

Братэрства... Яно прывяло сюды паэтаў з розных рэспублік Саюза. Ленінградзец Браніслаў Кежун падарыў музею Купалы зборнік, дзе надрукаваны вершы беларускага песняра ў рускім перакладзе і прачытаў перакладзены ім верш Міколы Хведаровіча пра Вязынку.

Вершы чытае Пятрусь Броўка.

Масквіч Мікалай Сідарэнка ўспомніў Купалу як вельмі мілага і надзвычай сціплага чалавека, які заўсёды быў гатовы да добрага слова, добрага жарту. Яго зямляк Барыс Турганаў сказаў, што на долю Янкі Купалы выпала шчасце, пра якое толькі можа марыць пісьменнік—ўдзельнічаць у ажыццяўленні самых запаветных мар і планаў народа. «Услухайцеся ў яго вершы, і вам адкрыецца душа беларускага народа».

Літоўскі паэт Вітаўтас Рудокас заяўляе, што з імем Купалы цесна звязаны Вільнюс, які паэт называў горадам свайго юнацтва. І не толькі гэта спалучае—яшчэ дзівосная паэзія яго, Купалы.

На ўкраінскай мове звяртаецца да сваіх набрацімаў-беларусаў Расціслаў Братунь. «Ён нам дарагі і родны,—гаворыць Р. Братунь—як Тарас Шаўчэнка, як Іван Франко, як Леся Украінка».

І латышскі паэт Пятрас Юрціньш падкрэслівае вялікую еднасць нашых народаў-братоў і іх літаратур: «У Рызе ёсць вуліцы Пушкіна, Купалы і Райніса»... І зноў гучыць паэтычнае слова Купалы—на латышскай мове.

Паэта, яго родную зямлю беларускую, народ яго ўславілі сваімі вершамі А. Зарыцкі, Ул. Паўлаў, К. Цвірка, П. Макаль, А. Бялевіч, Э. Агняцвет, А. Вялюгін, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, А. Вярцінскі, Е. Лось, А. Грачанікаў, Я. Сіпакоў і інш.

Землякі Купалы—звеннявая калгаса імя 50-годдзя Кастрычніка Маладзечанскага раёна Ніна Станевіч і інжынер з Маладзечна Валерый Сычоў расказваюць пра росквіт іх краю, пра здзяйсненне светлых мар паэта, пра сваю любоў да яго творчасці.

...Мы бяром некалькі маланкавых інтэрв'ю ў слухачоў—людзей розных узростаў, з розных мясцін. Задаем ім два пытанні: «Калі Купала ўвайшоў у Ваша жыццё?» і «Што прывяло Вас сюды, на свята паэзіі?»

На пляцоўцы самадзейныя артысты.

Васіль ШЭЛЕПЕНЬ,
майстар эксперыментальнага ўчастка завода сілавых паўправаднікоў-вентыляў (Маладзечна):

—У маё жыццё Купала прыйшоў, вядома, са школьных гадоў. Але тут я ўпершыню. Сказаў сам сабе: трэба з'ездзіць, паглядзець на радзіму паэта. І ўражанні багатыя. Я вельмі ўзрушаны тым, што бачу.

Тамара ГРЫШЭЙ,
з вёскі Туркаўшчына:

— Канечне, ведаем і любім Купалу са школы. Асабліва падабаецца «Паўлінка». Былі тут і ў мінулым годзе, на ўрачыстым адкрыцці свята. Увогуле любім наведваць

Пімен Панчанка і госць з Латвіі Пятрас Юрціньш.

гэтыя мясціны. А ў музеі ўпершыню была яшчэ год дзесяць назад...

Любоў ВАСІЛЕЎСКАЯ,
завод медпрэпаратаў (Мінск):

— Вершы Купалы ведаю яшчэ з дзяцінства. І мне хочацца, каб гэтыя пачуцці любві да паэта, да яго творчасці перайшлі да маіх дзяцей—я прывезла іх сюды, на свята Купалы, на свята паэзіі. Край тут прыгожы, прывабны і для турыстаў. І я тут бываю часта, амаль кожны выхадны. Ну, і, вядома, была год назад, на юбілеі паэта.

●

Рознымі шляхамі прыходзіць паэзія да людзей, рознымі шляхамі ідуць да яе людзі... І вось сёння тут разам—свята паэзіі, свята людзей.

—Свята паэзіі, на якое да нас прыехалі госці з розных гарадоў краіны, яшчэ раз пацвердзіла ўсенародную любоў да нашага дарагога Купалы, прадэманстравала дружбу савецкіх народаў-братоў,—гаворыць у заключэнне ўрачыстай часткі сакратар Маладзечанскага райкома партыі В. А. Ляшковіч.

А ў канцэрце зноў звінела мілагучнае і магутнае слова Купалы і сучасных паэтаў—ужо на крылах песні. Выступалі артысты, прафесіяналы і аматары,—і для ўсіх іх слова беларускай паэзіі блізкае і дарагое сэрцу.

Познім вечарам па вёсках Маладзечаншчыны і ў самім горадзе зашугалі купальскія кастры, загучалі харавыя песні, пачалося імправізаванае спаборніцтва: чыя песня лепей. Гэтак жа, як было здавён-даўна, толькі цяпер з пачуццём волі і шчасця...

Фота Ул. КРУКА.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

Валянціну ПАНАМАРОВУ — 50



Пісьменніку, журналісту Валянціну Панамарову споўнілася пяцьдзесят гадоў. Праўленне Саюза пісьменнікаў накіравала юбіляру віншаванне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Валянцін Георгіевіч!

З нагоды Вашага пяцідзесяцігоддзя прыміце ад нас, Вашых сяброў і таварышаў па пяру, шчырае сардэчнае віншаванне.

Вы дастойна прайшлі свой паўвекавы жыццёвы шлях. Спачатку, пасля заканчэння сярэдняй школы — нядоўгая вучоба ў Маскоўскім авіяцыйным інстытуце, у 1942 годзе — прызыў у армію, нялёгкія франтавыя дарогі...

Пасля вайны Вы зноў аддаяце сябе вучобе, настойліва шукаеце сваю дарогу. Слухач Ваенна-паветранай акадэміі імя Жукоўскага, затым студэнт Інстытута міжнародных адносін, — перад Вамі наперадзе вялікія магчымасці і захапляючая праца. Але Вам палюбілася іншая прафесія — журналістыка, прафесія, якая стала найгалоўнай у Вашым жыцці.

Доўгі час Вы працавалі ў рэдакцыі газеты «Правда», спачатку літработнікам, а потым спецыяльным карэспандэнтам па Беларусі. Пасля была праца ў часопісу «Огонёк», у якім працягваў мужнець Ваш журналісцкі голас.

Частыя журналісцкія паездкі ўзбагацілі Вас цікавымі назіраннямі над людзьмі, над жыццёвымі падзеямі. Менавіта ў гэты час Вы напісалі нарысы, якія друкаваліся ў рэспубліканскіх і цэнтральных выданнях. Лепшыя з іх увайшлі ў кнігу «На хвалях жыцця».

Добрае слова ад чытачоў і крытыкі Вы атрымалі і за іншыя кнігі — «Партизанские годы Кирилла Орловского», «Расскажи моим девочкам». Ваша дакументальная аповесць «Мятежное сердце» пра Кірылу Арлоўскага з'явілася прыкметным творчым дасягненнем. Цікава зарэкамендавалі Вы сябе і як кінасцэнарыст.

Мы рады адзначыць, што Вы шмат сіл і стараннасці аддаяце грамадскай рабоце. У сучасны момант Вы працуеце кіраўніком групы палітычных аглядальнікаў Беларускага тэлебачання і радыё, знаходзіцеся па важным участку ідэалагічнага фронту.

Жадаем Вам, дарагі Валянцін Георгіевіч, новых творчых удач, добрага здароўя, радасці, шчасця».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае юбіляру новых творчых поспехаў.

ДЗВЕ СУСТРЭЧЫ

ДАЎНО адгрымела вайна, але мы — франтавікі, сабраўшыся, абавязкова ўспамінаем і гэтага чалавека. Ён фарміраваў наш корпус, вёў нас у наступленне на Оршу ў сорак трэцім, вёў пад Віцебскам у пачатку сорак чацвёртага, а летам сорак чацвёртага сустракаліся з ім пры наступу на Мінск.

Высокі, з прывабнымі рысамі твару, з чорнай чупрынай і невялікімі вусамі, ён быў знаёмы многім, каму выпала ваяваць пад яго кіраўніцтвам.

...У сапёрны корпусны батальён прыбыло папаўненне, сярод якога аказаўся і сержант Аляксандр Касабрухаў, удзельнік баёў пад Масквой, Сталінградам, Растовам-на-Доне і Смаленскам. Вольнай пасады — камандзіра аддзялення — не было, і Касабрухаву давялося некаторы час ваяваць радавым.

Аднойчы аддзяленне, у якім знаходзіўся Аляксандр Касабрухаў, было паслана на НП камандзіра корпуса, каб зрабіць там укрыццё для аўтамашыны генерала.

Нечакана ў траншэю заявіўся чалавек у камандзірскай шапцы і ў салдацкай ватоўцы, накінутай на плечы.

— Прывет працаўнікам вайны! — сказаў ён, падышоўшы да салдат. Сапёры павярнуліся, прыгледзеліся і пазналі генерала.

— Стаміліся? Давайце пакурым,— генерал выцягнуў з кішэні пачак «Казбеку». — Закурвайце, не саромцеся.

— Дык калі мы ўсе возьмем па адной, у вас, таварыш генерал, нічога не застанецца, — сарамліва сказаў Касабрухаў.

— А вы не хвалюйцеся. Я закуру вашай махорачкі.

Сем кісетаў умомант аказаліся перад генералам. Шаўковыя, з кутасамі, атласныя з вышыўкай, шкляначкі-маслёнкі ад масла, якім змазвалася зброя, пластмасавыя трафейныя карабачкі.

Закурылі, зацягнуліся, крыху памаўчалі.

— Ну, як жывяце, як ваюеце? — парушыў маўчанне генерал.

— Жывём... — нясмела вымавіў салдат Сігбатулін. Ён бянтэжыўся пры высокім начальстве. Затое рухавы гаварун Васянкоў ажывіўся.

— Ваюем паспяхова. Вось толькі фрыц супраціўляецца, паразіт. Але нішто—зломім. Не першы раз.

— Добра! — Генерал глыбока зацягнуўся, з усмешкай паглядзеў на салдат: — А як з узнагародамі ў вас?

— Ёсць, узнагарода, — адказаў зноў Сігбатулін.

— Як жа, узнагароджваюць,—пацвердзіў Васянкоў.

Касабрухаў, які стаяў крыху ўбаку, уваткнуў рыдлёўку ў зямлю і, падышоўшы да генерала, не то ўсур'ёз, не то жартам вымавіў:

— Узнагароджваюць, ды не ўсіх.

Сапёры паглядзелі на таварыша. Нехта тарганўў яго за рукаў — маўляў, генерал жа!

— Вось я, — не зважаў на гэта Касабрухаў, — абараняў Маскву. Камандзір роты напісаў на мяне ўзнагародавы матэрыял, а праз гадзіну мяне ў шпіталь адправілі. Не трапіў матэрыял па прызначэнню. Калі вылечыўся, у Сталінградзе абараняў трактарны. Зноў параніла. Зноў у шпіталі амаль чатыры месяцы. Потым вызваляў Растоў. Камандзір батальёна сказаў: «Як толькі станем у абарону, цябе, Касабрухаў, першага прадстаўляю да ўзнагароды». А яго праз дзень — бомбай... І мяне трэці раз параніла. Пад Смаленскам. Толькі прыбыў у роту — пайшлі ў наступ. У нямецкіх траншэях — чацвёрты раз! — чапляе мяне варожая куля. Думаў, капцы. Прытомнасць страціў. Апрытомнеў у лагчыне. Цягне мяне дзяўчына на плашч-палатцы. Сама маленечкая, а мяне, бамбізу, валачэ. Я ёй кажу, маўляў, кінь, усё роўна смерць. Маўчыць. Потым сустрэла санітараў, перадала мяне ім. Больш яе не бачыў... А цяпер, бач, як нестраявы, трапіў у сапёрны батальён...

Калі Касабрухаў змоўк, камандзір корпуса кінуў цыгарку на дно акопа і сказаў ціха:

— А ну, пройдзем са мною.

Сапёр пакрочыў, а сам азіраецца. Пабойваецца, відаць, дзядзька, крочы ўслед за генералам — ці не сказаў што лішняе.

— Сядай! — генерал паказаў у бліндажы на табурэт. — Прынясі, брат, нам! — падаў ён знак рукою ад'ютанту, маладзенькаму малодшаму лейтэнанту. Той прынёс талерачку, на якой ляжалі скібачкі хлеба, каўбасы і сала. Потым паставіў на стол дзве шклянкі.

— Пі!

Калі сапёр крыху закусіў, генерал загадаў:

— А цяпер раскажы, адкуль родам, дзе сям'я, як ваяваў?

Глыбока ўздыхнуўшы, сержант расказаў, як біўся за свой родны горад — Старую Русу, дзе жылі ўсе яго сваякі, як пакідаў родны горад, так і не даведаўшыся, што стала з сям'ёю.

Расказаў, як іх рота тыдзень трымала немцаў пад Валакаламскам. Як першым уварваўся пад Смаленскам у нямецкую траншэю і знішчыў гранатай кулямётчыка. Як з вінтоўкай кінуўся на аўтаматчыка, а той, з перапалоху, ніяк не мог у яго пацэліць. І пра Сталінград расказаў...

— Значыцца, таварыш генерал, выходзіць, ваяваў я, фактычна, паўгода. А ўвесь астатні час пракачаўся ў шпіталях.

— Хопіць, — спыніў сержанта генерал. — З сённяшняга дня ты ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны...

Як у сне выходзіў з бліндажа Касабрухаў. 7

●

Калі нашы перадавыя атрады вялі баі за Бярэзінаю, склады з боепрыпасамі, прадуктамі харчавання ўсё яшчэ знаходзіліся на старых месцах, за Оршай. Гаручае для танкаў, машын, снарады, патроны і гранаты падаваліся да месца баёў аўтатранспартам. Шафёры не вылазілі з кабін па некалькі сутак.

Машыны ішлі праз пантонны мост, наведзены корпусным сапёрным батальёнам у раёне вёскі Доўгае. Калі на ўсходнім беразе ракі было суха, то на заходнім быў мурог з вялізнымі старыцамі. Дарога, так-сяк наладжаная сапёрамі пад вечар, была разбіта коламі транспарту. Увечары першага ліпеня на заходнім беразе, каля пераправы, загрузла палутарка. Вадзіцель настолькі знясілеў, што заснуў проста за рулём.

Неўзабаве каля пераправы сабралася аж некалькі дзесяткаў машын. Стомленыя вадзіцелі стараліся скарыстаць любы прыпынак для сну. Машыны стаялі, ахутаныя туманам.

Нечакана да «заснуўшай калоны» пад'ехала камандзірская машына. І з яе выйшаў чалавек у генеральскай фуражцы, з-пад якой выбіваліся смаляныя валасы. Ён прайшоўся ўздоўж калоны і ўбачыў, што вадзіцелі спалі, хто схіліўшы галаву на баранку, хто адкінуўшыся на спінку сядзення. Дайшоў да галаўной, той самай, што загрузла, і якую можна было выцягнуць толькі з дапамогай буксіра.

Генерал вярнуўся ў хвост калоны і, адкрыўшы кабіну, патармасіў вадзіцеля.

— Прачніся, дружа! Прачніся!

Шафёр расплюшчыў вочы. Убачыўшы генерала, умомант выскачыў з машыны.

— Хадзем са мною! — коратка сказаў генерал і пайшоў да наступнай машыны. Ён ішоў упераздзе, а за ім усё прыбаўлялася і прыбаўлялася людзей.

Генерал ведаў, што пад Смалявічамі ў немцаў ёсць падрыхтаваная абарона і, калі паслабіць удар, яны затрымаюць наша прасоўванне да сталіцы Беларусі. Дваццаціпяцітысячнае нямецкае войска таксама ідзе лясамі, падпаўзае да Мінска. Не ведалі гэтага шафёры, а генерал ведаў. Ведаў таксама, што там, наперадзе, камандзіры перадавых атрадаў па рацыі звярталіся да тылавікоў: «Снарадаў! Мін! Патронаў! Гранат!» Такім чынам, ад гэтых машын, магчыма, залежыць, замкнецца «пастка» вакол нямецкай арміі, або не. Акрамя таго ён ведаў, што пантонная пераправа пакуль адзіная, і калі яе раніцою выявяць нямецкія лётчыкі, кепска нам будзе.

...Генерал падвёў шафёраў, а іх было шмат, да галаўной машыны.

— Прачніся, дружа! Уключай матор.

Запрацаваў матор, машына завуркатала.

— А ну, хлопцы, дапаможам грузавіку! Падымем яго, падштурхнем!— і генерал сам упёрся плячом у кузаў. Дзесяткі рук пацягнуліся да машын. І яна адразу выскачыла з калдобіны.

— Цяпер ты, — павярнуўся генерал да аднаго з байцоў, —прынясі галля.

Шафёры хутка зразумелі, што да чаго. Яны ведалі, што такое «пробка» на франтавых дарогах. Нехта, пабег да пантоннага маста і прыцягнуў адтуль абрубкі бярвенняў накатніку, нехта выбіраў новы шлях, больш трывалы.

— Газуй! — чуўся голас генерала.

Дужыя рукі папіхалі машыну, і яна праходзіла.

Генерал зірнуў на пасвятлелае неба, лёгка ўздыхнуў — здаецца, пранесла. Ён стомлена апусціўся на расістую купіну, прыкрыў твар рукамі. Вочы ўмомант зліпліся. Ад'ютант не будзіў яго. Падышла машына і спынілася. Вадзіцель сядзеў за рулём, ад'ютант стаяў, а генерал спаў, седзячы на купіне.

Неўзабаве над Бярэзінай загрукалі зеніткі, адганяючы «месера».

— Здаецца заснуў — спахапіўся генерал. — Хутчэй наперад. Паехалі наперад!..

Другога ліпеня сорак чацвёртага года яго стралковы корпус затрымаў рух нямецкай арміі да Мінска. Гэта дазволіла нашым часцям неадкладна прыступіць да штурму. Потым былі шчаслівыя гадзіны ў вызваленай сталіцы Беларусі. Успамінаю высокую падцягнутую фігуру генерала, радасную ўсмешку на яго твары...

Сёння няма сярод нас Героя Савецкага Саюза, генерал-лейтэнанта Мікалая Мікалевіча Алешава. Але такія людзі і пасля смерці — з жывымі.

В. МЕЛЬНІКАЎ.

БЕЛАРУСКАЯ КНІГА Ў КІЕВЕ

Выстаўка беларускай кнігі ў Кіеве прыцягнула вялікую ўвагу ўкраінскай грамадскасці. Яе наведалі работнікі выдавецтваў, кніжнага гандлю, паліграфісты, пісьменнікі, мастакі, прадстаўнікі прэсы, шматлікія аматары кнігі.

У экспазіцыю былі ўключаны лепшыя выданні апошніх гадоў — творы У. І. Леніна, грамадска-палітычная і эканамічная літаратура, творы беларускіх пісьменнікаў, пераклады, падручнікі, навуковыя працы, розныя даведнікі, альбомы і г. д.

Вядомы ўкраінскі паэт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі УССР імя Т. Р. Шаўчэнкі, заслужаны работнік культуры Беларускай ССР Мікола Нагнібеда на мітынгу з нагоды адкрыцця выстаўкі шчыра вітаў беларускіх пісьменнікаў, выдаўцоў і паліграфістаў. Ён адзначыў іх вялікія творчыя поспехі.

У кнізе водгукаў украінскія аматары кнігі пакінулі шмат удзячных слоў. «Мы з вялікім задавальненнем пазнаёміліся з выстаўкай кнігі Савецкай Беларусі, — адзначаюць работнікі з Кіеўскай друкарні навуковай кнігі. — Нам падабаецца мастацкае афармленне кніг... Такая выстаўка дапамагае пазнаёміцца з гісторыяй і культурай народа». Іх калегі з фабрыкі «Паліграфкніга» дадаюць: «Выдаўцы і паліграфісты Беларусі прыклалі шмат намаганняў і творчай ініцыятывы да афармлення ўсіх відаў выданняў, асабліва твораў У. І. Леніна».

«Дарагія сябры! Прыемна пабываць на такім цудоўным свяце кнігі. Ад усяе душы дзякуй за радасную сустрэчу... Выстаўка дае багатае ўяўленне аб стане кнігавыдавецкай справы ў вашай рэспубліцы», — піша супрацоўнік Інстытута літаратуры Акадэміі навук Украінскай ССР Расціслаў Мішчук.

Украінскі друк, радыё, тэлебачанне таксама далі высокую ацэнку кніжным экспазіцыям, якія дэманстраваліся на выстаўцы. Разгорнутыя карэспандэнцыі, нататкі, фотаздымкі з'явіліся на старонках газет «Радзяньска Україна», «Правда України», «Молодь України», «Київська правда», «Вечірній Київ» і іншых. «Літаратурна Україна», орган Саюза пісьменнікаў УССР, у перакладзе на ўкраінскую мову дала падборку вершаў Хв. Жычкі, Р. Барадуліна, Ул. Паўлава, А. Зарыцкага.

У час выстаўкі адбылося нямала незабыўных сустрэч беларускіх пісьменнікаў, прадстаўнікоў выдавецтваў з украінскімі чытачамі. На гэтых сустрэчах было выказана шмат сардэчных пажаданняў.

У прыватнасці, паступалі прапановы аб адкрыцці ў сталіцы Савецкай Украіны спецыялізаванай кнігарні, куды б рэгулярна паступалі беларускія выданні.

Арганізатары выстаўкі атрымалі ад кіяўлян нямала заявак на грамадска-палітычную, мастацкую, навукова-тэхнічную, медыцынскую, даведачную літаратуру.

Першая выстаўка беларускай кнігі ў Кіеве мела вялікі поспех. Можна спадзявацца, што такія выстаўкі стануць традыцыйнымі і паслужаць умацаванню дружбы народаў-суседзяў. Удзячныя запісы, пакінутыя украінскімі чытачамі ў кнізе водгукаў, абавязваюць нашых выдаўцоў і паліграфістаў даць беларускай кнізе яшчэ больш шырокі прасцяг.

Д. КАЛБАСІН,
старшы рэдактар выдавецтва «Беларусь».

ХОЧАЦЕ ВЕРЦЕ, ХОЧАЦЕ НЕ...

Вось, мае даражэнькія, раскажу я вам дзіўную гісторыю. І не казка гэта, чысцюткая праўда. Хочаце верце, хочаце не, але было гэта так...

— Зусім нядаўна, на свята рыбака, — расказваў дзядзька Цімох, — пайшоў я на сажалку рыбу вудзіць. Думаю, да свята і закусь будзе. А каб весялей сядзець было, узяў з сабой бутэльку. Сяджу гэта я на досвітку, вуду моцна трымаю і на паплавок цікую. А рыбы — ніякай. Хоць бы які маленькі карасік трапіў! Дык не, куды там! Узяў я бутэльку, каб у халоднекае месцейка перастаўіць, але не ўтрымаўся і глынуў некалькі разоў, а потым, пустую ўжо, у сажалку кінуў...

І раптам уся паверхня загойдалася і з'явіўся перада мной велізарны карась, кілаграмаў гэтак на дзесяць, а мо і болей, лыпае вачыма зялёнымі і гаворыць: «Ты што гэта, Цімох Рыгоравіч, адзін сумуеш, ваду каламуціш?»

— Ды вось, — адказваю, — рыбку лаўлю...

Зарагатаў карась:

— Эх ты, стары рыбак, а не ведаеш, што ў такі святочны дзень мы не працуем. Цяпер жа якраз ідзе сяброўская сустрэча з нашымі прыяцелямі-рыбакамі. Пойдзем і ты да нас, пачастуем. Дарагім госцем будзеш... Не чырваней, не саромся: ведаем, што ты без нас, як без вады...

Хіба адмовішся ад такога мілага запрашэння?

Пайшоў. І дзіву даюся: была дагэтуль наша сажалка глыбокая, а зараз —па калена. Дабраўся я, нарэшце, да рыбнай цэнтральнай сядзібы і адразу ў клуб накіраваўся. А там, браце ты мой, рыбы з рыбакамі гамоняць. І мае сябры — Антон і Васіль —за сталом кумуюць і рыбін тлушч з гарэлкай п'юць. І, наогул, вельмі весела: канцэрт самадзейнасці, спевы, вершы пра рыбака чытаюць карасі. Такія добрыя вершы... А потым — танцы. Падхапіў я адну прыгожую карасіху ды ў скокі. Куды гэта толькі мой радыкуліт знік? А гаспадынька ўсё хвосцікам тым віхляе і спявае: «Як правёў мяне Цімох»...

Раптам хтосьці схапіў мяне за каўнер і пацягнуў, пацягнуў... Што было потым, дакладна не ведаю. Але толькі жоначка ўлімоніла мне, калі я апрытомнеў у сваёй хаце. Плакала ды сварылася. Кажа, добра, што Антон убачыў, з вады выцягнуў, а то ўтапіўся б...

Вось як усё было. Хочаце верце, хочаце не, а было, хай ліха яго!

ПАДВЁЎ ДЫК ПАДВЁЎ

Наўрад ці сталі б мы сёння прыгадваць прозвішча Міколы Ваданосава на старонках «Парнаскіх усмешак», калі б ён не «Сам сябе падвёў»... Акрамя таго, сваім гумарыстычным зборнікам, што нядаўна выйшаў у бібліятэчцы «Вожыка» ён здорава падвёў яшчэ дзесятак сваіх «добрых» знаёмых, расказаўшы пра іх смешныя гісторыі.

Ну, скажыце, калі ласка, хіба такая ўжо вялікая віна заўзятага грыбніка Захара Язэпавіча Выкруткі, які на сваім «Масквічы» «наведваў Лагойскія лясы так рана, што гадзіны дзве збіраў крамяныя баравікі з дапамогай асабіста ім сканструяванага акумулятарнага ліхтарыка»? А потым (во, вынаходнік!) нават дарожны знак, які забараняе праезд у запаветнае грыбное месцейка, паставіў!

Або ўзяць таго ж Івана Суніцу... У чалавека былі самыя найлепшыя намеры: Новы год сустрэць разам з сям'ёй. Ён і спяшаўся дадому з працы, ды раптам сустрэў... даўняга знаёмага, нейкага «сяміпудовага дзядзьку». А знаёмы, перш-наперш, ёсць знаёмы. Нельга вось так проста разысціся: за сустрэчу трэба чарку выпіць... Дык і выпілі — што тут дрэннага, га?

А то, відаць, адзін стары літаратар па шчырасці расказаў аўтару дзіўную гісторыю пра сябе — нейкі сон: як яго раскрытыкавалі ў часопісе і як ён пакутліва перажываў... Як яго дакаралі за «творчы застой» і як ён, бедны, намагаўся ўзяць рэванш... Што ж тут смешнага, якая тут камедыя? Хутчэй трагедыя!

Нельга не паспачуваць і старшаму майстру Івану Панасавічу Рудому. Была такая ў яго бліскучая магчымасць з'ездзіць у сталіцу, на рэспубліканскую нараду перадавікоў вытворчасці. А тут адзін... падвёў. Яшчэ сусед называецца, расказаў на сходзе пра такія-сякія справы сямейныя Івана Панасавіча, і— асечка.

Падвёў, падвёў сваіх знаёмых Мікола Ваданосаў... Добра яшчэ, што, як сумленны чалавек, разумее гэта і прызнаецца ў кніжцы: «У жыцці кожнага нармальнага чалавека бываюць хвіліны, калі ён раскайваецца ў сваіх учынках, шкадуе, што зрабіў так, а не інакш». Толькі можа гэта М. Ваданосаў так сабе, дзеля прыгожага слоўца гаворыць, а тым часам... зноў піша гумарыстычныя апавяданні?

Ну, што ж, хай піша... Пачытаем!

М. М.

ПА СВЕТУ ДОБРА ПАХАДЗІЎШЫ...

З ФРАНЦУЗСКАГА ГУМАРУ

СТАРЫЗНА

На адным з прыёмаў славуты скрыпач гаворыць гаспадыні дома:

— Я зараз сыграю на сваім «страдыварыусе», якому некалькі соцень год.

— Нічога! Госці ўжо захмялелі, і, думаю, ніхто вам не зробіць заўвагі, што іграеце на такой старызне.

ПЕРАД ПРЭМ'ЕРАЙ

— Я хачу купіць у вас усю гнілую гародніну...

— Вы, напэўна, збіраецеся ў тэатр на новую камедыю?

— Цішэй, калі ласка! Я аўтар гэтай камедыі.

НОВЫ ЗАНЯТАК

— Ну, чым ты цяпер займаешся?

— Выступаю ў цырку ў нумары «Чалавек і леў».

— І не баішся?

— А чаго баяцца? Я ў гэтым нумары — леў.

УСЁ РОЎНА

Маці дзяўчыны гаворыць свайму будучаму зяцю:

— Мая дачка вельмі здольная да музыкі.

— Нічога! Усё роўна я жанюся, бо яна мне падабаецца.

У ЦЫРКУ

Дырэктар цырка — служыцелю:

— Сміт, адвядзіце зебру. Збіраецца на дождж, ён можа змыць фарбу.



Мал. К. КУКСО.

Анатоль ВЯЛЮГІН

ЭПІГРАМЫ

ЗАПЯВАЛА Ў ЗАПАСЕ

Дняпроўскі, бесядскі ды бугскі
пясняр акопнае прапіскі, —
з пяхотай еў з адное міскі
Пятро Прыходзька
Курска-Дугскі,
ваяка-ратнік Сандамірскі.

РЭДАКТАР-ВЫДАВЕЦ

Заўжды гатоў
свой выдаць аднатомнік
Пятро Шаўцоў,
парнасаўскі надомнік.

«ТРЫ НЕПРАЖЫТЫЯ ДНІ»

(Замест рэцэнзіі)

На курганні секс і віскі —
пі, блазнуй, як засвярбіцца!..
Раманіст Алесь Савіцкі
стаўся Настаю Вярбіцкай.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856. АТ 05868

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара—33-44-04, аддзела літаратуры — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела публіцыстыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, выдавецтва — 32-22-19, бухгалтэрыі — 32-15-87.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Х. Д. ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. Ц. БАЖКО, Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, Ю. П. ГРЫГОР'ЕЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ, Л. Я. ПРОКША, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.